

ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ ПРА ІМПЛАНТАЦЫЮ ЗУБОЎ? 6

ТОП-5 ПЕЙЗАЖАЎ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА 19



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ЛІСТАПАДА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 232 (29346)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вячаслаў ШЫЛА, старшыня Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя:**

*«Асаблівую важнасць у сённяшніх умовах мае стварэнне бяспечных умоў працы, забеспячэнне сродкамі індывідуальнай і калектыўнай аховы, няўхільнае захаванне санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў на рабочых месцах. Па даручэнні рэспубліканскага камітэта прафсаюза тэхнічныя інспектары працы правялі маніторынгі, якія датычацца забеспячэння кіроўцаў арганізацый галіны сродкамі аховы і дэзынфікуючымі сродкамі. Узмоцнены кантроль за правільным выкарыстаннем сродкаў індывідуальнай аховы, арганізавана сістэма цэнтралізаванага маніторынгу тыднёвай патрэбы ў іх на ўзроўні кожнай медустановы. Сёння нашы арганізацыі значна лепш забяспечаны сродкамі індывідуальнай і калектыўнай аховы, чым у пачатку эпідэміі. Гэта факт».*

# Мелодыя «Дударыкаў»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Соф'я ПАЎЛІШЫНА і Ганна КАЛІНІНА — вучаніцы мінскай гімназіі № 14, а таксама ўдзельніцы вядомага дзіцячага ансамбля «Дударыкі», створанага на базе ўстановы, якім кіруе заслужаны дзеяч культуры Беларусі Дзмітрый Ровенскі. Сёлета ў «Дударыкаў» значная падзея — пяцьдзясят гадоў са дня ўтварэння. Маленькія артысты — і гарманісты, і дудары — рыхтуюцца не толькі да святочнага юбілейнага канцэрта, але і да абароны звання «Заслужанага калектыву».

Рэпарцёр

## У КРАМУ РАЗАМ З ДЭПУТАТАМ

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў працягваюць аналізаваць цэны на прадукты харчавання першай неабходнасці. Член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве, дэпутат ад Гомельскай-Савецкай выбарчай акругі № 34 Ірына ДАЎГАЛА, да якой апошнім часам звяртаюцца выбаршчыкі, заклапочаныя ростам кошту пэўных прадуктаў айчыннай і замежнай вытворчасці, разам з прафсаюзным спецыялістам вывучыла сітуацыю.**

Даступнасць па цане сацыяльна значнага харчовага набору для ўсіх катэгорый грамадзян — гэта пытанне, якое заўжды павінна быць на кантролі, ставіць для сябе задачу Ірына Віктараўна. У гэтай ініцыятыве дэпутата падтрымала таксама Гомельскае гарадское аб'яднанне прафсаюзаў. Яго супрацоўнікі трэці год запар праводзяць штомесячны маніторынг цэн на сацыяльна значныя прадукты харчавання і неабходныя тавары асабістай гігіены. Сёлета, у апошнія месяцы, аналіз цэн па гэтых катэгорыях тавараў — штотыднёвы. СТАР. 4



Сітуацыя

## Чаму зацягнуўся капітальны рамонт?

### Першая «балконная справа» разгледжана ў раённым судзе Гродна

**Жыхары дома па вуліцы Лізы Чайкінай у абласным цэнтры нечакана сталі адказчыкамі ў судзе. Аказалася, яны перашкаджаюць весці рамонт дома, зацягваюць тэрміны работ. І ўсё з-за таго, што адмовіліся дэмантаваць аздабленне сваіх балконаў. Паколькі дагаварыцца з уласнікамі кватэр не атрымалася, камунальныя службы падалі на жыхароў у суд.**

У Гродне вядзецца актыўны рамонт жыллёвага фонду. Напрыклад, у Кастрычніцкім раёне абласнога цэнтра летась адрамантавана каля 60 дамоў. Вось і пяціпавярховая панэлька па вуліцы Лізы Чайкінай нарэшце дачакалася абнаўлення. Рашэнне аб капітальным рамонце было прынята ў снежні летась. Сам дом пабудаваны ў 60-я гады, і да гэтага часу кардынальныя работы па рамонце тут не вяліся. Таму было вырашана заняцца дахам, фасадам і балконамі. Быў складзены каштарыс, вызначаны заказчык работ, падрадныя арганізацыі.

Калі з дахам і фасадам праблем не ўзнікла, то рамонт балконаў некаторыя жыхары сустрэлі, што называецца, у штыкі. Справа ў тым, што праект прадугледжвае рамонт бетонных пліт і металічных агароджаў усіх балконаў. Калі яны не зашклёныя, праблем няма. Будаўнікі прыходзяць і робяць сваю справу, у выніку атрымліваецца літаральна новы балкон. А вось там, дзе яго зашклілі, усё складаней. Некаторыя жыхары наадрэз адмовіліся дэмантаваць свае балконныя рамы. Алена Іосіфаўна — адна з іх. СТАР. 5

## КОРАТКА

• Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, якім на шэсць месяцаў падаўжаецца тэрмін дзеяння даведак юрыдычных і фізічных асоб, калі той заканчваецца з 10 лістапада 2020 года да 10 мая 2021 года.

• **Прэзідэнт Беларусі правёў сустрэчу са старшынёй Венгерскай рабочай партыі Дзюлам Цюрмерам.**

• Педагогам у сферы фізкультуры з 1 студзеня будуць выплачваць дапамогу на аздараўленне да адпачынку.

ISSN 1990 - 763X
20232>

З першых вуснаў

# «Час паказаў, што нам нікуды не падзецца ад вельмі цесных і сяброўскіх адносін»

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з міністрам замежных спраў Расіі Сяргеем Лаўровым

**Сярод тэм размовы — гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва дзвюх краін, актуальныя пытанні Садружнасці Незалежных Дзяржаў напярэдадні беларускага старшынства ў арганізацыі, узаемадзеянне ў Еўразійскім эканамічным саюзе (дзе Мінск старшынствуе сёлета) і Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.**



Фота БелТА.

Па словах Прэзідэнта, сустрэчы з кіраўніком знешнепалітычнага ведамства Расіі заўсёды прадукцыйныя для яго асабіста, краіны ў цэлым і нашай знешняй палітыкі.

«Ёсць магчымасць, як вы часта кажаце, зверыць гадзіннікі. Мы гэтым карыстаемся. Бо вам прыходзіцца больш вярцецца на гэтай міжнароднай арэне, у гэтым шалёным свеце. І ваша пазіцыя, пункт гледжання, для нас вельмі актульныя і пазнавальныя», — сказаў кіраўнік краіны.

Што да беларуска-расійскіх адносін, дадаў ён, неабходна думаць не аб іх перазагрузцы, а пра ўзмацненне і інтэнсіфікацыю. «Мы б хацелі мець не проста добрасуседскія адносіны, а хацелі б мець вельмі блізкія, братэрскія адносіны з Расійскай Федэрацыяй», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. «Час паказаў, што нам нікуды не падзецца ад вельмі цесных і сяброўскіх адносін. Упэўнены, што гэтага сёння кіраўніцтва Расіі хоча і аддае перавагу такім адносінам», — падкрэсліў ён.

Кіраўнік Беларусі пазітыўна ацаніў удзел Расіі ва ўрэгуляванні канфлікту ў Нагорным Карабаху, на Каўказе паміж Арменіяй і Азербайджанам. На яго думку, у свеце яшчэ шмат выклікаў, і Беларусь разам з Расіяй гатова пераадольваць іх. «Мы заўсёды гатовыя прайсці свой шлях, калі Расія таго пажадае, побач з Расіяй, пераадольваючы гэтыя праблемы, пачынаючы ад пандэміі і заканчваючы рознага роду прэтэнзіямі. Найперш Злучаных Штатаў Амерыкі на адначасобнае панаванне ў свеце. Мы гэта ніколі не віталі і вітаць не будзем», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Сяргей Лаўроў перадаў кіраўніку Беларусі прывітанне ад Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна, які пацвердзіў папярэднія дамоўленасці лідараў падчас асабістых сустрэч (асабліва ў Сочы, дзе разглядаліся пытанні дыялогу ўлады і грамадства). «У нас цалкам супадае зацікаўленасць ва ўзмацненні адносін, як вы сказалі, можна гэта па-рознаму называць, але ў нас адна і тая ж мэта — рухацца да ўзаемнай выгады для нашых краін, народаў і Саюзнай дзяржавы», — акцэнтаваў увагу кіраўнік расійскага МЗС.

* * *

Сяргей Лаўроў і яго калега, кіраўнік МЗС Беларусі Уладзімір Макей прынялі ўдзел у сумесным пасяджэнні калегіі міністэрстваў замежных спраў. Пасля перагавораў яны выступілі з заявамі і адказалі на пытанні журналістаў. Уладзімір Макей адзначыў, што Беларусь і Расія працягнуць працаваць над нармалізацыяй усіх відаў транспартных зносін.

«На парадку дня застаецца адчувальнае для нашых краін пытанне зняцця абмежаванняў на перамяшчэнне цераз беларуска-расійскую граніцу. Нам ужо ўдалося дамовіцца пра пэўныя паслабленні для шэрагу катэгорый грамадзян і аб актывізацыі авіязносін паміж дзвюма краінамі», — сказаў міністр замежных спраў Беларусі.

Ён ацаніў далучэнне Украіны да антыбеларускіх санкцый як абсалютна несябroўскі крок і спробу ўмяшання ва ўнутраныя справы Беларусі. Міністр падкрэсліў, што далучэнне Украіны да заходніх санкцый — рашэнне, якое дэманструе непаслядоўнасць яе палітыкі.

Сяргей Лаўроў у сваю чаргу ўпэўнены, што стабілізацыі становішча ў Беларусі будзе садзейнічаць канстытуцыйная рэформа. «Мы, вядома, зацікаўлены, каб сітуацыя была спакойнай, стабільнай і, на наш погляд, гэтаму, вядома ж, будзе спрыяць канстытуцыйная рэформа, якая пачалася па ініцыятыве кіраўніцтва краіны як важны этап удасканалення і пераўтварэння палітычнай, эканамічнай, прававой сістэмы», — выказаў думку кіраўнік расійскага МЗС.

Па яго словах, адзначаюцца шматлікія факты грубага ўмяшання ЗША і асобных еўрапейскіх краін ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў. «Працягваецца выкарыстанне брудных метадаў так званых «каляровых» рэвалюцый, якія ўключаюць маніпуляванне грамадскай думкай, стварэнне і падтрымку адкрыта антыўрадавых сіл, садзейнічанне іх радыкалізацыі. Мы бачым, наколькі гэтыя метады прымяняюцца ў адносінах да Рэспублікі Беларусь», — заявіў Сяргей Лаўроў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

• У тэму

### «Мы бачым спробы актыўна ўплываць на ўнутраныя працэсы ў нашых краінах»

Сяргей Лаўроў па выніках сустрэчы паведаміў журналістам, што з Прэзідэнтам Беларусі абмяркоўвалі знешнепалітычнае супрацоўніцтва, як рэалізуецца праграма сумесных дзеянняў у гэтым вектары на 2020—2021 гады. «Гаварылі таксама пра дзейнасць АДКБ. Літаральна праз некалькі дзён адбудзецца пасяджэнне Савета міністраў замежных спраў, а затым пасяджэнне Савета калектыўнай бяспекі на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў. Расія старшынствуе ў АДКБ на гэтым этапе, — сказаў Сяргей Лаўроў. — Паралельна Рэспубліка Беларусь узначальвае ЕАЭС. Мы высока цэнім ініцыятывы і дзеянні, якія робіць Мінск для прасоўвання нашай шматбаковай інтэграцыі».

Ён заявіў, што з кіраўніком Беларусі абмяняліся думкамі аб прыярытэтах у дзейнасці СНД на будучы год. «Таксама казалі пра адносіны нашых краін з Захадам, НАТА, ЕС, ЗША. Мы бачым, шчыра скажу, варожыя адносіны да Расіі і Рэспублікі Беларусь. Бачым спробы актыўна ўплываць на ўнутраныя працэсы ў нашых краінах. Ды заходнія лідары гэтага асабліва не хаваюць», — дадаў кіраўнік расійскага МЗС і адзначыў, што абедзве краіны ўспрымаюць гэта спакойна і ім ёсць чым абараняць сябе і сваю незалежнасць.

Парламенцкі дзённік

# Стаўка на самасвядомасць і фотафіксацыю

## Дэпутаты выступаюць за адвязванне дарожнага збору ад тэхагляду і ад цаны на паліва

**Пра гэта паведаміў журналістам старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Ігар КАМАРОЎСКІ.**

**Учора ў ніжняй палаце парламента на пашыраным пасяджэнні пастаянных камісій па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі і па бюджэце і фінансах абмяркоўвалася пытанне аб удасканаленні сістэмы збірання дзяржаўнай пошліны за карыстанне аўтамабільнымі дарогамі.**

У пасяджэнні ўдзельнічалі прадстаўнікі міністэрстваў фінансаў, па падатках і зборах, транспарту і камунікацый, унутраных спраў, юстыцыі, сувязі і інфарматызацыі, а таксама прадстаўнікі «Белнафтахіма» і Адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы.

Ігар Камароўскі паведаміў журналістам, што дэпутаты пагадзіліся з прапановай урада адвязаць дзяржпошліну за карыстанне дарожнай інфраструктурай ад праходжання тэхагляду аўтамабіля. Прапануецца ўвесці магчымасць дыферэнцаванай аплаты ад аднаго месяца да 24, што дазволіць плаціць толькі за той перыяд, падчас якога аўтамабіль эксплуатуецца. Кантроль за выплатамі планууецца забяспечыць тэхнічнымі і аналітычнымі сродкамі фота- і відэафіксацыі.

«Нашы грамадзяне дастаткова свядомыя, калі механізм будзе зразумелы і празрысты, яны будуць добраахвотна плаціць», — лічыць іншы **дэпутат — член міжведамаснай рабочай групы па выпрацоўцы механізму збірання дзяржпошліны за карыстанне дарожнай інфраструктурай Сяргей СЦЕЛЬМАШОК.**

Парламентарыі гатовыя да таго, што і гэты варыянт, як і шматлікія іншыя, якія абмяркоўваліся раней, будзе падвергнуты крытыцы з боку грамадзян.

«Над гэтай праблематыкай работа ідзе ўжо не першы год, і любы з варыянтаў мае як станоўчыя бакі, так і недахопы, гэта значыць, ідэальным быць не можа. Вядома, што любы з варыянтаў, і той, што абраны сёння, будзе крытыкавацца, у першую чаргу, грамадзянамі, але тым не менш думаю, мы ўсё ж такі вызначым самы аптымальны», — выказаў спадзяванне Ігар Камароўскі.

Дэпутаты не падтрымалі варыянт уключэння дзяржпошліны ў цану маторнага паліва з-за магчымых негатыўных наступстваў для эканомікі: інфляцыйнага ціску і рызыкі дыспарытэту цэн на бензін у Беларусі і Расіі.

Адмова ад уключэння дзяржпошліны ў кошт паліва прадыктаваная і тэндэнцыяй развіцця электратранспарту ў краіне, дадаў Сяргей Сцельмашок. Ён расказаў журналістам пра закладзеныя ў новы механізм паслабленні па аплаце дарожнага збору: штомесячную стаўку прапануецца скараціць на 10 працэнтаў у параўнанні з той, што існуе зараз, тым, хто будзе плаціць адразу за год, будзе дадзеная 20-працэнтная зніжка.

Напрыклад, калі цяпер за машыну вагой 1800 кг трэба плаціць каля 164 рублёў, то па новым механізме, з улікам змянення стаўкі і пры выкарыстанні зніжкі — каля 120.

**Намеснік міністра фінансаў Дзмітрый КІЙКО** падрабязна спыніўся на мінусах механізму прывязкі пошліны да кошту паліва, бо гэты варыянт многім падаецца справядлівым і вельмі простым.

Акрамя інфляцыйнага ціску на эканоміку, пра які ўжо згадвалі дэпутаты, гэты механізм можа пацягнуць касавы разрыў у дарожным фондзе каля 120 мільёнаў рублёў з-за неабходнасці вяртання грошай тым, хто ўжо заплаціў дарожны збор (бензін падаражае ў гэтым выпадку аднамомантна і аднолькава для ўсіх).

«Але самая галоўная прычына адмовы ад уключэння пошліны ў кошт паліва — гэта магчымае зніжэнне паступлення даходаў у бюджэт у выніку вымушанага зніжэння падатковага складніка ў цане паліва з-за штогадовага росту кошту нафты для беларускіх нафтаперапрацоўчых заводаў, — растлумачыў Дзмітрый Кійко. — Мы сёння знаходзімся ў сітуацыі няпэўнасці з коштам нафты. У Расійскай Федэрацыі рэалізуецца падатковы манеўр, у выніку для нас штогод адбываецца адноснае падаражанне нафты. Гэта ўплывае на эфектыўнасць нафтаперапрацоўкі і цягне неабходнасць павелічэння цаны на аўтамабільнае паліва на ўнутраным рынку».

Па яго словах, калі да павелічэння кошту паліва з-за дзяржпошліны дадаць штогадовы рост у сувязі з падатковым манеўрам, можа адбыцца дыспарытэт цэн на паліва з Расійскай Федэрацыяй, што негатыўна паўплывае на транзіт, аб'ёмы рэалізацыі паліва на тэрыторыі Беларусі і можа нарадзіць шэрыя схемы завозу ў нашу краіну расійскага бензіну. Усё гэта выкліча змяншэнне паступленняў у бюджэт па акцызах і падатку на дабаўленую вартасць. Калі захоўваць парытэт цэн, прыйдзецца зніжаць падатковы складнік у кошце паліва, у выніку цягам трох гадоў гэтая даходная крыніца будзе зведзеная да нуля, давёў чыноўнік.

Менавіта таму Міністэрства фінансаў прапануе захаваць плату за карыстанне дарогамі асобна ад кошту на паліва. Па ацэнках спецыялістаў, новы механізм забяспечыць дадатковыя паступленні на абслугоўванне дарог ад фізічных асоб у памеры 150 мільёнаў рублёў. Зараз дзяржава збірае з кіроўцаў каля 300 мільёнаў рублёў штогод (сёлета менш з-за таго, што многія адклалі выплату ў чаканні змяненняў).

Дзмітрый Кійко расказаў пра наступствы, якія прапануюцца для аўтауладальнікаў за ўхіленне ад выплаты дарожнага збору: гадавая стаўка дзяржпошліны тады будзе падвойная, плюс такога ж памеру прыйдзецца заплаціць штраф.

Дзяржаўная пошліна за ўдзел у дарожным руху была ўведзеная ў Беларусі ў 2014 годзе. Тады быў абраны механізм прывязвання яе да праходжання тэхагляду транспартнага сродку, але мінусы такога спосабу ў тым, што ўсю суму трэба ўносіць аднаразова, да таго ж, незалежна ад інтэнсіўнасці ўдзелу транспартнага сродку ў дарожным руху. Гэта прывяло да значнай колькасці ўхіленняў ад аплаты пошліны пры немагчымасці арганізаваць суцэльны кантроль на дарогах за наяўнасцю тэхнічнага агляду транспартных сродкаў сіламі падраздзяленняў ДАІ і нізкім памеры штрафу ў параўнанні з самой дзяржпошлінай. З 2017 года абмяркоўваюцца новыя, больш дасканалыя, зразумелыя і справядлівыя механізмы прыцягнення ўладальнікаў аўтамабіляў да ўдзелу ў фінансаванні ўтрымання і будаўніцтва дарог.

У парламенце казалі пра тое, што новы парадак можна будзе ўвесці з 1 красавіка наступнага года. Для грамадзян, якія будуць плаціць дзяржпошліну па існуючым парадку ў першыя тры месяцы года, прапануецца знізіць яе стаўку на 20 працэнтаў. Для тых, хто заплаціў дзяржпошліну ў 2019 і 2020 гадах, і перыяд яе дзеяння да 1 красавіка не скончыцца, прапануецца зрабіць залік унесенага плацяжу прапарцыянальна тым месяцам, якія застануцца з моманту ўвядзення новага парадку выплаты.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Блізкая ўлада

# ЖЫЛЛЁВЫЯ І ЗЯМЕЛЬНЫЯ ПЫТАННІ

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый КРУТОЙ правёў асабісты прыём грамадзян.**

«На прыёмах грамадзян мы аналізуем тэмы, якія найбольш хвалююць людзей. На першым месцы заўсёды жыллёвыя, зямельныя пытанні, вылучэнне льготных крэдытаў, субсідый. Гэты блок займае практычна 50 % на кожным прыёме грамадзян. Акрамя таго, павялічылася колькасць пытанняў, звязаных з сістэмнымі стратэгіямі развіцця асобных галін. У мяне на прыёме сёння будуць транспартнікі, далей будзем сустракацца з прадпрымальнікамі», — сказаў Дзмітрый Крутой.

Ён нагадаў, што цяпер фарміруюцца прагнозныя дакументы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на наступныя пяць гадоў, вызначаюцца прыярытэты, дзяржпраграмы, бюджэт. «Кожны хоча загадзя ведаць, на што можна разлічваць, якія ініцыятывы можна ўнесці. Мы, вядома, гэта вітаем, праводзім сустрэчы ў Адміністрацыі Прэзідэнта, апрацоўваем адпаведную інфармацыю і перадаём ураду, парламенту і ў іншыя структуры, каб забяспечыць больш якасную падрыхтоўку стратэгічных дакументаў», — адзначыў ён.

На прыём да Дзмітрыя Крутога прыйшлі тры жыхаркі Барысаўскага раёна, якія стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Па іх словах, ім былі выдадзеныя накіраванні ў кааператыў, яны плацілі ўзносы і разлічвалі на субсідыі, але атрымалі адмову. Акрамя таго, пайшлі размовы аб тым, што кааператыў будуць расфарміроўваць або рэарганізоўваць. Пры гэтым дом ужо будуецца, чакаецца, што ён будзе здадзены ў наступным годзе. Як растлумачылі ў Мінаблвыканкаме, праблема датычыцца ўсяго ЖБВК у цэлым. Мяркуецца, што пры фарміраванні кааператыва чаргавасць не была захаваная. У сувязі з гэтым цяпер праводзіцца праверка. У Мінаблвыканкаме падкрэслілі, што інфармацыя аб рэарганізацыі кааператыва няправільная, усе рашэнні будуць прымацца пасля завяршэння праверкі.

«На жаль, такая сітуацыя не адзінкавая. Ініцыявана праверка адпаведных кантрольных органаў, і мы дачакаемся яе вынікаў. Адміністрацыя Прэзідэнта папрасіць цэнтральны апарат Камітэта дзяржкантролю далучыцца, таму што выпадак не зусім стандартны. Каб інтарэсы грамадзян ні ў якім разе не пацярпелі, прапануем ім усе магчымыя варыянты выхаду з гэтай сітуацыі», — падкрэсліў Дзмітрый Крутой.

На прыём грамадзян запісалася таксама шматдзетная маці з Мінскага раёна, у якой узніклі цяжкасці пры атрыманні зямельнага ўчастка для будаўніцтва дома. Гэтае пытанне ўзята на кантроль.

**БелТА.**

## ТЭЛЕФАНУЙЦЕ ЗАЎТРА

**Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяроворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 28 лістапада, з 9.00 да 12.00 працуюць:

• кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. 8 016 221 31 21;

• кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч МАСЛАЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;

• першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Дзітрый Міхайлавіч МІКУЛЁНАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

# З неба паляціць пухнаты снег

## А на наступным тыдні ўжо ўдзень будзе да мінус 5 градусаў



**У чацвер метэаралагічныя ўмовы ў краіне фармавала цёплая частка цыклону, названага нямецкімі сіноптыкамі «Таня», і тэмпературны фон быў на 3—5 градусаў вышэйшы за кліматычную норму. А ў выхадныя пачнецца пахаладанне, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень умовы надвор'я на тэрыторыі краіны будуць вызначаць атмасферныя франты ад гэтага цыклону, цэнтр якога з поўначы Батнічнага заліва ссоўваецца на Цвярскую вобласць Расіі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу.

А вось у гэтыя выхадныя на надвор'і адаб'ецца ўплыў атмасферных франтоў і халоднай паветранай масы, якая распаўсюджваецца з паўночнага захаду Еўропы. Чакаецца шмат аблокаў. У суботу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным у выглядзе снегу, мокрага снегу. Уначы і раніцай месцамі магчымы слабыя туман і галалёд. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўночна-заходні, заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, удзень — ад 2 марозу да 4 цяпла.

У нядзелю чакаецца дзень снегу. У нашай краіне ён будзе ісці практычна паўсюдна і амаль цэлыя суткі. На асобных участках дарог — галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўночны ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 5 марозу да 1 цяпла, удзень — ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, на наступным тыдні нас чакае істотнае пахаладанне, калі тэмпературны рэжым у многіх раёнах Беларусі спачатку вернецца ў кліматычныя рамкі, а ў першых чыслах каляндарнай зімы сярэднясутачныя тэмпературы абяцаюць нават крыху ніжэйшыя за норму. На значнай частцы тэрыторыі ляжа снежнае покрыва.

У панядзелак халодны вецер прыйдзе да нас з поўначы Еўропы. Таму на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 7 градусаў, удзень — ад 4 марозу да 1 цяпла. Але гэта толькі «кветачкі», сапраўдны холад наперадзе.

У наступныя два дні (у аўторак і сераду) надвор'е будуць фарміраваць арктычныя паветраныя масы і малаактыўныя франтальныя раздзелы. Атмасферны ціск вырасце, аблокі пачнуць рассейвацца, ападкаў стане менш. Толькі ў асобных раёнах краіны магчымы кароткачасовы снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе да мінус 7 градусаў, пры праясненнях — 8—10 марозу. Удзень таксама будзе не зусім камфортна — ад 5 марозу да 1 цяпла. Вось так — снежань на носе.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Спорт

# З ПАЖАДАННЕМ ДОБРАГА СТАРТУ!

**Легендарная расійская каманда «КАМАЗ-майстар» перад выездам на чарговае ралі «Дакар» зрабіла прыпынак у Брэсце.**

Чатыры ралійныя экіпажы і машыны тэхнічнага суправаджэння едуць у Марсель. Адтуль гоншчыкі пераправяць тэхніку ў Саудаўскую Аравію, дзе ў студзені наступнага года пройдзе ралі «Дакар». «КАМАЗ-майстар» ужо 29 разоў прымаў удзел у гэтай прэстыжнай гонцы і 17 разоў перамагаў у ёй. У складзе бліскучай каманды — пяць уладальнікаў Кубка свету, 16 майстроў спорту міжнароднага класа, 12 заслужаных майстроў спорту Расіі, 16 майстроў спорту. Унікальнасць каманды ў тым, што яна адзіная сярод эліты міжнародных ралі распрацоўвае, праектуе, збірае гоначныя грузавікі і выступае на іх на спаборніцтвах.

Аб тым, як цёпла прывіталі гоншчыкаў на брэсцкай зямлі, расказаў у сваім тэлеграм-канале старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК. «КАМАЗ-майстрам» пажадалі падзяліць п'едэстал гонару з нашай камандай «МАЗ-СПОРТаўта».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



Фота з тэлеграм-канала Аляксандра РАГАЧУКА.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Амерыканскія кампаніі назапасілі ў пандэмію рэкордны аб'ём кэша

Амерыканскія кампаніі, якія не аказваюць фінансавых паслуг, назапасілі 2,12 трыльёна долараў наяўных грашовых сродкаў. Гэта амаль на траціну больш, чым у канцы мінулага года, і на шэсць працэнтаў перавышае папярэдні максімум у $1,99 трлн, зарэгістраваны ў 2017 годзе. Аб гэтым паведаміла газета Financial Times са спасылкай на даследаванне рэйтынгавага агенцтва Moody's. Найбуйнейшымі трымальнікамі грашовых сродкаў з нефінансавых кампаній апынуліся IT-гіганты Apple, Microsoft, Alphabet, Amazon і Facebook. На іх прыпадае больш за чвэрць агульнай «падушкі» — $581 млрд. Летась гэты паказчык складаў $571 млрд. Збіраць грошы бізнес падахвочвае пандэмія каранавіруса, адзначае FT. Аналітыкі Moody's чакаюць зніжэння «канцэнтрацыі грашовых сродкаў» налета, паколькі кампаніі будуць скарачаць свае рэшткі грашовых сродкаў за кошт выплаты дывідэндаў і абавязкаў. У дачыненні да інвестыцый у 2021-м будзе існаваць насцярожанасць.

## Іспанія і Італія раскрытыкавалі міграцыйны пакт

Мадрыд і Рым нязгодныя з пактам аб міграцыі, прапанаваным Еўракамісіяй. На італьянска-іспанскім саміце ў Пальма-дэ-Мальёрка кіраўнікі ўрадаў дзвюх дзяржаў выступілі з патрабаваннем праявіць вялікую салідарнасць і адказнасць у вырашэнні міграцыйнага пытання, паведаміла Euronews. Да заявы далучыліся ўлады яшчэ дзвюх краін першага прыбыцця мігрантаў — Мальты і Грэцыі. «Мне здаецца, гэтыя чатыры краіны ініцыявалі важныя дэбаты. Іх прапанова вельмі смелая і карысная для Еўрапейскага саюза. Яна праякуе канструктыўныя дэбаты, неабходныя для выпрацоўкі агульнай для еўрапейскіх краін міграцыйнай палітыкі», — заўважыў прэм'ер-міністр Іспаніі Пэдра Санчэс.

## У сувязі са смерцю Дыега Марадоны ў Аргенціне абвешчана трохдзённая жалоба



Пра гэта паведаміў ТАСС са спасылкай на прэс-службу адміністрацыі прэзідэнта краіны. Легендарнага футбаліста Дыега Марадону паклалі ў шпіталь у горадзе Ла-Плата 2 лістапада. Як заявіў раней яго ўрач, шпіталізацыя не была тэрміновая, аргентынец сам захацеў прайсці медыцынскі агляд, падчас якога была выяўлена субдуральная гематома. На наступны дзень Марадону перавезлі ў іншую бальніцу, дзе яму была паспяхова праведзена аперацыя. 12 лістапада яго выпісалі з бальніцы. 25 лістапада ў 60-гадовага Марадоны спынілася сэрца. Жалобная цырымонія прайшла ўчора ў афіцыйнай рэзідэнцыі прэзідэнта Аргенціны, размешчанай у цэнтры Буэнас-Айрэса. Марадона па праве лічыўся адным з найлепшых гульцоў у гісторыі футбола. Правёў 91 матч і забіў 34 галы ў складзе зборнай Аргенціны па футболе. З'яўляецца чэмпіёнам свету 1986 года, двухразовы чэмпіён Італіі ў складзе клуба «Напалі» і чэмпіён Аргенціны ў складзе «Бока Хуніёрс». У верасні 2019-га ўзначаліў аргентынскую «Хімнасію». Да яе Марадона працаваў у мексіканскім «Дарадасе», «Эль-Васле» і «Аль-Фуджайры» з ААЭ, а таксама ўзначальваў зборную Аргенціны. Бывай, Дыега...

# Памяць Дыега Марадоны ўшануюць у Брэсце

Лёс легендарнага футбаліста звязаны і з беларускім спортам. У 2018 годзе ён стаў старшынёй праўлення футбольнага клуба «Дынама-Брэст». Падчас свайго адзінага прыезду ў Брэст у ліпені 2018 года Марадона даў прэс-канферэнцыю, дзе падзяліўся сваімі планамі на работу з клубам, паглядзеў матч «Дынама-Брэст» супраць «Шахцёра», пазнаёміўся з гульцамі. На тым удзел аргенцінца ў жыцці брэсцкага клуба скончыўся. Але гэтая спроба супрацоўніцтва стала значнай падзеяй у гісторыі ўсяго беларускага футбола.

У дзень матча «Дынама-Брэст» — «Нёман» 28 лістапада ў фан-зоне брэсцкага стадыёна будзе арганізавана выстаўка ў гонар Дыега Марадоны. Памятную экспазіцыю прадставіць брэсцкі калекцыянер Георгій Дарбуашвілі. Увазе наведвальнікаў будзе прапанавана больш за 10 альбомаў з фотаздымкамі і выразкамі з розных выданняў, прысвечаных кар'еры Марадоны. Сярод эксклюзіўных экспанатаў — футболкі аргенцінскай зборнай, сувеніры з чэмпіянатаў свету, звязаныя з футболам Аргенціны і яго легендарным прадстаўніком Дыега Марадонай.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# У КРАМУ РАЗАМ З ДЭПУТАТАМ



*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Такая сумесная работа па кантролі з ростам цэн больш эфектыўная, адзначае дэпутат Палаты прадстаўнікоў Ірына Даўгала:

— Для вывучэння дынамікі цэн намі быў абраны значны па памеры і пакупніцкім попыце гандлёвы аб'ект Гомеля, які знаходзіцца на тэрыторыі Гомельскай-Савецкай акругі, ад якой мяне абралі выбаршчыкі, — тлумачыць Ірына Віктараўна. — Рынак «Давыдаўскі» знаходзіцца ў той частцы горада, дзе, акрамя маштабнага жылога масіву, побач — адразу тры вышэйшыя навучальныя ўстановы, фактычна такі «студэнцкі гарадок». Акрамя таго, праз рынак праходзяць рэйсавыя аўтобусы, на якіх у Гомель з рэчыцкага напрамку дабіраюцца жыхары многіх райцэнтраў, — дэпутат звяртае ўвагу, што на падобных маштабных гандлёвых пляцоўках асабліва важна ацаніць даступнасць коштаў на харчовыя тавары першай неабходнасці. Мясцовыя пакупнікі — самыя розныя сацыяльныя групы насельніцтва не толькі Гомеля, але і вобласці.

— Мы звярнулі ўвагу на тое, што цэны даволі адрозніваюцца. Кошт тавараў у многім залежыць ад таго, ці сам вытворца прадае — фермер, прыватны прадпрымальнік ці ўласнік, які мае лішкі садавіны і агародніны, — альбо рэалізуе перакупшчык, — адзначае дэпутат. — Але ў цэлым на асноўны харчовы набор цэны ў розных прадаўцоў адрозніваюцца нязначна. Заклапочанасць выклікала толькі цана на алей. Рост цэн на яго ад 40 да 70 % у залежнасці ад аб'ёму тары і фірмы-вытворцы. Гандляры такі скачок цаны тлумачаць неўраджаем сланечніку ў краіне-суседцы, — звяртае ўвагу Ірына Віктараўна.

Дэпутат адзначыла, што падчас вывучэння цэн на рынку парадавала работа з пакупнікамі мясцовых сельгасвытворцаў Гомельшчыны. Яны рэалізуюць садавіну, агародніну, малочную і мясную прадукцыю, рыбу, паўфабрыкаты і кансервацыі праз фірмовыя гандлёвыя пункты. Прадукцыя гомельскіх гаспадарак карыстаецца асаблівым попытам.

Продаж сельгаспрадукцыі мясцовых вытворцаў на гарадскіх кірмашах, рынках і ў крамах — апошнім часам на асаблівым кантролі і супрацоўнікаў гарадскога аб'яднання прафсаюзаў, адзначае **Маргарыта ХАДЗІЧЭНКА, старшыня Гомельскага гарадскога аб'яднання прафсаюзаў.** Яна тлумачыць, што атрыманая пасля маніторынгу цэн інфармацыя накіроўваецца ў Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі.

— Што датычыцца продажу сацыяльна значных харчовых і прамысловых тавараў, якія павінны быць даступныя па цане ўсім катэгорыям грамадзян, то мы штотыднёва аналізуем цэны па 72 вызначаных пазіцыях, і штомесяц — па 23 гандлёвых пазіцыях, — тлумачыць Маргарыта Мікалаеўна. — У цэлым па краіне для кантролю абраны 274 крамы, у якіх мае калегі — кіраўнікі раённых і гарадскіх аб'яднанняў прафсаюзаў — штотыдзень праводзяць маніторынг цэн.

Гэта работа неабходная, каб своечасова праінфармаваць органы ўлады горада і вобласці, і абагульніць звесткі на рэспубліканскім узроўні. Старшыня Гомельскага гарадскога аб'яднання прафсаюзаў кожны тыдзень праводзіць аналіз цэн у дзвюх крамах на тэрыторыі Гомеля.

— Зафіксаваныя цэны пасля неабходна ўнесці на адмысловы партал, створаны ФПБ, — дадае Маргарыта Хадзічэнка. Яна тлумачыць, якім чынам інфармацыя з рэгіёнаў абагульняецца, пасля накіроўваецца ў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, потым перадаецца ва ўрад і Адміністрацыю Прэзідэнта.

У Гомельскай вобласці супрацоўнікі аб'яднання прафсаюзаў такім чынам аналізуюць цэны ў 44 крамах.

— З моманту пачатку гэтай работы ў 2017 годзе вырашаны шэраг значных пытанняў у адносінах цэнавытворчасці на тавары і паслугі, — звяртае ўвагу старшыня Гомельскага гарадскога аб'яднання прафсаюзаў. — Так, спынены бесдастаўны рост кошту пражывання ў інтэрнатах, павышэнне цэн на дзіцячае харчаванне. Менавіта па ініцыятыве Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі сёлета ўведзена дзяржаўнае рэгуляванне цэн на сацыяльна значныя прадукты. Як вынік, зараз у абласным цэнтры, напрыклад, мы не заўважаем рэзкага росту цэн на асноўныя групы прадуктаў харчавання.

На такія тавары, як малако, масла, смятана, кефір, хлебабулачныя вырабы, бакалея і цукар, назіраецца рост да 10 капеек, адзначаюць супрацоўнікі аб'яднання прафсаюзаў падчас маніторынгу цэн у крамах рэгіёна.

Між тым вопыт падобнай сумеснай работы па кантролі за цэнамі з боку дэпутата і прафсаюзных спецыялістаў плануецца працягнуць і надалей. Дарэчы, калі падчас наведвання аб'екта гандлю ўзнікнуць сумненні ў якасці пэўнай прадукцыі, Ірына Даўгала як дэпутат можа скарыстацца сваім правам — заклікаць адказныя органы да праверкі тавараў, ініцыяваць правядзенне экспертызы.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

---

Так было? Было!

# Непрыдуманыя гісторыі Сяргея Барадзіна

## Былы выпускнік магілёўскай вышэйшай «міліцэйскай» установы сёння разам з тэорыяй прыводзіць курсантам прыклады са свайго практычнага вопыту

**Гэта цяпер установа называецца Магілёўскі інстытут міліцыі, а ў той час, калі ў ёй вучыўся курсант Сяргей Барадзін, гэта была спецыяльная школа транспартнай міліцыі. За час сваёй службы ён прайшоў шлях ад звычайнага ўчастковага да начальніка аддзела ўпраўлення па наркакантролі. Працаваў следчым, аператыўным дзяжурным, начальнікам крымінальнай міліцыі, узначальваў РАУС — адным словам, атрымаў бясцэнны практычны досвед. І зараз яму не трэба прыдумваць нейкія там прыклады, каб пацвердзіць тое, што напісана ў падручніках. Некаторыя яго гісторыі, напэўна, будзе цікава паслухаць і нашым чытачам.**



Фота з архіва Магілёўскага інстытута МУС.

### Трэба быць крыху Шэрлакам Холмсам

— Гэта здарылася ў трывожныя 90-я гады, калі назіраўся ўсплёск злачыннасці, — расказвае Сяргей Барадзін. — Я абслугоўваў тэрыторыю мікрараёна 30 гадоў Перамогі. У нядзелю раздаецца званок: «Хутчэй бяжы на работу, у цэбе на ўчастку забойства». Забілі маладога хлопца, які толькі што дэмабілізаваўся з арміі. Ніякіх канцоў, за што можна было б зачапіцца. Пачаў прапрацоўваць версіі. Пятніца і субота — дні, калі праводзяцца вяселлі, і, хутчэй за ўсё, малады чалавек якраз адтуль і вяртаўся. Тады начных клубаў яшчэ не было, і гэта версія мне падалася самай падыходзячай. У Магілёве было чатыры загсы, і я ўзяў інфармацыю па ўсіх вяселлях, якія прайшлі ў абазначаныя дні. Спіскі атрымаліся вялікія. Сустракаўся з маладымі, іх гасцямі — назбіралася больш за тысячу чалавек. І сярод іх знайшоўся сведка. Ён вяртаўся ў дзве гадзіны ночы і бачыў тых людзей, якія нас цікавілі. Такім чынам атрымалася выйсці на забойцаў хлопца і раскрыць злачынства.

### Руды, канапаты, але... дзядулю не чапаў, проста скраў сумку

— У сталовай непадалёк ад вуліцы Цімірязеўскай у жанчыны скралі сумку. А разам з ёй 25 рублёў і ваенны білет. Пагутарыў з работнікамі сталовай — адна супрацоўніца выказала здагадку, што ў справе маглі быць задзейнічаны дзеці. «Тут часта бегаюць хлопчыкі 10-11 гадоў», — сказала яна. На вуліцы лета, вокны сталовай расчыненыя, а пацярпелая якраз паставіла сваю сумку на падаконнік, і тая праз нейкае імгненне знікла. Карцінка стала складвацца вельмі хутка. Побач школа, і я пайшоў гутарыць з яе дырэктарам накont вучняў згаданага ўзросту. Была асаблівая прыкмета, якую падказалі работнікі сталовай. Сярод тых, хто бегае пад іх вокнамі, ёсць адзін руды і вельмі нахабны. На гэтае апісанне і арыентаваўся, хоць вельмі дрэнна ўяўляў сабе, як па знешнім выглядзе можна вызначыць нахабства. Але, напэўна, кемлівасць аператыўніка спрацавала. Гэтага рудога я адразу ж пазнаў сярод іншых хлопчыкаў. У яго сапраўды былі нахабныя вочы. Забраў яго з сабой і пытаюся: «Як вучышся? Чым займаешся?» А потым рэзка: «Куды сумку дзеў?» Той разгубіўся і адразу ж выдаў: «У калодзеж схавалі». Так сумка і знайшлася, а рудога і яго таварышаў я вырашыў не караць, былі ў нас на той момант такія паўнамоцтвы. Правёў з ім прафілактычную работу, а на камісію адпраўляць справу не стаў. Пашкадаваў хлопца, ён быў са шматдзетнай сям'і. Але ўсе 12 гадоў, пакуль там працаваў, адсочваў яго лёс. Хлопец сапраўды выправіўся, стаў добрым чалавекам.

### Крымінал міжнароднага маштабу

Гісторыя адбылася ў пачатку нулявых, калі я працаваў ва ўпраўленні крымінальнага вышуку. Мы тады вельмі цесна супрацоўнічалі з калегамі з Расіі. Да нас паступіў сігнал, што прапаў прадпрымальнік — паехаў па рэкламе прадаваць сваю машыну і знік. Пачалі шукаць сляды і высветлілася, што зніклы «Мерседэс» «засвяціўся» ў Смаленску. Мы прыехалі туды і арганізавалі мерапрыемства па куплі гэтай машыны. Прадаўцамі аказаліся двое жыхароў Смаленска, у аднаго з якіх у Магілёве раней жыла бабуля. Хутка ён прызнаўся, што разам з напарнікам забіў прадпрымальніка, а машыну яны вырашылі прадаць у Смаленску. Злачынства, здавалася б, раскрытае, але толькі напалову. Пакуль цела забітага не знойдзена, нельга нават завесці крымінальную справу. Дзякуй смаленскім калегам, якія пайшлі нам насустрач. На падставе паказанняў злачынцаў яны завялі крымінальную справу. Заставалася толькі неяк пераканаць падазраваных выехаць на тэрыторыю Беларусі, каб паказаць тое месца, дзе яны схавалі труп. Усё ж такі жыхары іншай краіны, маглі і адмовіцца. Тады б справа яшчэ больш зацягнулася. Але яны пагадзіліся супрацоўнічаць. Канвой, пераход граніцы, прыезд у Магілёў, эксгумацыя трупа, яго апазнанне — усе гэтыя этапы мы адлюстравалі ў матэрыялах справы і перадалі яе смаленскім калегам для далейшага правасуддзя.

### Справа дальнабойшчыкаў

— Пра нашумелую справу дальнабойшчыкаў, напэўна, чулі ўсе. Група Лучкіна «працавала» ў Бабруйску — здзяйсняла разбоі на дарогах, нападала ў асноўным на фуры. Мы з АМАПам рабілі пасткі: бралі машыну, загружалі яе муляжамі-скрынкамі з апаратурай, вешалі ўкраінскія або нямецкія нумары і выязджалі на «паляванне». У выніку група была затрыманая.

### Студэнта забілі... аднагрупнікі

— У 2002 годзе прапаў студэнт Якубаў з Беларуска-расійскага ўніверсітэта: выехаў таксаваць і знік. Хутка паблізу вёскі Гаі ў рэчцы ўсплыў труп са слядамі гвалтоўнай смерці. Як потым высветлілася, студэнта забілі, забралі яго мабільны тэлефон і аўтамагнітолу, а машыну спалілі на Дачным. Тады тэлефон быў дарагім задавальненнем і меў яго далёка не кожны. Трэба было вызначыць IMEI-нумар тэлефона забітага. Гэта цяпер лёгка даведацца пра ўладальніка гаджэта, адсачыць яго, а раней для гэтага неабходна было ехаць у Мінск, падаваць запыт і чакаць адказу. Доўгі час тэлефон быў заблакаваны, а калі атрымалася яго «ўключыць», адразу ж выйшлі на забойцаў. Імі аказаліся аднагрупнікі забітага. Матыў просты — зайздрасць. Хлопец быў з забяспечанай сям'і, падпрацоўваў, вучыўся ва ўніверсітэце, сустракаўся з сімпатычнай дзяўчынай, ездзіў на ўласнай машыне. Аказваецца, гэтага дастаткова, каб адправіць чалавека на той свет.

* * *

У арсенале выкладчыка ёсць гісторыі на ўсе чалавечыя заганы. Зараз, на шчасце, няма арганізаваных груп, як гэта было раней, жорсткіх забойстваў, але з'явіліся іншыя прыкметы ўжо новага часу.

— Каб быць у курсе падзей, я заўсёды трымаю сувязь з практыкамі, нашымі ўчарашнімі выпускнікамі, — кажа суразмоўнік. — У курсантаў я выкладаю розныя дысцыпліны аператыўна-вышуковай дзейнасці і магу з упэўненасцю сказаць, што нашы будучыя міліцыянеры — не кніжныя аператыўнікі, а практыкаарыентаваныя следчыя. Штодня з курсантамі праводзяцца практычныя заняткі на базе РАУС, яны ходзяць на дзяжурствы ў складзе следча-аператыўнай групы і працуюць нароўні з практыкамі. Асабіста я рэкамендую ім уважліва чытаць класіку. Пераканаўся асабіста — гэтыя веды заўсёды спатрэбяцца на практыцы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Валерый ПАЛІШЧУК, начальнік Магілёўскага інстытута МУС, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

— Магілёўскі інстытут МУС — найстарэйшая «кузня» міліцэйскіх кадраў. Я сам былы выпускнік гэтай «міліцэйскай» ВНУ, прайшоў шлях ад курсанта да генерала. У нас працуе высокапрафесійны навукова-педагагічны калектыў. І галоўны прыярытэт — не зламаць тое, што было зроблена да нас, не страціць былыя традыцыі і пры гэтым прыўнесці нешта новае, сучаснае. Будучых спецыялістаў мы вучым выяўляць, раскрываць, расследаваць злачынствы, зыходзячы са старой школы вышуку, але з улікам сучасных метадаў.

# Чаму зацягнуўся капітальны рамонт?

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

— Тое, што наш дом нарэшце трапіў у графік капітальнага рамонту, мы сустрэлі з аптымізмам, — расказвае жанчына. — Дом даволі стары, панэлі тонкія, у межсезонны перыяд холадна. Але даведаліся, што ўцяпляць будуць толькі тарцы. Таму мы выступалі за тое, каб сродкі накіравалі на ўцяпленне дома, а не на мантаж балконаў. Як нам стала вядома з тэхнічнага заключэння, агульны стан пліт





балконаў здавальняючы. Дэфекты можна ліквідаваць кропкава. Няма патрэбы выдаткоўваць сродкі на пліты і рамонт балконаў.

Алена Іосіфаўна балкон зашкліла, каб затрымаць цяпло. Прывяла ў належны стан — знутры і звонку ён абшыты сайдынгам. Эстэтычны выгляд дапаўняе кветнік, які жанчына высаджвае вясной. Рашэнне аб дэмантажы рам стала для яе непрыемным сюрпрызам.

— Мы выходзім ранкам, а ў нас на шыльдзе вісіць аб'ява аб рамонце і прадпісанне вызваліць балконы для работ. Мы былі ў шоку. Камунальнікі адказалі, што яны не абавязаны пытаць жыхароў, — абураецца Алена Іосіфаўна. — Атрымліваецца, што мне трэба наняць майстроў, каб зняць гэтую раму, якая абышлася ў 700 долараў. А потым куды яе, на сметнік? Мне, як пенсіянерцы, складана сабраць грошы на новую.

Магчыма, жыхары не сталі б так супраціўляцца і выканалі прадпісанні ЖЭСа аб дэмантажы рам, калі б яны маглі пасля рамонту паставіць іх наноў. Але памеры новай агароджы адрозніваюцца ад папярэдняй. Таму былыя рамы пад іх не падыходзяць. Спрэчкі цягнуліся не адзін месяц. Работы павінны былі завяршыцца яшчэ ў верасні мінулага года. З-за таго, што некаторыя жыхары адмовіліся дэмантаваць рамы, тэрміны рамонту пастаянна пераносіліся. Спачатку да леташняга снежня, потым да сакавіка. У красавіку камунальныя службы звярнуліся ў суд. УЖРЭП падало іск да 11 жыхароў дома, каб прымусіць іх зрабіць дэмантаж, паколькі дабраахвотна яны гэтага не зрабілі.

Як высветлілася, такога кшталту справа ў судзе Кастрычніцкага раёна Гродна разглядаецца ўпершыню. **Суддзя Сяргей СЛАШЧОЎ** паведаміў, што прадметам судовага разбору з'яўляецца неабходнасць правядзення рамонту. Дом, як высветлілася, не знаходзіцца ў аварыйным стане.

— Жыхары даказвалі, што такой неабходнасці няма. Планавалася, што будзе заключэнне паўторнага абследавання. Але ў хуткім часе ўласнікі кватэр адмовіліся ад гэтага, бо спецыялісты патрабавалі атрымаць поўны доступ да пліты, каб яе ўважліва даследаваць і нават разабраць. Камунальныя службы ў сваю чаргу прадставілі больш дасканалыя аргументы, — зазначыў Сяргей Слашчоў.

Работнікі жыллёва-эксплуатацыйнай службы паведамілі, што падчас абследавання тэхнічнага стану балконаў былі выяўлены дэфекты, якія зніжаюць іх эксплуатацыйныя ўласцівасці — гэта трэшчыны, разбурэнні, аскепкі ахоўнага пласта бетону, карозія рабочай арматуры, разбурэнне тарцоў пліт у выніку адсутнасці адліваў.

І хоць выявілася, што падобныя дэфекты не прыводзяць да парушэння канструкцый, у будучым могуць знізіць яе даўгавечнасць. Таму ёсць неабходнасць гэтыя дэфекты ліквідаваць у ходзе бягучага рамонту — уцяпліць тарцы, выканаць рамонт фасадаў, замяніць аконныя блокі пад'ездаў і падвалаў, дах і іншае. Пашкоджаныя ўчасткі балконаў павінны прайсці апрацоўку пескаструменнымі апаратамі з нанясеннем трывалай грунтоўкі. На арматуры неабходна выдаліць іржу і таксама апрацаваць, цалкам замяніць агароджу. Суд з такім раскладам работ пагадзіўся і абавязаў жыхароў выканаць дэмантаж балконных рам.

— Рамонт рабіць трэба, бо балконы — аб'екты небяспечныя. І хоць на сённяшні дзень пагрозы абрушэння няма, але тыя пашкоджанні, якія зафіксаваны, могуць паўплываюць на эксплуатацыю ў далейшым. А дэфекты, як вядома, з кожным разам толькі пагаршаюць стан аб'екта і праяўляюцца ўсе больш і больш. І можа здарыцца абрушэнне, а гэта ўжо — пытанні бяспекі іншых, — выказвае сваю пазіцыю суддзя.

Вядома, жыхарам давядзецца панесці пэўныя выдаткі. З-за гэтага, уласна кажучы, і разгарэлася спрэчка. Спачатку заплаціць за дэмантаж, потым яшчэ і за ўстаноўку новай рамы. У гэтым выпадку жыхары, можна сказаць, сталі закладнікамі старой сістэмы будаўніцтва, калі дамы здавалі без шклення балконаў. Уласнікі сучасных кватэр пазбаўлены такога супрацьстаяння.

— Тут ёсць прынцыповая розніца. Калі ў мяне, скажам, па праекце закладзена шкленне, службы, якія рамантуюць, абавязаны ўсё гэта ўзнавіць. Паколькі ў першапачатковым праекце старой «панэлькі» такога няма, ніхто не абавязаны такія аб'екты ўзнаўляць. Жыхары робяць гэта самі. Яны павінны дапусціць будаўнікоў да пліт, даць магчымасць замяніць металічныя агароджы, і на гэтым кропка. Закон не прадугледжвае, каб камунальныя службы ўзнаўлялі рамы, — канстатуе суразмоўнік.

Зараз у суд паступіла яшчэ адна падобная справа. Між тым большасць уласнікаў кватэр, якія сутыкнуліся з такой праблемай, ідуць будаўнікам на сустрэчу. Гэта мае свае «плюсы». Па-першае, рамонт дома ідзе хутчэй, па-другое — балконы жыхароў прыводзяцца ў належны стан. У сваю чаргу, камунальныя службы і самі імкнуцца не даводзіць справу да суда. Як расказаў **начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела Гродзенскай гарадской ЖКГ Павел КОНЕЎ,** будаўнікі стараюцца рабіць сваю работу з максімальнай зручнасцю для людзей. Перад рамонтам абавязкова праводзяцца сходы, даследаванні, перадпраектныя, праектныя работы. Да пажаданняў жыхароў дома стараюцца прыслухоўвацца, каб пазбегнуць зацяжных канфліктаў.

Дарэчы, у доме па вуліцы Лізы Чайкінай рамонт амаль завершаны. Будынак прыкметна абнавіўся, балконы набылі новы выгляд. З некаторымі жыхарамі знойдзена кампраміснае рашэнне. Ім зробяць агароджу з такім разлікам, каб яны маглі паставіць назад свае былыя рамы. Але гэта, хутчэй, выключэнне з правілаў, бо рамонт тыпавых шматпавярховікаў не прадугледжвае індывідуальнага падыходу.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

Будзьце пільныя!

## Крадуць тысячы рублёў

Імклівы рост кіберзлачыннасці адзначаюць следчыя ў Гомельскай вобласці

**У рэгіёне колькасць злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій павялічылася амаль удвая ў параўнанні з мінулым годам. Так, сёлета за дзесяць месяцаў зарэгістравана 2295 злачынстваў дадзенай катэгорыі, летась за аналагічны перыяд — 1177. Найбольшы рост колькасці такіх злачынстваў у рэгіёне адзначаецца ў Гомелі, Жлобінскім, Мазырскім, Рэчыцкім і Светлагорскім раёнах.**

Шырока распаўсюджана злачынная схема крадзяжу грошай з карт-рахункаў пры дапамозе вішынгу. Гэта калі зламыснік пад выглядам банкаўскага работніка праз псіхалагічныя маніпуляцыі ў тэлефоннай размове выведвае рэквізіты банкаўскіх картак грамадзян.

— Так, у жніўні гэтага года «кансультант» пераканаў 32-гадовага жыхара Гомеля ў тым, што з яго карты спрабуюць зняць сродкі, — адзначае **афіцыйны прадстаўнік УСК па Гомельскай вобласці Марыя КРЫВАНОГАВА.** — Пры дапамозе псіхалагічнага ўздзеяння злачынец выведаў у мужчыны рэквізіты картак Беларусбанка і Белгазпрамбанка, а таксама SMS-коды для пацвярджэння аперацый. У выніку гамяльчанін пазбавіўся зберажэнняў у нацыянальнай і замежнай валютах на суму 15 тысяч рублёў у эквіваленце.

У кастрычніку 62-гадовы жыхар Мазыра паведаміў зламысніку рэквізіты сваіх чатырох банкаўскіх картак і адной карткі жонкі. Сям'я страціла звыш 41 тысячы рублёў з карт-рахункаў.

— Распаўсюджаным спосабам крадзяжу грашовых сродкаў з карт-рахункаў грамадзян з'яўляецца фішынг — гэта дзеянні, скіраваныя на атрыманне канфідэнцыяльнай інфармацыі праз прадастаўленне спасылак на фэйкавыя інтэрнэт-старонкі, — тлумачаць у абласным упраўленні СК. — Часцей за ўсё такая схема прымяняецца да карыстальнікаў гандлёвых інтэрнэт-пляцовак.

Так, у пачатку лістапада жыхарка Жыткавіч размясціла аб'яву аб продажы абутку. З ёй звязалася патэнцыйная пакупніца і папрасіла на ўмовах поўнай перадаплаты перадаць пакупку праз кур'ерскую службу. Пакупніца «скінула» жанчыне фішынгавую спасылку на сайт гандлёвай пляцоўкі для ўвядзення рэквізітаў банкаўскай карткі. Пацярпелая паказала даныя карткі растэрміноўкі, з якой у далейшым было спісана амаль дзве тысячы рублёў.

У зоне рызыкі з-за кіберзлачынных схем і грамадзяне, якія перадаюць свой мабільны сродак сувязі незнаёмым асобам. Зламыснікі падключаюцца да паслугі v-banking, атрымліваюць ад апаратара сувязі хуткі крэдыт у памеры да 100 рублёў і пераводзяць грошы на свой рахунак.

— У вытворчасці следчага ўпраўлення УСК па Гомельскай вобласці знаходзілася крымінальная справа ў дачыненні да пяці непаўналетніх, якія на працягу паўгода падманвалі даверлівых жыхароў Гомеля, — адзначае Марыя Крываногава. — Зламыснікі прасілі тэлефоны ў гамяльчан ва ўзросце ад 10 да 18 гадоў. Пацярпелымі па справе прызнаны 61 чалавек, 26 з іх былі высветлены ў ходзе следства.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

## Антыкрызісны прывёў да яшчэ большага крызісу

**Крымінальныя справы за крадзеж і перавышэнне ўлады заведзены ў адносінах да антыкрызіснага кіраўніка акцыянернага таварыства Магілёўскай вобласці, якое спецыялізуецца на перапрацоўцы і кансерваванні садавіны і агародніны і з 2015 года знаходзіцца ў стадыі санацыі.**

Злоўжыванні выявіліся падчас праверкі суб'екта гаспадарання ўпраўленнем Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці.

— Антыкрызісны кіраўнік заключаў фіктыўныя дагаворы арэнды з суб'ектамі гаспадарання Расійскай Федэрацыі, у выніку чаго з разліковага рахунку прадпрыемства ў студзені 2018 года і ў сакавіку 2019-га было пералічана больш чым 28 тысяч рублёў, — адзначыла **намеснік начальніка ўпраўлення Святлана КАЛОДЗІСТАЯ.** — Акрамя гэтага, у 2016-м і 2019 гадах афармляліся дагаворы на перапрацоўку давальніцкай сыравіны, пры якіх аплата работ таварыства наўмысна заніжалася ў 1,5-2 разы. Як вынік, таварыства недаатрымала больш чым 3,4 мільёна рублёў выручкі, а сама дзейнасць па перапрацоўцы сыравіны стала стратнай. Былі і іншыя парушэнні.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## Арсенал не нанясе страты

Каля шасці кіламетраў сетак і іншыя браканьерскія прылады былі канфіскаваныя на рынку ў Брэсце

— Днямі падчас маніторынгу гандлёвых аб'ектаў Брэсцкая абласная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету выявіла два факты незаконнага продажу забароненага рыбалоўнага арсенала, — паведаміў **намеснік начальніка інспекцыі Сяргей МЫЧКО.**

На цэнтральным рынку дзяржінспектары канфіскавалі сеткі агульнай даўжынёй 5768 метраў, 52 сеткавыя экраны і два браднікі (валакушы). Прыкладны кошт названых прылад па цэнах «чорнага рынку» складае 4000 рублёў. Цяпер гэты незаконны арсенал ужо не нанясе ўрон прыродзе.

У адносінах да гандляроў распачаты адміністрацыйны працэс. Канчатковае рашэнне аб пакаранні памагатых браканьераў прыме суд.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Практычны падыход

# ІМПЛАНТАЦЫЯ ЗУБОЎ: ЦІ ЁСЦЬ ПАДСТАВЫ ДЛЯ СТРАХУ І СУМНЕННЯЎ?

**Урачы папярэджваюць: нават калі з нейкіх прычын прыйшлося выдаліць адзін зуб, яму патрэбная замена. Сёння пры імплантацыі выкарыстоўваецца столькі сучасных метадаў, тэхнік і матэрыялаў, што справіцца з гэтым нескладана. Што называецца, любы капрыз за вашы грошы. Зменшыўся аб'ём косці — на дапамогу прыходзіць косная пластыка, а трохмерная камп'ютарная праграма дазваляе расставіць імпланты патрэбных формаў і памераў менавіта ў тых месцах, дзе неабходна, не задзеўшы нерв і сасуды. Чаму не трэба цягнуць з імплантацыяй? Ці падыходзіць такі метад узроставым пацыентам, якія цалкам страцілі зубы? І нарэшце, колькі каштуе зубны пратэз? Пра гэта і іншае расказала стаматолаг-хірург 7-й гарадской стаматалагічнай паліклінікі Вольга КОМАР.**



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

## Нятанны, але самы эфектыўны

***— Вольга Раманаўна, якія сёння ёсць спосабы замяніць страчаны зуб?***

— Ёсць некалькі варыянтаў выправіць сітуацыю. Гэта мостападобны пратэз, калі на два суседнія з адсутным зубы ўстанаўліваецца падвясная канструкцыя. Яшчэ адзін няздымны варыянт — імплантацыя. Імплантат ужыўляецца ў косць і зверху ставіцца каронка. Выкарыстоўваюцца і здымныя канструкцыі. Часткова здымныя — у выпадку, калі частка зубоў ёсць, і здымны пратэз фіксуецца за кошт аплікаў, якія чапляюцца за ўласныя зубы. І цалкам здымны — калі ўвогуле адсутнічаюць уласныя зубы. Яны фіксуюцца за кошт анатамічных структур поласці рота — мышцаў, языка, альвеалярнага адростка.

***— Які з гэтых метадаў самы прагрэсіўны сёння?***

— Безумоўна, імплантацыя. У ім ёсць адзін мінус — гэта дарагі метад. Але па ўсіх астатніх крытэрыях толькі плюсы. Ён найбольш фізіялагічны: калі ў пацыента адсутнічае толькі адзін зуб, не трэба чапаць суседнія здаровыя зубы. І што немалаважна, дасягаецца доўгачасовы эфект. Па апошніх даных, няздымны мостападобны пратэз мае тэрмін службы дзесяць гадоў. За гэты час усяго 8—12 % пратэзаў прыходзіць у непрыгоднасць, калі ж яго выкарыстоўваць гам 15 гадоў — то ўжо 30 %. Імплантацыя паказвае лепшыя вынікі.

***— І які тэрмін службы імплантаванага зуба?***

— Тут як пашанцуе. Важна, ці прытрымліваецца пацыент гігіены, а таксама стан яго агульнасаматычнага здароўя. Калі ўсё добра, то дакладна хапае на 20—25 гадоў. Паколькі гэта сучасныя тэхналогіі, няма навуковых даных пра большыя тэрміны.

У 1952 годзе ўрач агульнай практыкі Бранемарк, вывучаючы посттраўматычныя працэсы ў косці на жывёлах, ставіў аптычную камеру на аснове тытану. І выявіў, што яна прыжываецца — зрастаецца з косцю. Так ён адкрыў астэаінтэграцыю. У 1965 годзе прапанаваў прымяняць яе ў стаматалогіі. Спачатку імпланты былі пласціністыя, яны ўкручваліся шурупамі. З часам мянялася іх форма, пакуль не прыйшлі да конуснай, якая добра сябе зарэкамендавала. Яна максімальна набліжаная да фізіялагічнай. Цяпер выкарыстоўваецца два напыленні: тытанавае і гідраксіапатыт. У большасці выпадкаў перавагу аддаюць першаму. Тытанавы сплаў гіпаалергенны, ніякіх праблем звычайна не выклікае. За кошт гэтага пакрыцця адбываецца зрашчэнне імплантата з косцю.

***— Як яго замяняць?***

— Калі прыходзіцца замяняць, значыць, маецца запаленчы працэс. Бо, натуральна, нічога лепшага за ўласны зуб няма, якімі б сучаснымі ні былі матэрыялы, тэхніка і методыка. Імплант выразаецца блокам — разам з косцю. Даецца час на зажыўленне, падчас якога наша косць аднаўляецца, хоць і вельмі марудна, затым робіцца паўторная імплантацыя.

## Вас тут не стаяла!

***— Калі зуб прыйшлося выдаліць, у які час пасля гэтага пажадана паставіць імплант?***

— Імплантацыя — добры метад у тым ліку і для маладых пацыентаў, у якіх суседнія зубы здаровыя. Пасля выдалення хворага зуба наш арганізм падстройваецца — з-за адсутнасці нагрузкі змяншаецца косць, суседнія зубы імкнуцца заняць вольнае месца. Таму лепш за ўсё паставіць імплантат цягам года. У гэты час якраз захоўваецца максімальны аб'ём косці. Пасля выдалення штогод яна змяншаецца ў сярэднім на чатыры міліметры. Калі зуб выдалілі ў 16 гадоў, то ўжо ў 25 аб'ём косной тканкі істотна страчаны. Таму лепш адразу, даўшы час на аднаўленне косці (да шасці месяцаў), заняцца пратэзаваннем.

Варта разумець, што косць змяншаецца не толькі па вышыні, але і па шырыні. Адбываецца і дэфармацыя альвеалярнага адростка. Суседнія зубы пачынаюць перамяшчацца ў вольнае месца, нахіляюцца. Калі зуб адсутнічае ў ніжняй сківіцы, то верхні таксама спускаецца ўніз, гэта з'ява носіць назву феномен Папова-Гадона. У выніку застаецца мала месца для каронкі. З-за гэтага ўтвараецца і шмат іншых праблем. Наша ніжняя сківіца рухаецца адносна верхняй. Можа ствараецца блок, калі абмяжоўваецца рух ніжняй сківіцы, могуць узнікнуць праблемы з суставам. Таму калі няма зуба, лепш яго хутка аднавіць.

***— Калі адсутнічае не адзін, а два-тры зубы, але з фінансавых прычын немагчыма адразу цалкам зрабіць імплантацыю, ці можна рабіць гэта паступова?***

— Канструкцыя адна, таму лепш усё адразу. Тут варта пачакаць, сабраць грошы і потым ўсё запратэзаваць.

***— Як быць, калі аб'ём косці істотна зменшыўся?***

— Цяпер у стаматалогіі ёсць косныя пластыкі, косць можна «падсыпаць». Тое, што адсутнічае неабходны аб'ём, не прычына адмаўляцца ад імплантацыі. Але паўтару: чым раней вы звярнуліся да стаматолага і пачалі вырашаць праблему, тым лепш, бо чым далей, тым даражэйшае атрымаецца лячэнне.

***— Ці існуюць супрацьпаказанні для імплантацыі?***

— Вялікіх праблем з гэтым сёння няма. Асноўныя супрацьпаказанні — гэта інфекцыйныя захворванні (ВІЧ, гепатыт, сіфіліс), а таксама цукровы дыябет і анкалогія. Але калі ВІЧ, гепатыт, цукровы дыябет у дэкампенсаванай форме, калі пацыент знаходзіцца падназіраннем і на лячэнні, то праблем і з гэтым няма. Пры цукровым дыябеце адмовяць толькі калі паказчык цукру вышэйшыя за 7,5 ммоль/л. Калі пацыент кантралюе хваробу, можна паставіць імплантат. Перад аперацыяй хірург просіць здаць пэўныя аналізы, усё гэта абмяркоўваецца на кансультацыі, робіцца рэнтгеналагічны здымак, і толькі пасля прызначаецца аперацыя.

Адным з супрацьпаказанняў з'яўляецца бруксізм — міжвольны скрыгат зубамі ўначы. З-за дадатковай нагрузкі можа разбурыцца імплантат. Як варыянт, у такім выпадку прапануюцца індывідуальныя капы на ноч. Іншых сур'ёзных супрацьпаказанняў няма.

## На любы ўзрост і кашалёк

***— З якога ўзросту можна рабіць імплантацыю?***

— З 18 гадоў. Раней непажадана, бо дзіця расце. Калі была траўма, і прыйшлося выдаліць зуб, трэба пачакаць, калі скончыцца перыяд росту.

***— У якім узросце людзі становяцца наведвальнікамі хірурга-стаматолага?***

— Усё залежыць ад пацыента і таго, як ён адносіцца да сваіх зубоў. Найчасцей страчваюцца зубы пасля 50 гадоў.



***— Імплантацыя падыходзіць для ўзроставых пацыентаў?***

— Канешне. Прычым сучасныя тэхнікі сёння дапамагаюць там, дзе раней нічога зрабіць было немагчыма. Здараецца, ва ўзроставых пацыентаў з-за ранняга выдалення косць зменшылася настолькі, што нават здымны пратэз не трымаецца — не хапае анатамічнай рэтэнцыі (утрымлівання). Тады можна выкарыстоўваць імплантацыю. У 50—60 гадоў прымяняецца тэхніка «All-in-4» (усё на чатырох) — устанаўліваюць чатыры імпланты, і на іх можна зрабіць няздымны пратэз. Калі пацыент больш пажылы і ў яго здымныя пратэзы, якія ўжо не фіксуюцца, можна ўстанавіць два імпланты, якія ствараюць рэтэнцыю. Пратэзы на іх трымаюцца і зашчоўкваюцца, пацыент іх можа здымаць і надзяваць. Такім чынам імпланты выкарыстоўваюцца для рэтэнцыі пры поўнай адсутнасці зубоў.

***— Як увогуле адбываецца пратэзаванне?***

— Мы маем справу з імплантатам (гэта частка, якая ўжыўляецца ў косць), пераходнай часткай — абатментам (гэта наддзяснення частка), і зверху мацуецца каронка. Такім чынам, уся канструкцыя складаецца з трох частак, якія паступова ўстанаўліваюцца.

Ёсць розныя віды імплантатаў, гэта шырокая лінейка, і іх выбіраюць, зыходзячы з індывідуальных пераваг і клінічнага выпадку. Розныя і віды імплантацый: аднаэтапныя і двухэтапныя. Падчас аднаэтапнай імплант ужыўляецца адразу з абатментам, праходзіць час зажыўлення і адразу пратэзуюць. Гэта займае ад трох да шасці месяцаў у залежнасці ад шчыльнасці косці.

Але найлепшы эфект ад двухэтапнай імплантацыі. Адбываецца гэта наступным чынам. Спачатку выдаляецца зуб. Калі меў месца запаленчы працэс, тры-чатыры месяцы ён зажыўляецца і аднаўляецца косць. Наступны этап — уласна імплантацыя: рыхтуецца коснае ложа, уводзіцца туды імплант, заглушка, і зашываецца. Зноў даецца час на зажыўленне — тры-шэсць месяцаў у залежнасці ад шчыльнасці косці. Наступны этап хірургічны — раскрыццё імпланта, куды ўкручваецца фарміравальнік дзяснення манжэткі, каб усё выглядала эстэтычна. Пацыент з ім ходзіць два тыдні: нарастае дзясна, ёй надаецца контур. Далей пацыент ідзе да артапеда, і той укручвае абатмент і фіксуе каронку.

***— Колькі часу праходзіць ад выдалення зуба да з'яўлення новага?***

— Усё залежыць ад складанасці канструкцыі, у сярэднім год.

***— Колькі каштуе адзін імплантаваны зуб?***

— Гэта залежыць ад мноства фактараў: ёсць танныя сістэмы і сістэмы прэміум-класа. Калі браць самыя танныя з улікам мінімуму непрадбачаных абставін, якія нярэдка ўзнікаюць у працэсе, то каля 500 рублёў каштуе імплантацыя і столькі ж — каронка. Нямала пацыентаў сёння аддаюць перавагу дарагім сістэмам. У іх свае «плюшкі». Такія кампаніі даўно на рынку, як правіла, гэта швейцарскія вытворцы. Калі з'яўляюцца нейкія праблемы, маецца гарантыя і можна замяніць імплант.

У Мінску шмат варыянтаў імплантаў: акрамя швейцарскіх, ёсць нядрэнныя ізраільскія, нядаўна прыйшлі на рынак карэйскія і добра сябе зарэкамендавалі па якасці.

***— Наколькі важная гігіена зубоў, калі ўстаноўлены імплант?***

— Пасля пастаноўкі імпланта вам трэба прыходзіць на агляд да ўрача раз у тры-чатыры месяцы цягам года — для таго, каб высветліць, як паводзіць сябе пратэз у працэсе нагрузкі. Праз шэсць месяцаў робіцца КТ — каб пракантраляваць, ці не змяншаецца аб'ём косці. На жаль, з часам нават пры імплантаце крыху змяншаецца аб'ём коснай тканкі. Потым прыходзіць да ўрача дастаткова раз на год цягам трох гадоў. Далей, калі ўсё стабільна, пацыент вольны прыходзіць да ўрача па меры неабходнасці.

Можна звярнуцца па прафесійную гігіену — усё ж не заўсёды пацыент самастойна можа дабрацца да цяжкадаступных месцаў. Навучанне гігіене — важны момант, і з некаторымі пацыентамі яго трэба пачынаць яшчэ да імплантацыі. Некаторым людзям сапраўды не стае культуры догляду зубоў.

Па сутнасці, ніякіх асаблівых правілаў для імплантаваных зубоў няма. Іх варта чысціць, самі яны не ачышчаюцца. Зубны налёт — гэта ўмоўна-патагенныя мікраарганізмы. І пры змяншэнні ахоўных фактараў нашага арганізма яны могуць стаць патагеннымі. Для чысткі зубоў сёння ёсць шмат прылад. Шчотка, паста і зубная нітка — гэта тая база, якая неабходна пры штодзённым доглядзе кожнаму. Зубную нітку можна замяніць ёршыкам, яны рознага дыяметра і памеру, таму падбіраюцца ў стаматолага індывідуальна.

Дадаткова дапамагае ірыгатар, гэта апарат, які з дапамогай вады пад ціскам вымывае рэшткі ежы і налёт. Ён карысны і пры наяўнасці брэкет-сістэм. Туды можна заліваць не толькі ваду, а і апалосквальнікі, раствор рамонку, хлоргексідзін для зняцця запалення дзясны.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Мясцовае Самакіраванне

27 лістапада 2020 г. № 45 (581)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# АБ'ЯДНАЦЬ НАМАГАННІ Ў ВЫХАВАННІ

## падрастаючага пакалення, каб яно было максімальна эфектыўнае

**Нарада з удзелам святароў, прадстаўнікоў Міністэрства адукацыі і парламентарыяў адбылася ў Савеце Рэспублікі, які выступіў пляцоўкай для абмеркавання важнай тэмы — сённяшніх працэсаў, звязаных з адукацыяй і навучаннем дзяцей і моладзі.**



Фота БелТА.

Сустрэча была пабудавана такім чынам, каб кожны яе ўдзельнік змог выказацца і абмеркаваць усе пытанні, якія сёння датычацца духоўна-маральнага выхавання падрастаючага пакалення: дашкольнікаў, школьнікаў, студэнтаў. **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** акцэнтавала ўвагу на неабходнасці максімальнай адкрытасці гэтага дыялогу. Па выніках гутаркі, адзначыла яна, павінны быць выпрацаваны падыходы, якія варта развіваць, каб работа па выхаванні падрастаючага пакалення была больш эфектыўная.

**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі ВЕНЬЯМІН** падкрэсліў, што доўгі час у грамадстве фарміравалася сваё разуменне мадэлі паспяховасці:

— Каб малады чалавек добра вучыўся, атрымліваў адпаведныя веды, займаўся спортам, музыкай і далей у больш дарослым жыцці атрымліваў добры заробак. І вось гэта ўсё складала панацце паспяховасці. Але з часам высветлілася, што гэтага недастаткова, — пераканаы ўладыка. — З аднаго боку, каб быць шчаслівым і дасягнуць мэты свайго жыцця, і з другога, — калі людзі былі арыентаваны толькі на гэтую мэту, яны, атрымліваецца, больш сканцэнтраваны на сабе, на ўласным выніку і не заўважаюць бліжніх, іншых людзей.

Таму, каб выхоўвалася духоўна развітая моладзь, неабходна змяніць гэты падыход, падкрэсліў Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі:

— Зразумела, што маладым людзям важна атрымліваць добрую адукацыю, але разам з тым важна, каб яны любілі Радзіму, — перакананы ён.

У размове з журналістамі **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА** звярнуў увагу, што паміж ведамствам і БПЦ склалася традыцыйнае супрацоўніцтва, дзейнічае адпаведная дамова, створаны каардынацыйны савет па ўзаемадзеянні, рэгулярна праводзяцца яго пасяджэнні.

— У рамках гэтай работы асаблівую ўвагу надаём пытанням духоўна-маральнага выхавання падрастаючага пакалення, — адзначыў ён. — Сёння ў школах з першага да восьмага класа існуюць факультатыўныя курсы «Асновы праваслаўнай культуры». Зараз на экспертызе знаходзіцца адпаведная праграма для старшакласнікаў.

Ігар Карпенка ўдакладніў, што факультатывы, якія зараз рэалізуецца ў школах, вучні наведваюць па ўласным жаданні. Ёсць і іншыя планы для далейшай рэалізацыі:

— З мітрапалітам мы дамовіліся, што працягнем рэгулярныя сустрэчы. Тым больш што ўладыка Веньямін раней займаўся пытаннямі адукацыі ў епархіі, і, адпаведна, дамовіліся, што будзем перыядычна абмяркоўваць пытанні ўзаемадзеяння і ініцыятывы, якія існуюць. Калі ідэі будуць падтрыманыя, мы, канешне, іх агучым, — паабяцаў ён. — Яны будуць адпаведна рэалізаваны ў рамках тых дамоўленасцяў, якія існуюць паміж праваслаўнай царквой і Міністэрствам адукацыі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# Прамая лінія — кожны дзень

**Чарговую прамую тэлефонную лінію правёў днямі начальнік Галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінаблвыканкама, член Савета Рэспублікі Аляксандр БАЧЫЛА. На ўсе пытанні зацікаўленыя атрымалі падрабязную інфармацыю.**

— Калі тэлефануюць грамадзяне, даваць адказы я стараюся адразу, імкнуся вырашаць пытанне імгненна. Калі сітуацыя нестандартная, спрэчная, то яна патрабуе паглыбленага вывучэння. Пры неабходнасці падключаю адпаведныя службы. Мы не назапашваем пытанні, каб перанакіраваць заяўнікаў на прамую тэлефонную лінію ці на прыём грамадзян. Хтосьці скажа, што мы кожны дзень ахвяруем сваім часам, але ў далейшым такія метады работы даюць яго эканомію. Нам не даводзіцца затым гэтыя пытанні раскручваць цэлы месяц. Ды і паперу зберагаем ад лішняй перапіскі. Так што нас не назавеш бюракратамі, — ці то жартам, ці сур'ёзна кажа Аляксандр Аляксандравіч.

Сапраўды, Аляксандр Бачыла не адгароджваецца ад запытаў грамадзян высокай сцяной. Нумар яго тэлефона ў прамым доступе на сайце галоўнага ўпраўлення юстыцыі. Таму ў любы час дня ўсе ахвотныя могуць атрымаць неабходную інфармацыю ў поўным аб'ёме. Тым больш што падчас цяперашняй эпідэміялагічнай сітуацыі Аляксандр Аляксандравіч, ды і іншыя людзі, імкнуцца скараціць колькасць прамых сацыяльных кантактаў.

Дадам, што ў органаў юстыцыі шматпрофільная дзейнасць, таму і пытанні ад заяўнікаў паступаюць featurнабаковыя. Але, бадай, найбольш хвалюючы жыццёвыя сітуацыі. Напрыклад, спагнанне даўгоў, калі адзін суб'ект гаспадарання не вяртае пазыку іншаму, аліментаў на ўтрыманне дзяцей. Цікавіца грамадзяне і тым, як зарэгістравацца ў якасці юрыдычнай асобы, індывідуальнага прадпрымальніка. Яны атрымліваюць вычарпальную кансультацыю па сваім запыце.

Але калі сітуацыя складаная, спецыялісты просяць выкласці ўсё пісьмова з абгрунтаванымі доводамі, аргументамі ўсіх зацікаўленых. Усё больш грамадзян звяртаецца па электроннай пошце. Ёсць магчымасць звярнуцца і па відэасувязі.

**— А якія пытанні часцей за ўсё адрасуюцца вам як сенатару?**

— У верхнюю палату Нацыянальнага сходу я вылучаны ад трох раёнаў: Крупскага, Бярэзінскага і Чэрвеньскага. Я не сказаў бы, што ў жыхароў узнікае шмат пытанняў, як гэта было некалькі гадоў таму. Амаль што ўсе сем'і цяпер маюць інфармацыйныя рэсурсы, яны арыентуюцца, у кампетэнцыі якога дзяржаўнага органа, службы, падраздзялення вырашэнне іх пытання. Мяркую, каля 95 % насельніцтва ведае, да каго ім звяртацца. Далёка не ўсе ідуць на прыём, скажам так, да першага сустрэчнага чыноўніка абласнога, рэспубліканскага ўзроўняў, што прыбыў у раён. Такая практыка, на маё меркаванне, паступова сыходзіць, а ў нашай сферы юстыцыі яна ўжо практычна звялася амаль зусім.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

НА ПРЫЁМЕ

# Якасць і выніковасць — перш за ўсё!

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ правёў прыём грамадзян па асабістых пытаннях.**

Як падкрэсліў у размове з журналістамі старшыня профільнай камісіі, работа са зваротамі грамадзян знаходзіцца ў цэнтры ўвагі ўсіх сенатараў. Так, напрыклад, сёлета за дзевяць месяцаў у Савеце Рэспублікі было зарэгістравана больш за тры тысячы зваротаў грамадзян.

— Мы вельмі ўважліва і старанна прапрацоўваем усе звароты, — акцэнтаваў увагу Сяргей Рачкоў. — Увага зараз аддаецца якасці разгляду зваротаў і іх выніковасці. Дарэчы, у Пастаянную камісію па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы трапляюць звароты не толькі па профілі дзейнасці камісіі, тым не менш мы разглядаем усе звароты грамадзян і імкнёмся максімальна заахвоціць мясцовыя органы ўлады для аказання дапамогі насельніцтву.



Ён расказаў, што за апошні час з удзелам членаў профільнай камісіі вырашаліся пытанні будаўніцтва, рамонту і добраўпарадкавання дарог, аказання дабрачыннай дапамогі шэрагу навучальных устаноў.

— Мы таксама звярнулі ўвагу ва ўмовах распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі на сістэму аховы здароўя і якасць аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву, — прывёў прыклад сенатар. — У прыватнасці, па такіх дастаткова складаных пытаннях, як анкалагічныя захворванні, таму што сёння людзі пакутуюць не толькі ад каранавіруса, але і канешне ж, працягваюць пакутаваць ад шматлікіх хранічных захворванняў.

Ён растлумачыў, што ў Пастаянную камісію звярнулася сястра віцябляніна, закрануўшы тэму наяўнасці медыкаментаў для яе хворага брата, і адзначыў, што да вырашэння згаданага пытання падышлі ўважліва настолькі, наколькі гэта магчыма ў такой сітуацыі.

Што датычыцца цяперашняга прыёму, то да Сяргея Рачкова прыйшоў заяўнік, які цікавіцца тэматыкай будаўніцтва БелАЭС.

— Гэта найбуйнейшы сумесны праект Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй. Канешне ж, ён мае не толькі нацыянальнае, але і міжнароднае значэнне, — падкрэсліў актуальнасць тэмы сенатар. — Таму грамадзянін, як эксперт у гэтай галіне (ён кандыдат тэхнічных навук) выказаў шэраг прапаноў, сваіх меркаванняў аб далейшых перспектывах ядзернай энергетыкі.

Яго ідэі і прапановы ўважліва выслухалі і запэўнілі, што яны патрабуюць больш глыбокага вывучэння. Таму для падрыхтоўкі абгрунтаванага адказу заяўніку іх накіруюць у адпаведныя зацікаўленыя арганізацыі і ведамствы.

— Мы будзем імкнуцца да таго, каб патэнцыял гэтага навукоўца быў задзейнічаны, выкарыстаны для ўдзелу ў навуковых сімпозіумах, магчыма, практычных кансультацыях, — рэзюмаваў старшыня Пастаяннай профільнай камісіі.

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота аўтара.**

# ДАПАМОГА НАБЛІЗІЦЦА ДА КОЖНАГА

## Акрэдытацыя медустаноў, універсітэцкія клінікі, экспертызы якасці і іншае

**Якія навацыі ўхвалілі сенатары пры разглядзе законапраекта «Аб змяненні законаў па пытаннях аховы здароўя і аказання псіхалагічнай дапамогі»?**

— Па сутнасці, гэта новая рэдакцыя законаў, — звярнуў увагу ў гутарцы з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ.**

— Канцэптуальна перагледжаны многія рэчы, якія змогуць рэальна палепшыць даступнасць медыцынскай дапамогі і значна ўдасканаліць яе якасць, — адзначыў ён. — Акрэдытацыя медыцынскіх устаноў, стварэнне міжрэгіянальных цэнтраў у буйных гарадах ці «апорных бальніц» зможа наблізіць да чалавека атрыманне спецыялізаваных відаў медыцынскай дапамогі, якія на дадзены момант выконваюцца ў рэспубліканскіх медыцынскіх цэнтрах.



Фота БелТА.

Паводле яго слоў, дапамога наблізіцца як па часе, так і палепшыцца па якасці — яна не будзе адрозніваецца ад той, што выконваецца цяпер у спецыялізаваных медыцынскіх цэнтрах.

— Мы прапісваем пытанні развіцця ўніверсітэцкіх клінік — пілотны праект зараз рэалізоўваецца на базе былой Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы, і я перакананы, што ён атрымае станоўчую рэалізацыю і распаўсюджанне па ўсёй краіне, — выказаў упэўненасць сенатар.

Пашыраюцца і магчымасці дзённага стацыянара. Віктар Лісковіч растлумачыў, што пацыент, якому не патрабуецца стацыянарнае лячэнне ў медыцынскай установе, набываць медыкаменты за свой кошт для атрымання медыцынскай дапамогі на дзённым стацыянары больш не будзе.

Таксама знайшло адлюстраванне і пытанне дзяржаўнага сацыяльнага заказу ў медыцыне: гэта тыя паслугі, якія патрэбны пажылым грамадзянам, людзям з абмежаванымі магчымасцямі.

— Тут мы таксама зможам прыцягваць іншыя арганізацыі (і гаворка датычыцца не толькі медыцынскіх устаноў) для выканання простых медыцынскіх паслуг, — падкрэсліў суразмоўнік.

Акрамя таго, сярод навацый — новыя віды медыцынскіх экспертыз. Першы мае на ўвазе якасць аказання медыцынскай дапамогі. Другі від экспертызы ацэньвае тую ці іншую медыцынскую тэхналогію. І, нарэшце, трэцяя — прафесійная экспертыза — будзе ацэньваць умовы работы медыцынскага персаналу і ў адпаведнасці з гэтымі ацэнкамі будзе аказвацца падтрымка здароўя медработнікаў.

Як падкрэсліў сенатар, навацый шмат, але ўсе яны скіраваны на адно — каб чалавек, які жыве ў сельскай мясцовасці ці нават у вялікім горадзе, пры неабходнасці мог звярнуцца па аказанне якаснай медыцынскай дапамогі і атрымаць яе на самым высокім узроўні, незалежна ад месца свайго пражывання.

— Абноўлены ў новай рэдакцыі закон вельмі неабходны і практыкаарыентаваны. Там няма нічога лішняга — усё прадугледжана, каб урачу было зручна працаваць і пацыент атрымаў неабходную дапамогу, — рэзюмаваў старшыня профільнай камісіі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# ГАРАНТЫІ ПАШЫРАЮЦЦА

## шматдзетным матулям, бацькам дзяцей-інвалідаў і іншым уразлівым катэгорыям

**З 9 да 12 гадоў павялічыцца лімітавы перыяд па доглядзе за дзецьмі, які будзе залічвацца жанчынам у агульны стаж для налічэння пенсій. Акрамя таго, зніжаецца працягласць страхавога стажу для грамадзян з працяглай інваліднасцю I — II груп, і тых, хто мае няпоўны страхавы стаж. Сенатары разгледзелі на пасяджэнні чацвёртай сесіі законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях пенсійнага забеспячэння і дзяржаўнага сацыяльнага страхавання».**



Фота БелТА.

Як растлумачыла членам Савета Рэспублікі **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ,** праект закона падрыхтаваны з мэтай прывядзення нормаў законаў «Аб пенсійным забеспячэнні» і «Аб прафесійным пенсійным страхаванні» ў адпаведнасць з палажэннямі двух указаў кіраўніка дзяржавы, прынятых у 2020 годзе (ад 17 студзеня № 15 і ад 18 мая № 171). Акрамя таго, у праекце ўтрымліваюцца прапановы па карэкціроўцы закона аб індывідуальным персаніфікаваным уліку ў сістэме дзяржаўнага сацыяльнага страхавання.

Міністр расказала, што ў законапраекце прадугледжваюцца дадатковыя пенсійныя гарантыі сацыяльна ўразлівым катэгорыям: матулям з чатырма дзецьмі, інвалідам, бацькам дзяцей-інвалідаў.

— Найбольшую колькасць жанчын — гэта прыкладна 70 тысяч чалавек — закранае тая норма, якая прадугледжвае павелічэнне перыяду, які можа быць уключаны ў агульны стаж у сувязі з доглядам за дзецьмі ва ўзросце да трох гадоў. На сённяшні момант максімальны перыяд складае дзевяць гадоў, — звярнула ўвагу міністр. — З 1 студзеня 2021 года жанчынам, якія маюць чатырох і больш дзяцей, у агульны стаж можа быць залічаны дадаткова яшчэ тры гады, калі яны не працавалі і даглядалі малых, іншымі словамі, усяго — 12 гадоў. Гэта норма будзе распаўсюджвацца не толькі на тых жанчын, якія ўпершыню звяртаюцца дзеля прызначэння пенсіі, але і тых, каму пенсію ўжо прызначылі.

Акрамя таго, для матуль з чатырма дзецьмі зніжаецца страхавы стаж да дзесяці гадоў для прызначэння пенсіі па ўзросце. Патрабаванні да агульнага стажу застаюцца нязменныя — 20 гадоў, у яго будзе ўключаца догляд за дзецьмі ва ўзросце да трох гадоў.

З'явіліся і палёгкі для інвалідаў адносна працоўнай пенсіі па ўзросце. Пагадзіцеся, пры наяўнасці сур'ёзных доўгачасовых праблем са здароўем адпрацаваць 18—20 гадоў не заўсёды магчыма. Разумеюць гэта і заканадаўцы.

— Таму асобам, якія знаходзіліся на інваліднасці I ці II груп не менш за дзесяць гадоў, патрэбны страхавы стаж па ўзросце зніжаецца на шэсць месяцаў за кожны поўны год знаходжання на інваліднасці. Калі знаходжанне на інваліднасці складае 21 год і болей, для працоўнай пенсіі па ўзросце будзе дастаткова мець пяць гадоў страхавога стажу, — растлумачыла Ірына Касцевіч.

Між іншым, змены закранаюць і пенсіі бацькоў дзяцей-інвалідаў. Часта, каб аказваць дапамогу свайму цяжка хвораму дзіцяці і далей ужо даросламу інваліду з дзяцінства, мама вымушана пакінуць работу на доўгія гады. Канешне, у матуль дзяцей-інвалідаў ёсць права на датэрміновае прызначэнне пенсіі па ўзросце пры нецігадовым страхавым стажы. Аднак не заўсёды жанчына можа выпрацаваць нават такі стаж. Для такіх бацькоў, якія не менш за 20 гадоў ажыццяўлялі догляд за дзецьмі-інвалідамі ва ўзросце да 18 гадоў з трэцяй-чацвёртай ступенямі страты здароўя і прызнаны інвалідамі з дзяцінства I групы, павышаны памер сацыяльнай пенсіі да 130 % бюджэту пражытковага мінімуму пенсіянера. Ва ўмовах лістапада 2020 года гэта 254 рублі.

Што датычыцца змен у адносінах індывідуальнага персаніфікаванага ўліку ў сістэме дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, яны закранаюць змест індывідуальнага асабовага рахунку чалавека. Міністр адзначыла, што ён будзе дапаўняцца інфармацыяй аб прычыне налічэння заробку ў памеры ніжэй за мінімальны, таксама з'явіцца інфармацыя аб працоўнай дзейнасці чалавека — форме працоўных адносін, найменнях яго пасад і прафесій.

— Гэта аснова для пераходу на электронныя працоўныя кніжкі, — растлумачыла Ірына Касцевіч.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ** нагадаў калегам-сенатарам, што сёння ў краіне пражывае больш за 2,5 мільёна пенсіянераў.

— Дзяржава аддаецца вялікая ўвага пытанням эфектыўнага развіцця пенсійнай сістэмы, яе фінансавай устойлівасці з улікам зменлівых эканамічных і дэмаграфічных умоў, — падкрэсліў ён і звярнуў увагу, што законапраектам прадугледжваецца дадатковая сацыяльная абарона асобных катэгорый грамадзян — шматдзетным сем'ям, людзей з інваліднасцю, а таксама сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю. Акрамя таго, зніжаецца працягласць страхавога стажу для асобнай катэгорыі грамадзян.

І гэта важна, бо абраны дзяржавай кірунак у бок сваёй сацыяльнай арыентаванасці натуральна пацвярджае разгляд такога запатрабаванага сёння ў грамадстве законапраекта. Ці трэба казаць, што сенатары ўхвалілі яго аднагалосна?!

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

У ТЭМУ

# СЛУЖБА Ў ВОЙСКУ БУДЗЕ ЎКЛЮЧАЦЦА Ў СТАЖ

## Праўда, гаворка ідзе аб рабоце ў бюджэтных арганізацыях

**Такі крок, упэўнены заканадаўцы, паўплывае на павышэнне прэстыжу вайсковай службы, у тым ліку тэрміновай і альтэрнатыўнай.**

Гэтую навацыю агучыла **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ,** прадстаўляючы да разгляду членам Савета Рэспублікі законапраект «Аб зменах законаў».

Яна звярнула ўвагу, што пасля сканчэння тэрміну знаходжання на вайсковай альтэрнатыўнай службе з маладым чалавекам захоўваецца на працягу трох месяцаў права працаўладкавацца да таго ж наймальніка на пасаду служачага ці па прафесіі рабочага, раўназначную той, што ён займаў да прызыву ў войска.

— Пры гэтым за асобамі з ліку маладых спецыялістаў, маладых рабочых захоўваецца права на займанне папярэдняй пасады служачага ці па прафесіі рабочага, — падкрэсліла міністр.

ГРОШЫ

# Хто з бюджэтнікаў зарабляе больш?

**На мінулай сесіі Савета Рэспублікі сенатары разгледзелі законапраект «Аб змяненні законаў», які скіраваны на прывядзенне васьмі законаў у адпаведнасць з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18 студзеня 2019 года № 27 «Аб аплаце працы работнікаў бюджэтных арганізацый».**

Нагадаем, што са студзеня 2020 года аплата працы работнікаў бюджэтных арганізацый выконваецца на аснове тарыфнай сістэмы, уведзенай гэтым указам.

— Колькасць надбавак сур'ёзна зменшылася, сама сістэма, бясспрэчна, стала прасцейшая, але ідэальнага няма нічога, — перакана **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ.**

Адказваючы на пытанне, ці не паўплывала гэта на памяншэнне памеру заробкаў бюджэтнікаў, кіраўнік ведамства звярнула ўвагу, што за 9 месяцаў бягучага года тэмп росту ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года склаў 119,8 %: па галіне аховы здароўя — амаль на 30 %, адукацыі — на 15 %.

— Сёння заробкі ў бюджэтных арганізацыях апярэджваюць тэмп росту заробкаў па краіне, — удакладніла міністр у размове з карэспандэнтам «МС». — Сярэдняя заработная плата за верасень ва ўрача складала 1822 рублі, сярэдняга медперсаналу — 1117 рублёў, настаўніка — 1022 рублі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# «КУЛЬТУРА» ПРЫСВЯЧАЕ ЭФІРНУЮ АКЦЫЮ ПАМЯЦІ КАРАТКЕВІЧА

**Да юбілею класіка айчыннай літаратуры Уладзіміра Караткевіча на канале «Культура» Беларускага радыё праходзіць тэматычная эфірная акцыя «Прысвячаецца Уладзіміру Караткевічу», падчас якой будуць абвешчаны вынікі інтэрактыўнага конкурсу чытальнікаў «Быў. Ёсць. Буду».**

Ушаноўваць 90-годдзе з дня нараджэння выбітнага літаратара спецыялізаваная радыёхваля Белтэлерадыёкампаніі пачала яшчэ ўвесну, калі абвясціла правядзенне конкурсу чытальнікаў «Быў. Ёсць. Буду». Нагадаем, да ўдзелу запрашаліся аматары і прафесіяналы, якія даслалі аўтарскія прачытанні паэзіі Уладзіміра Сямёнавіча. Імёны пераможцаў у розных намінацыях і ўзроставых групах творчага спаборніцтва абвясцілі ў дзень нараджэння Караткевіча ў праграме «Сустрэча пад вечар». У намінацыі «Аматары» першыя месцы занялі Павел Багаслоўскі, Іван Бойкаў, Ганна Сабела і Вераніка Марозаў. Лепшым у намінацыі «Прафесіяналы» прызнаны Валерый Шушкевіч. А вось па выніках Інтэрнэт-галасавання першае месца прысуджана Івану Гаўрыліну. Гэтую інфармацыю можна знайсці і на сайце радыёканала www.radiokultura.by.

Дарэчы, з кастрычніка ў «Радыёбібліятэцы» гучыць твор «Дзікае паляванне караля Стаха», а праект «Літаратурная анталогія» прапануе слухачам пачуць урыўкі з рамана «Чорны замак Альшанскі» ў прачытанні акцёра Алега Вінярскага. Акрамя таго, у рамках праекта для дзяцей і падлеткаў «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» па панядзелках і аўторках гучаць фрагменты рамана «Каласы пад сярпом тваім».

Сёння, 27 лістапда, у 15.00 і 21.30 праект «Культурныя скрыжаванні» прапануе аўтарскае прачытанне твора «Каласы пад сярпом тваім». У выхадныя, 28 і 29 лістапада, у 9.45 і 16.00 прагучаць вершы Уладзіміра Караткевіча ў выкананні народнай артысткі Беларусі Марыі Захарэвіч.

— Вядома, гэта далёка не ўвесь пералік перадач, у якіх мы згадаем творчасць Уладзіміра Сямёнавіча, — расказвае дырэктар канала «Культура» Уладзімір Трапянок. — Слова Караткевіча не страчвае актуальнасці, таму яно павінна займаць годнае эфірнае месца. Даследчыкі пісалі, што Караткевіч належыць да першапраходцаў, якіх усё захапляе сваёй веліччу, незвычайнасцю, што тыя захапленне, непасрэднасць паэтычнага ўражання ён імкнецца перадаць чытачу. У нашым выпадку пісьменніцкі дар Уладзіміра Сямёнавіча праз аўтарскае ці акцёрскае выкананне адразу трапляе ў свядомасць слухача, што ў выніку прымушае яшчэ больш ганарыцца нашай гісторыяй і адметнай культурай.

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 108

**Наступную цікавую задачу склаў больш за сто гадоў таму Ю. Юдзілевіч *(гл. дыяграму).***



**Белыя:** Kph6, Фd2, Cg8, Kc4, Ke4, пп. c3, g2, h3 (8).

**Чорныя:** Kpf5, Фb6, Cb7, пп. f4, f6 (5).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Задача Аляксандра Варыцкага *(Брэст)* адзначана ў міжнародным конкурсе «Гравюра-2020» першым ганаровым водгукам. Прааналізуем яе змест.

**Белыя:** Kpe3, Ca7, Cd5, Ke1 (4).

**Чорныя:** Kph1, Лh2, Cf1, пп. e2, g2, h3 (6).

Мат за 8 хадоў.

У гэтай пазіцыі рашае 1. Ca8! Kpg1 2. Kpd2+ Kph1 3. Kc2! e1Ф+ 4. Kp:e1 Ce2 5. Ke3 Cd3 6. Cf3 Ce4 7. Kf1 C:f3 8. Kg3x

Калі пераставіць чорнага Kph1 на g1, рашэнне будзе іншае: 1. Cb8! Kph1 2. Cg3 Kpg1 3. Kf3+ Kph1 4. Kd2! Kpg1 5. Ce1! Kph1 6. Ke4 Kpg1 7. Kf2+ Kph1 8. Kg3x (4... e1Ф+ 5. C:e1 Cc4 6. Ke4 C:d5 7. Kg3+ Kpg1 8. Cf2x, 5... Cd3 6. Cf2 Cc4 7. Ke4 g1Ф 8. Kg3x).

* * *

Пазнаёмімся яшчэ з дзвюма партыямі нядаўняга чэмпіянату Беларусі.

Вячаслаў Зарубіцкі — Максім Царук. 1. Kf3 Kf6 2. c4 e6 3. b3 b6 4. g3 Cb7 5. Cg2 Ce7 6. Cb2 0-0 7. 0-0 d5 8. e3 c5 9. Kc3 dc 10. bc Kc6 11. Фe2 Лc8 12. Лfd1 Фc7 13. Лac1 Лfd8 14. d4 Ca6 15. Ke5 K:e5 16. de Kd7 17. f4 Cb7 18. Ke4 Cc6 19. Фg4 g6 20. Kf6+ K:f6 21. ef 22. Ce5 Фb7 23. Фe2 a6 24. Лb1 b5 25. C:c6 Ф:c6 26. Kpf2 b4 27. Л:d8 Л:d8 28. Лd1 Л:d1 29. Ф:d1 Фe4 30. Cd6 C:d6 31. Ф:d6 h5 32. Фd8+ Kph7 33. Фd7 Kph6 34. Ф:f7 Фc2+ 35. Kpf3 Фd1+ 36. Kpe4 Фc2+ 37. Kpe5 Фf5+ 38. Kpd6 h4 39. g4 Фd3+ 40. Kpe7, 1:0.

Яна Ільючык — Ксенія Норман. 1. e4 d5 2. ed Kf6 3. d4 Cg4 4. f3 Cf5 5. g4 Cg6 6. c4 e6 7. Kc3 Ce7 8. h4 h6 9. de Kc6 10. Ce3 Kb4 11. Лc1 c5 12. ef+ Kp:f7 13. d5 Лe8 14. h5 Ch7 15. Kh3 Cd6 16. Kpd2 Л:e3 17. Kp:e3 Фe7+ 18. Kpd2 Лe8 19. Фe2 Фc7 20. Фg2 Cf4+ 21. Kpd1 Фe5 22. Cd3 K:d3 23. K:f4 Ф:f4 24. Лc2 Фd4 25. Kb5 Kf2+ 26. Kpc1 Фe3+ 27. Лd2 Фe1+ 28. Лd1 Kd3+, 0:1.

* * *

У Брэсце прайшоў традыцыйны фестываль «Чорная пешка». У бліцтурніры прызавую тройку склалі Сяргей Жыгалка, Андрэй Малюш і Аляксей Чэрапаў, а першы жаночы прыз заваявала Аляксандра Тарасенка. У турніры па хуткіх шахматах прызёрамі сталі Аляксандр Алішэвіч, Аляксандра Тарасенка і Уладзіслаў Каташук. У турніры па рашэнні кампазіцый першыя тры месцы занялі адпаведна Уладзіслаў Каташук, Аляксандр Варыцкі і Іван Кузміцкі.

У Магілёве адбылася рэспубліканская спартакіяда дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ. Прызавую тройку склалі Магілёўская абласная СДЮШАР, Мінская СДЮШАР і Аршанская СДЮШАР № 2.

На сайце chess.com у бліцтурніры (699 удзельнікаў) Кірыл Ступак заняў 14-е месца, у другім (617 гульцоў) Уладзіслаў Кавалёў на 12-м месцы, Сяргей Жыгалка — на 30-м, Дзяніс Лазавік — на 32-м, а яшчэ ў адным (702 удзельнікі) Сяргей Жыгалка фінішаваў дзявяты, Дзяніс Лазавік — дзевятнаццаты. У Мемарыяле Міхаіла Таля, які таксама праходзіў анлайн, беларускія гросмайстры Кірыл Ступак і Аляксей Аляксандраў заваявалі адпаведна другі і трэці прызы.

* * *

*Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Ke3! Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Дзяніс Лазюта, Ігар Ананіч, Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук.*

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Дзіцячае «Еўрабачанне-2020»: у чаканні старту



**Сустрэча ўдзельнікаў міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне-2020» пройдзе ў 18-ы раз. Аднак сёлета, з вядомых усім прычын, у анлайн-фармаце.**

Пасля леташняй перамогі прадстаўніка Польшчы ў песенным спаборніцтве было зразумела, што наступны конкурс зноў будуць прымаць у гэтай краіне, але ж... пандэмія, закрытыя граніцы, таму юныя артысты прадэманструюць свае вакальныя і артыстычныя здольнасці на адлегласці. У нядзелю ўдзельнікі з 12 краін — Беларусі, Германіі, Грузіі, Іспаніі, Казахстана, Мальты, Нідэрландаў, Расіі, Польшчы, Сербіі, Украіны і Францыі — прадставяць на суд журы і гледачоў свае кампазіцыі і сцэнічныя нумары. Іх запісвалі спецыялісты нацыянальных тэлевяшчальнікаў з улікам адзіных рэкамендацый і правіл Еўрапейскага вяшчальнага саюза. Выступленне нашай Арыны Пехцеравай, згодна з жараб'ёўкай, што адбылася напярэдадні, будзе паказана ў прамым эфіры пад нумарам 5. Юная артыстка з Магілёва выступіць з кампазіцыяй «Прышэльцы». Увогуле ў творчай біяграфіі юнай спявачкі ўжо некалькі дзясяткаў Гран-пры разнастайных міжнародных конкурсаў, удзел у шоу «Голас» і шмат іншых дасягненняў. Пра тое, што трэба ніколі не здавацца, і яе конкурсная песня. Кампазіцыю запісалі вясной, калі ва ўсім свеце якраз пачала бушаваць пандэмія, іншымі словамі, ідэю падказала само жыццё. Потым сама канкурсантка адзначала: «Сэнс песні просты: свет спыніўся, граніцы закрылі, людзі больш не могуць прыязджаць адзін да аднаго ў госці... Але я веру, што мы, дзеці, зможам выратаваць свет і зрабіць яго лепшым!» Сцэнічны нумар запісвалі ў студыі «600 метраў». Арыгінальная версія песні прагучыць на дзвюх мовах — рускай і англійскай. Пачуем таксама і беларускамоўны варыянт кампазіцыі, які прапанаваў зрабіць аўтар песні Данііл Забела. Словы з тэксту песні зможам убачыць нават на адзенні канкурсанткі.

...Вядучымі сёлетняга конкурсу будуць Іда Навакоўска, Рафаэль Бжазоўскі і Малгажата Тамашэўска. Дарэчы, Іда была сярод вядучых мінулага года, і цяпер яна стане першай, хто за гісторыю дзіцячага «Еўрабачання» двойчы пабывае ў такой ролі. Што датычыцца фармату, то XVIII дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне-2020» будзе праходзіць у прамым эфіры з Варшавы, дзе збяруцца вядучыя і каманды. Інтэрвальныя нумары таксама будуць выконвацца ў прамым эфіры з Польшчы. З мэтай абараніць здароўе артыстаў конкурсныя песні будуць выконвацца ў студыі краін-удзельніц. Творчае спаборніцтва гэтага года пройдзе са слоганам «Move the world!», што ў перакладзе значыць «Рухай свет!». Гэты заклік знайшоў адбітак на лагатыпе ў выглядзе планеты, расфарбаванай у розныя колеры. У цэлым сэнс дэвізу зводзіцца да таго, што людзі кожны дзень рухаюць свет, выконваючы свае абавязкі.

Па рашэнні Еўрапейскага вяшчальнага саюза, у сувязі са складанай эпідэміялагічнай сітуацыяй у свеце, камунікацыя канкурсантаў са шматмільённай публікай праекта пройдзе ў фармаце жывых тэлемастоў — для Арыны Пехцеравай і яе творчай каманды ў сценах Белтэлерадыёкампаніі будзе арганізаваны тэматычны «Green room» у адзінай для ўсіх краін-удзельніц стылістыцы. Найлепшую песню дзіцячага «Еўрабачання-2020» будуць выбіраць як тэлегледачы, так і прадстаўнікі Нацыянальнага журы ад кожнай краіны, прычым пры вызначэнні пераможцы галасы гледачоў і прафесіяналаў улічаць у суадносінах 50/50. Варта адзначыць, што анлайн-галасаванне гледачоў за найлепшую кампазіцыю конкурсу адкрываецца на афіцыйным сайце праекта junioreurovision.tv ужо сёння, 27 лістапада, і працягнецца аж да старту фінальнага шоу ў нядзелю. Потым у дзень конкурсу пасля ўсіх выступленняў удзельнікаў аўдыторыя будзе мець магчымасць аддаць свае галасы яшчэ за траіх упадабаных удзельнікаў на працягу 15 хвілін. Нагадаем таксама, што правілы дадзенага спаборніцтва дапускаюць магчымасць галасаваць за прадстаўніка сваёй краіны, а гэта значыць, што падтрымаць выступленне Арыны Пехцеравай можа кожны беларус.

Убачыць прамую трансляцыю песеннага спаборніцтва беларускія гледачы змогуць на тэлеканалах «Беларусь 1», на спадарожнікавым «Беларусь 24», а таксама на сайце Белтэлерадыёкампаніі www.tvr.by 29 лістапада ў 19.00.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота дадзена Белтэлерадыёкампаніяй.**


## «Звязда»: цёплыя словы, цёплыя рэчы»



Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на I квартал або I паўгоддзе 2021 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 студзеня 2021 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.

Сярод падпісчыкаў 15 студзеня 2021 года будуць разыграны 7 жаночых камізэлек і суперпрыз — маслены радыятар General Climate. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 25 студзеня 2021 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 сакавіка 2021 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або I паўгоддзе 2021 года і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Звязда»: цёплыя словы, цёплыя рэчы» чытайце ў нумары 230 газеты «Звязда» ад 25 лістапада.

**Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 01.12.2020 да 31.03.2021 года.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3885 ад 11.11.2020 года, выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I паўгоддзе 2021 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

____________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________
*(аддзяленне сувязі)*

____________________ на I квартал або I паўгоддзе 2021 года

Хатні адрас і тэлефон *(абавязкова)* [ ] *(індэкс)* ____________________

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

# аўторак, 1 снежня ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** Зона Х. Крымінальная хроніка (16+).
**9.10, 21.45 Серыял «След» (16+).**
**10.50** «Скажынемаўчы».
**11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Меладрама «Халодныя берагі». Заключныя серыі (16+).**
**14.00** «Здоража здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.45, 15.25 Меладрама «Прыгонная» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 23.55** «Зона Х». Крымінальная навіны (16+).
**21.00** Панарама.
**23.40** Сфера інтарэсаў.
**0.20** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 16.25** Тэлебарометр.
**9.05** «Сямейныя гісторыі» (16+).
**10.15, 22.35** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.10, 18.25 Дэтэктыў «Унутры» (16+).**
**13.05** «Свет навыварат. Бразілія» (16+).
**14.00** «Да пабачэння» (16+).
**14.50, 23.40 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**16.30 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
**17.20** «Панаехалі» (16+).
**20.15 Серыял «Сляпая» (16+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.25** «Трэці лішні» (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Квас на мясе або грыбах з ільняным насеннем.
**8.05, 12.00, 20.20, 23.45** Навіны культуры.
**8.25, 17.55 «Народжаная зоркай». Маст. фільм (12+).**
**10.00** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**10.25, 16.20 «1943». Маст. фільм (12+).**
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.15** «Лідары пра Лідара». Дак. фільм.
**13.55, 21.40 «Вяртанне «Святога Лукі». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**15.30** «Камертон». Акцёр, рэжысёр, прадзюсар Уладзімір Янкоўскі.
**15.55** «Пётр Шумаў. Чорна-белы лёс». Дак. фільм з цыкла «Зваротны адлік» (12+).
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.00** «Суразмоўцы». Госця — пісьменніца, журналіст Інеса Плескачэўская.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05** «Апошні дзень». Эдуард Хіль (12+).
**23.15** «Рэвалюцыя 1917. Эпоха вялікіх перамен». Дак. фільм «Апошнія дні Раманавых» (16+).

## Беларусь 5

**7.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**7.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі.
**9.55** На мяжы фолу. Футбольны агляд.
**11.05** Вось гэта спорт!
**11.20** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. БЧ (Гомель) — ВРЗ (Гомель).
**13.20** Біятлон. Кубак свету.
**15.25** Піт-стоп.
**15.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**16.25** Фігурнае катанне. Гран-пры.
**18.20** Спорт-кадр.
**18.50** Хакей. КХЛ. «Нафтахімік» (Ніжнекамск) — «Дынама-Мінск». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Шахцёр» (Украіна) — «Рэал» (Іспанія). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**22.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Анлайн гульнявога дня. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**0.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Дзённік гульнявога дня.

## АНТ

**6.00, 7.15, 8.15** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.05** Наша навіны.
**9.15** «Тэорыя змовы» (16+).
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.15, 13.15, 22.15 Серыял «Мая любімая свякроў» (12+).**
**14.30** «Давай пажэнімся!» (16+)
**15.25, 16.20, 0.15** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**16.45** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**19.05** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10 Серыял «Доктар Праабражэнскі» (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 23.55** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40, 21.20, 0.45** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.05** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.35, 20.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.35, 16.50 «Уладзімірская, 15». Серыял (16+).**
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Міншчына».
**22.00** «Скардзіцца дазваляецца».

## МІР

**5.00, 0.15 Серыял «Дайшнікі» [СЦ] (16+).**
**8.20, 10.10 Серыял «Смерць шпіёнам. Утоены вораг». 1—4-я серыі [СЦ] (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 17.15** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Сусветнае пагадненне» (16+).
**18.15, 19.25 Серыял «Чужы раён» (16+).**
**21.40** «Гульня ў кіно» (12+).
**22.25** «Назад у будучыню» (12+).
**23.25** «Сусветныя гульні розуму» (12+).

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Вesткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35 Серыял «Вой, ма-мачкі!» (12+)**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40 Серыял «Марозава» (12+).**
**17.15** «60 хвілін».
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Таямніцы следства-19» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.20, 16.20, 19.35, 22.20, 23.45** Сёння. Галоўнае.
**6.10** Формы жыцця. Лясныя гісторыі (6+).
**6.25** Беларусы (6+).
**7.15** «Здароўе» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35** Нашы (12+).
**8.55** «Навукаманія» (6+).
**9.35, 22.25** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**11.10, 21.20 Драма «Чужы сярод сваіх» (16+).**
**12.10, 13.45 Баявік «Марскія д'ябла. Паўночныя рубяжы» (16+).**
**13.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.50** Пракурорская праверка (16+).
**16.25** Гісторыі выратавання (12+).
**16.55** «ДНК» (16+).
**18.10, 19.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**22.40 Серыял «Груз» (16+).**
**0.00** «Справа ўрачоў» (16+).

## 8 канал

**7.00, 15.55, 18.25, 21.05, 1.15** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 16.05** «Мультпарад». «Скубі Ду» (6+).
**7.30, 16.00, 20.50** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Звышнатуральнае» (12+).**
**9.00, 19.20 Серыял «Мар'ін гай» (16+).**
**9.45** Дак. фільм «Прамудрасці ляснога жыцця» (12+).
**10.00** М/ф «Зверапоіс» (0+).
**11.50, 16.50 Серыял «Непрыдуманая гісторыя» (16+).**
**13.20 Баявік «Доктар Ноу» (16+).**
**15.10, 18.30 Серыял «Скрозь снег» (16+).**
**16.30** «Дзеці пра ежу».
**20.55** «Вечарніца» (6+).
**21.10 Драма «Прыкуп» (18+).**
**0.05 Трылер «Берлінскі сіндром» (18+).**





# субота, 5 снежня ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.35** «Раніца з гумарам» (16+).
**9.25** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**10.00** «Проста кухня» (16+).
**11.00** «Дзеткі-продкі» (12+).
**12.05** «Пары на Канары» (16+).
**13.05** «Селапаляцела» (16+).
**14.25, 21.00, 3.10** «Уральскія пельмені» (16+).
**15.20** Фэнтэзі «Шавец» (16+).
**17.15** Фантастыка «Філасафы: урокі выжывання» (16+).
**19.15** Поўнаметражны анімацыйны фільм «Рэальная вавёрка-2» (6+).
**22.30** Драма «Сем жыццяў» (12+).
**0.50** Серыял «Каханне ў нерабочыя тыдні» (16+).
**4.45** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Біблейскі сюжэт».
**7.05** «Воўк і сямёра казлянят». «Дзве казкі». «Кентэрвільскі прывід». «Мяжа». «Пеця і Чырвоная Шапачка». М/ф.
**8.30** «А параходы гудуць і сыходзяць...» Маст. фільм.
**9.40** «Святыні Крамля». Дак. серыял [СЦ].
**10.10, 0.00** «Выпрабавальны тэрмін». Маст. фільм [СЦ].
**11.45, 1.40** «Зімовая казка для звяроў». Дак. фільм [СЦ].
**12.40** XXI Міжнародны тэлевізійны конкурс юных музыкаў «Шчаўкунок».
**14.45** Да 175-годдзя Рускага геаграфічнага таварыства. «Ехаў грэка... Падарожжа па сапраўднай Расіі». Дак. серыял [СЦ].
**15.30** Прэм'ера. Вялікі балет.
**17.40** «Энцыклапедыя загадак». Дак. серыял. «Таямніца нябеснага выбуху» [СЦ].
**18.10** Дзень пачатку контрнаступлення савецкіх войскаў пад Масквой. «Бітва за Маскву» [СЦ].
**19.00** Больш, чым каханне. Ігар і Ірына Маісеевы [СЦ].
**19.45** Юбілей Ніны Русланавай. «Не страляйце ў белых лебедзяў». Маст. фільм [СЦ].
**22.00** «Агора». Ток-шоу.
**23.00** «Гісторыя XX стагоддзя». Мастацка-дакументальны фільм.
**2.35** «Арганаўты». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Кінапанарама». 1991 год (12+).
**6.55, 8.10, 9.45, 11.00, 12.00, 15.45, 17.00, 18.00, 18.55, 20.15, 23.45, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.10, 1.10** Маст. фільм «Сёння і заўтра» (16+).
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 4.00** «Народжаны ў СССР».
**11.20, 17.20** Дак. фільм «Куміры. Назад у СССР. 2012 год (16+).
**12.10** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1977-ы. 1-я частка. 2009 год (16+).
**13.00** Дак. фільм «Дзеці XX з'езда». Першая серыя «Выток». 1989 год (16+).
**13.50** Маст. фільм «Стаянка цягніка — дзве хвіліны» (16+).
**16.00** «Колба часу» (12+).
**18.15** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1977-ы. 2-я частка. 2009 год (16+).
**19.10** Фільм-канцэрт «Маскоўскі тэатр Сатыры на экране». 1970 год (12+).
**21.00** «Быў час». 2008 год (16+).
**22.00** Фільм-спектакль «Сваякі». 1981 год (16+).
**0.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2005 год (12+).
**2.15** «Ранішняя пошта». Мода. Мода. Мода. 1988 год (12+).
**2.50** М/ф «Трам! Добры дзень!» 1980 год (0+).

## EuroSport 1

**1.30, 5.00, 9.00, 21.50** Снукер. UK Championship (6+).
**2.35, 8.00, 18.30** Скачкі на лыжах з трампліна (12+).
**3.30, 12.15** Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
**7.00, 16.30** Біятлон. Кубак свету (6+).
**10.30, 20.15** Санны спорт. Кубак свету (12+).

## Кінакамедыя

**1.30** Горка!-2 (16+).
**4.00** Гэты няёмкі момант (16+).
**5.50** Зялёная кніга (16+).
**8.20** Вядзьмарка (18+).
**10.15** Плэйбой пад прыкрыццём (18+).
**12.00** Галівудскія копы (12+).
**14.10** Неверагодныя прыгоды Факіра (16+).
**15.55** Ні хвіліны спакою (12+).
**17.30** Спадарыня пакаёўка (12+).
**19.30** Пікселі (12+).
**21.25** З 13 у 30 (12+).
**23.15** Ананасавы экспрэс: сяджу, палю (18+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.10** «Улегцы» (12+).
**9.40** «М & S» (12+).
**10.15** «Паглядзім» (12+).
**10.50, 22.35** «Перыскоп» (16+).
**11.10** «Вакол свету. Месцы сілы» (16+).
**12.15** «Гучныя справы» (16+).
**13.20, 4.35** «Псіхасаматыка» (12+).
**14.00** «Новы дзень» (16+).
**14.40, 3.10** «Невядомы». Серыял (16+).
**16.30** «Апакаліпсіс» (12+).
**17.35** «Якія вярнуліся» (16+).
**18.40** «Мільён на мару» (16+).
**19.55, 5.30** «Асцярожна, ашуканцы!» (16+)

**20.35** «Выкрадзеныя». Баявік (12+).
**22.55** Фільм дня «Армагедон» (12+).
**1.40** «Грым». Серыял (16+).

## ТБ1000

**5.00** Перамоўшчык (16+).
**7.35** Таленавіты містар Рыплі (16+).
**10.15** Разумніца Уіл Хантынг (16+).
**12.30** Дзюна (12+).
**15.00** Кін (18+).
**16.50** Іншапланетнае ўварванне: бітва за Лос-Анджэлес (16+).
**19.00** Востраў праклятых (16+).
**21.25** Абуджэнне (6+).
**23.35** Планета Ка-Пэкс (12+).
**1.45** Госця (16+).
**3.35** Як прыручыць дракона-2 (6+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Падзямелле ведзьмаў (12+).
**7.00** Карлік Нос (6+).
**8.30** Мамы (12+).
**10.20** Мамы-3 (12+).
**12.00** Няньки (16+).
**13.45** Удачлівы выпадак (12+).
**15.25** Без межаў (12+).
**17.10** Як я стаў рускім (16+).
**19.00** Цвярозы кіроўца (16+).



**20.50** Кухня ў Парыжы (12+).
**22.45** Кухня. Апошняя бітва (12+).
**0.35** Духless (18+).
**2.15** Духless-2 (16+).
**3.55** Ван Гогі (16+).

## National Geographic

**6.25,** Інстынкт выжывання (16+).
**7.10** Панарама 360: разбурэнне аб'ектаў сусветнай спадчыны (16+).
**8.10** Тайвань — востраў рыбы (16+).
**9.45** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
**10.35** НЛА над Еўропай: невядомыя гісторыі (16+).
**12.20** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**14.00** Эпідэміі: ад Эболы да каранавіруса (16+).
**14.50** Паляўнічыя на вірусы (16+).
**15.40** Прарыў: змагары з вірусам (16+).
**16.30** Інстынкт выжывання, Кітай (16+).
**18.10** Лаашань: Кітайская святая гара (16+).
**19.15** Панарама 360. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
**21.00** Выратаваць Нотр-Дам (16+).
**21.50** Адраджэнне Парадайса (16+).
**23.25** Зборнік «Гульняў розуму (16+).
**1.05** Нацыянальныя паркі Амерыкі (16+).
**1.50** Антарктыка (16+).
**3.30** Сведкі катастроф (16+).
**4.20** Асушыць акіян (16+).

## Discovery

**8.00, 11.41, 19.20** Махінатары (12+).
**8.45, 21.02** Як гэта ўладкавана: аўтамабілі мары (12+).
**9.10** Аляска: 100 дзён выжывання (16+).
**10.00** Голыя і напалоханыя (16+).
**12.32, 20.11** Жаночая аўтамайстэрня (12+).
**13.23, 6.28** Стальныя хлопцы: аўкцыён (12+).
**14.14, 7.14** Іржавая імперыя (12+).
**15.05** Багажныя войны (12+).
**21.27** Голыя і напалоханыя (16+).
**23.09** Залатая ліхаманка (16+).
**0.00** Верталётчыкі (12+).
**0.51** Дабітыя тачкі (12+).
**2.33** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**4.10** Як гэта зроблена? (12+)
**4.56** Не спрабуйце паўтарыць (16+).

## Беларусь 1

6.05 Існасць [СЦ].
**6.30, 19.10 Меладрама «Ноты кахання». 1-я і 2-я серыі (16+).**
8.25 Сэнс жыцця (12+).
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.10 «Добрай раніцы, Беларусь!» (12+)
9.55 Здароўе (12+) [СЦ].
10.50 Дача (12+).
**11.30, 12.10 Меладрама «Жонка майго мужа» (16+).**
**13.50 Камедыйны серыял «Часова недаступны» (16+).**
15.10 Краіна.
**15.40 Меладрама «Маці за сына». 1-я і 2-я серыі (12+).**
21.00 Панарама.
**21.40 Меладрама «Ноты кахання». 3-я і 4-я серыі (16+).**
**23.45 Меладрама «Шчасце напалову». 2-я серыя (16+).**
0.55 Дзень спорту.

## Беларусь 2

6.00 «Уключайся. Лепшае за тыдзень» (12+).
8.00, 16.25 Тэлебарометр.
**8.05 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
9.45 Анімацыйны фільм «Чабурашка» (0+).
11.00 «Вежа» (12+).
11.50 Камень, нажніцы, папера (16+).
12.20 «На тыдзень» (16+).
**13.10 Меладрама «Назаўжды мая дзяўчына» (12+).**
15.00 «Паненка-сялянка» (16+).
15.55, 23.45 «Каралі палат». Скетчкам (16+).
16.30 «Арол і рэшка. Марскі сезон» (16+).
17.25 «Чалавек-невідзімка» (16+).
18.25 «Свет навыварат. Бразілія» (16+).
**19.20 Прыгоды «Жалезная воля» (12+).**
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.25 Прыгоды «Першы мсціўца: іншая вайна» (12+).**

## Беларусь 3

7.35 «Сіла веры».
8.00, 14.55 Навіны культуры.
8.20 «Храбрае аленяня». Мультфільм (0+).
**8.40 «Вячэрні лабірынт». Маст. фільм (12+).**
10.00 «Народны майстар». Валянціна Савіцкая (дэкаратыўна-прыкладное мастацтва).
10.25 «Беларуская кухня». Балабешкі.
10.50 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**11.15 «Ганна Герман». Маст. фільм, заключныя серыі (12+).**
15.15 «Навукаманія» (6+).
**15.40 «Будзьце маім мужам». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
17.10 «Сваімі словамі». Тэлевіктарына.
**17.45 «12 крэслаў». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
20.25 «Суразмоўцы». Госць — дырэктар Дома-музея Адама Міцкевіча Мікалай Гайба.
20.40 «Калыханка» (0+).
**21.05 «Чарнаморачка». Маст. фільм (12+).**
22.25 Канцэрт Акадэмічнага хору і сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі.
23.25 «Гукі ў футлярах». Фартэпіяна.

## Беларусь 5

7.00 Азбука спорту.
7.10 Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
7.40 Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Францыя — Чарнагорыя.
9.20 Фрыстайл. Лыжная акрабатыка. Кубак свету.
10.55 Авертайм.
11.25 Спорт-мікс.
11.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
12.05 Вялікі спорт.
12.50 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Шахцёр» (Салігорск).
15.10, 17.05 Біятлон. Кубак свету. Кантыялахці. Гонка праследу.
16.05 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд.
18.35 Футбол. Кубак Беларусі. 1/8 фіналу. БАТЭ (Барысаў) — «Дынама» (Брэст).
(У перапынку — Спорт-цэнтр.)
20.30, 22.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
22.35 Вось гэта спорт!

## АНТ

7.00, 9.00, 16.00 [СЦ], 18.00, 20.00 Нашы навіны.
7.15 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
8.00 Да юбілею Генадзя Хазанава. «Я і тут маўчаць не буду!» (12+)
8.55 «Беларусь. Геаграфія з біяграфіяй» (12+).
**9.15 Фільм «Я думаў, ты будзеш заўсёды» (16+).**
10.55 «Ці бачылі відэа?» (6+)
13.10 «На дачу!» (6+)
14.25 «Хто хоча стаць мільянерам?» (12+)
16.20, 18.20 «Ледніковы перыяд» (6+).
20.45 «Метэагід».
21.05 «Сёння ўвечары» (16+).
**23.00 Фільм «Права на надзею» (16+).**

## СТБ

6.05, 1.50 «Дзіўная справа» (16+).
07.50 «Анфас».
7.10 «Самая карысная праграма» (16+).
9.00 «Таямніцы Беларусі».
10.00 «Мінск і мінчане».
10.30 «Цэнтральны рэгіён».
11.05 Дак. праект (16+).
**12.10, 13.40, 16.40 «Уладзімірская, 15». Серыял (16+).**
13.30, 16.30, 19.30 Навіны «24 гадзіны».
20.30 «СТБ-спорт».
20.40 Дак. спецпраект (16+).
21.35 «Тэрыторыя памылак» (16+).
**22.40 «Навошта табе алібі?» Серыял (16+).**

## МІР

5.00, 4.30 М/ф (0+).
6.45 «Сакрэтныя матэрыялы» (12+).
7.10 «Гульня ў словы» (6+).
8.10 «Усё, як у людзей» (6+).
8.25 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
9.00 «Слабае звяно» (12+).
10.00 Надвор'е ў Міры.
**10.10 Маст. фільм «Вій» [СЦ] (12+).**
**11.45, 16.15, 19.15 Серыял «Пілот міжнародных авіяліній» (16+).**
16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
**3.00 Маст. фільм «Цырк» [СЦ] (0+).**

## РТР—Беларусь

**7.05 Серыял «Вой, ма-мач-кі!» (12+)**
11.00 Весткі.
11.20 «Таямніцы Беларусі» (16+).
12.25 «Гумар! Гумар! Гумар!!!» (16+)
13.25 «Доктар Мяснікоў» (12+).
**14.30 Меладрама «Ты будзеш маёй» (12+).**
**16.15 Меладрама «Вера» (16+).**
19.45 «Плюс-мінус»
20.00 Весткі ў суботу.
20.45 «Прывітанне, Андрэй!» (12+)
**22.30 Меладрама «Незабытая» (12+).**

## НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.05 Сёння. Галоўнае.
6.10 За гранню (16+).
6.25 Беларусы (6+).
7.20 «50 рэцэптаў першага» (12+).
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.20 «НЗ.by: Час вынікаў».
8.45 «Гарады Беларусі» (6+).
9.20 «Урачэбныя таямніцы плюс» (12+).
10.20 Галоўная дарога (16+).
11.00 «Жывая ежа» (12+).
11.55 Кватэрнае пытанне. (0+).
12.55 Гісторыі выратавання (12+).
13.20 «Паедзем, паядзім!» (0+)
**14.05 Дэтэктыў «Пацалунак Сакрата». Фільм «Смяротны водар» (16+).**
16.20 «Сакрэт на мільён». Таццяна Судзец (16+).
18.10 «Следства вялі...» (16+)
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
20.05 «Суперстар! Вяртанне» (16+).
22.30 «Заснавана на рэальных падзеях» (16+).
0.05 «Крутая Гісторыя» (12+).

## 8 канал

7.00, 18.55, 21.10, 1.30 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05, 16.35 «Мультпарад» (12+).
8.45 «Прыколы 13-й школы» (6+).
**8.50 Меладрама «Сісі» (16+).**
10.35 «Дзеці пра ежу» (12+).
**11.00 Меладрама «Сісі. Маладая імператрыца» (16+).**
**12.45 Меладрама «Цяжкія гады імператрыцы» (16+).**
14.40 «Надвор'е».
**14.45 Глядзім усёй сям'ёй. «Два браты» (12+).**
**17.00 Прыгоды «Тога» (12+).**
**19.00 Камедыя «Ноч у музеі» (12+).**
20.55 «Вечарніца» (6+).
21.00 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
**21.15 Драма «Адмірал» (16+).**
**23.20 Меладрама «Дальняя дарога» (16+).**



## ВТБ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00, 14.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.35 Баявік «Солт». (16+).
12.30, 23.45 «КВЗ. Панашаму» (16+).
12.55 «Руса турыста» (16+).
15.50 Серыял «Нефармат» (16+).
16.55 «Уральскія пельмені» (16+).
18.00 Серыял «Каханне ў нерабочыя тыдні» (16+).
19.00, 1.00 Серыял «Вечны водпуск» (16+).
20.30 Серыял «Радкам» (16+).
21.30 Камедыя «Кухня ў Парыжы». (12+).
0.00 Серыял «Каманда Б» (16+).
2.25 Серыял «Татавы дочкі» (12+).
3.40 «Адна за ўсіх» (16+).
4.45 «6 кадраў» (16+).

## Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Масква метрастроеўская.
7.05 «Правілы жыцця».
7.35, 18.35, 0.00 «Гарады, якія заваявалі свет. Амстэрдам, Лондан, Нью-Ёрк». Дак. фільм [СЦ].
8.35 Легенды сусветнага кіно. Людміла Цалікоўская.
9.00, 22.40 «Пётр Першы. Завяшчанне». Серыял. 1-я серыя [СЦ] (16+).
10.15 «Назіральнік».
11.10 XX стагоддзе. «Эльдар Разанаў у коле сяброў».
12.45 «Тры таямніцы адваката Плявака». Дак. фільм.
13.15 Правінцыйныя музеі Расіі. Кімры [СЦ].
13.45 «Гульня ў бісер». «Аляксандр Блок. «Дванаццаць».
14.30 «Адлюстраваны час». Дак. серыял. «Масква. Хронікі рэканструкцыі» [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Кнігі.
15.20 Пятае вымярэнне.
15.50 «Саці. Нясумная класіка...»
16.30 «Шляхецкія грошы. Спадчына і пасаг». Дак. серыял [СЦ].
17.00 «Суботні вечар». «Тры рублі». Кароткаметражныя маст. фільмы.
17.45, 1.55 Снежаньскія вечары. Міхаіл Плятнёў, Роберт Хол і Дзяржаўны квартэт імя А. П. Барадзіна.
19.45 Галоўная роля.
20.05 Урачыстае адкрыццё XXI Міжнароднага тэлевізійнага конкурсу юных музыкаў «Шчаўкунок».
21.55 Прыгожая планета.
22.10 Да юбілею Ніны Молевай. «Калекцыя гісторый». Дак. серыял [СЦ].
0.55 XX стагоддзе. «Будзем знаёмыя. Ансамбль песні і танца пад кіраўніцтвам У. Локцева». «Лета студэнцкае». Дак. фільмы.
2.40 «Першыя ў свеце». Дак. серыял. «Фотастужка Малахоўскага».

## Настальгія

6.00, 16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР» (16+).
7.00 «Вакол смеху». 1981 год (12+).
8.20 «Гумар, які мы страцілі (гумар савецкай эпохі)». 2008 год (12+).
9.00, 15.00, 21.00 «Мінулы час» (12+).
9.45, 13.15, 15.45, 17.00, 19.10, 20.35, 21.45, 23.00, 1.35, 2.45, 5.25 Музычная настальгія (12+).
10.00 Маст. фільм «Дзённы цягнік» (16+).
12.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2005 год (18+).
13.30 «Вакол смеху». Тэма: «Рэтра». 1981 год (12+).
18.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Тэатр Абразцова — брэнд СССР». 2006 год (16+).
19.30 Маст. фільм «Сёння і заўтра». 1-я серыя (16+).
0.00 Маст. фільм «Апёк» (16+).
1.50 Фільм-канцэрт «Міхаіл Жванецкі. Сам-насам з сабой...» 1992 год (12+).
3.00 «Быў час». 2008 год (16+).
4.00 «Пад знакам задыяка. Стралец». 1993 год (16+).

## EuroSport 1

1.30, 5.00, 10.30, 15.10 Снукер. UK Championship (6+).
2.45 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету (12+).
3.30 Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
7.00 Лыжныя гонкі. Кубак свету (6+).
12.30 Лыжнае дваяборʼе. Кубак свету (12+).

## Кінакамедыя

1.00 Ёлкі-2 (12+).
3.00 Паедзем да чартавай бабулі (12+).
5.20 Джэй і Маўклівы Боб наносяць удар у адказ (16+).
7.10 Рыбка па імені Ванда (16+).
09.15 Гэты няёмкі момант (16+).
11.05 Вядзьмарка (18+).
13.00 Галівудскія копы (12+).
15.15 Зялёная кніга (16+).
17.45 Плэйбой пад прыкрыццём (18+).
19.30 Колькі ў цябе? (16+)
21.30 Неверагодныя прыгоды Факіра (16+).
23.10 З 13 у 30 (12+).

## ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.30, 23.40 «Улегцы» (12+).
9.05, 15.30, 4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
10.10, 17.15 «Старац» (16+).
10.50, 18.25, 2.55 «Сляпая» (16+).
12.00, 19.35 «Варажбітка» (16+).
13.10 «Містычныя гісторыі» (12+).
14.15 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
16.35 «Знакі лёсу» (16+).
20.50 «Косці». Серыял (16+).
22.40 «Грым». Серыял (16+).
0.15 «90-я». (16+).
1.05 «Омен». Маст. фільм (16+).
3.50 «Мужчыны...» (16+)

## ТБ1000

5.00, 16.35 Разумніца Уіл Хантынг (16+).
7.30 Перамоўшчык (16+).
10.10 Таленавіты містар Рыплі (16+).
12.40 Дзевяць ярдаў (16+).
14.30 Містар і місіс Сміт (16+).
19.00 Элізіум: рай не на Зямлі (16+).
20.55 Госця (16+).
23.05 Блізкія кантакты трэцяй ступені (6+).
1.30 Код да Вінчы (16+).
3.50 Анёлы і Дэманы (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

6.15 Дамавік (6+).
8.05 Грэцкі арэшак (16+).
9.40 Уцёкі (16+).
11.50 Нерэальнае каханне (12+).
13.20, 19.00 Гетэры маёра Сакалова (16+).
15.15 Крывавая лэдзі Баторы (16+).
17.10 Нянькі (16+).
20.55 Мамы (12+).
22.55 Мамы-3 (12+).
0.40 СуперБабровы (12+).
2.15 СуперБабровы. Народныя мсціўцы (12+).
3.40 Канікулы строгага рэжыму (12+).

## National Geographic

6.00, 5.40 Навуковыя глупствы (16+).
6.25, 13.20, 17.35, 23.30, 1.55 Аўта-SOS (16+).
7.15 Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
8.05, 21.00, 3.25 Ледзяная дарога (16+).
8.55 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
10.40, 15.50, 20.05 Фабрыка ежы (16+).
11.30 Зона будаўніцтва (16+).
12.25, 16.40 Асушыць акіян (16+).
14.10, 1.05 Расследаванні авіякатастроф (16+).
18.25 Крывавыя таямніцы Еўропы (16+).
19.15 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
21.50 Погляд знутры: баявы карабель XXI стагоддзя (16+).
0.25 Ліхтугі за мяжой (16+).
2.40 Інстынкт выжывання (16+).
4.10 Служба выратавання Аляскі (16+).
4.55 Асушыць акіян: глыбокае апусканне (16+).

## Discovery

8.00 Выбуховае шоу (16+).
8.45, 23.09 Багажныя войны (12+).
9.35, 22.18 Круты цюнінг (12+).
10.25, 20.36, 6.05 Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
11.15, 15.30, 21.27, 4.56 Як гэта ўладкавана? (12+)
12.06, 13.48, 17.12, 19.45, 4.10, 7.14 Махінатары (12+).
12.57 Гіганцкія будоўлі (12+).
14.39, 6.28 Жаночая аўтамайстэрня (12+).
16.21, 1.42 Музейныя загадкі (12+).
18.03 Багажныя войны (12+).
18.54 Рэальныя дальнабойшчыкі (16+).
0.00 Узрываючы гісторыю (12+).
0.51 Выжыць разам (12+).
2.33 Палёты ўглыб Аляскі (12+).
3.24 Паляўнічыя на дыназаўраў (12+).
5.42 Паляўнічыя на склады (16+).

## Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 Зона Х. Крымінальная хроніка (16+).
8.50 Слова Мітрапаліта Веньяміна на свята Увядзення ў храм Прасвятой Багародзіцы.
**9.10 Серыял «След» (16+).**
10.45 «Скажынемаўчы».
**11.45, 12.10, 13.05, 18.45, 19.20 Меладрама «Айчым» (16+).**
14.00 «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.45, 15.25 Меладрама «Прыгонная» (16+).**
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Сэнс жыцця (12+).
17.30 Маршрут пабудаваны (12+).
18.15 Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Клуб рэдактараў (16+).
**22.25 Меладрама «Жонка майго мужа». 1-я і 2-я серыі (16+).**
**0.30 Меладрама «Шчасце напалову». 1-я серыя (16+).**
1.40 Дзень спорту.

## Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 16.30 Тэлебарометр.
**9.05 Серыял «Сляпая» (16+).**
10.05 «Супержонка» (16+).
**11.10, 18.20 Дэтэктыў «Унутры» (16+).**
13.05, 17.25 «Арол і рэшка. Марскі сезон» (16+).
14.00, 23.20 «Да пабачэння» (16+).
**14.50 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**
15.40 Нічога сабе ньюз (12+).
15.45 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**16.35 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
20.10 «Чалавек-невідзімка» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
21.20 «Бітва экстрасэнсаў» (16+).

## Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.20 «Беларуская кухня». Карп у вяршках.
8.05, 12.00, 20.20, 0.25 Навіны культуры.
8.25 «Размовы пра духоўнае». Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы.
**8.35, 18.30 «Доўгая дарога да сябе». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
10.00 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**10.25, 16.50 «1943». Маст. фільм. (12+).**
12.50 «Сіла веры».
13.15 «Апошні дзень». Георгій Данелія (12+).
**13.55, 21.05 «Трывожны месяц верасень». Маст. фільм (12+).**
15.30 «Камертон». Артыст Вячаслаў Статкевіч.
15.55 «Спявае Беларусь». Фальклорнае песеннае шоу.
19.55 «Камертон». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Юрый Кавалёў.
20.40 «Калыханка» (0+).
22.40 Класіка сусветнага кіно.
**22.50 «Лета з Монікай». Маст. фільм (16+).**

## Беларусь 5

7.00 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. ЦСКА (Расія) — «Вольфсберг» (Аўстрыя).
8.50, 11.25 Біятлон. Кубак свету.
9.55 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Мяшкоў-Брэст» (Беларусь) — «Элверум» (Нарвегія).
12.30 Хакей. КХЛ. ЦСКА (Масква) — «Дынама-Мінск».
14.20 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Рома» (Італія) — «Янг Бойз» (Швейцарыя).
16.15 Хакей для ўсіх.
16.45 Вось гэта спорт!
17.00 Свет англійскай прэм'ерлігі. Відэачасопіс.
17.35 Спорт-цэнтр.
17.45 Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Расія — Іспанія.
19.20 Авертайм.
19.50 Спорт-цэнтр.
20.00 Фрыстайл. Лыжная акрабатыка. Кубак свету.
21.30 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд.
22.20 Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. «Данія» — «Славенія». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

6.00, 7.15, 8.15 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], 8.00 [СЦ], 9.00 [СЦ], 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], 20.30, 1.05 Нашы навіны.
9.15 «Тэорыя змовы» (16+).
10.00 «Жыць здарова!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.15 «Грамадзянская абарона» (16+).
**13.15, 23.10 Серыял «Мая любімая свякроў. Маскоўскія канікулы» (16+).**
15.05 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Трывожная кнопка» (16+).
16.40, 18.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
18.50 «Поле цудаў» (16+).
20.00 Час.
21.10 «Голас» (12+).

## СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], 7.30 [СЦ], 8.30 [СЦ], 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00, 23.55 «Загадкі чалавецтва» (16+).
10.40 «Як ўладкаваны свет» (16+).
12.20 «Вадзіць па-руску» (16+).
12.40, 21.25, 0.45 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.05 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.40, 16.50 «Навошта табе алібі?» Серыял (16+)**
20.00, 22.55 «СТБ-спорт».
20.05 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Меншчына».
20.30 «Таямніцы Беларусі».
22.10 «Глядзець усім!» (16+)

## МІР

**5.00 Серыял «Даішнікі-2» [СЦ] (16+).**
**6.45, 10.20 Серыял «Чужы раён» (16+).**
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
10.10 «У гасцях у лічбы» (12+).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 16.20 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.20 Маст. фільм «Вій» [СЦ] (12+).**
19.15 «Слабае звяно» (12+).
20.15 «Гульня ў кіно» (12+).
21.00 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**21.40 Маст. фільм «Формула кахання» [СЦ] (0+).**
**23.30 Маст. фільм «Знахар» [СЦ] (16+).**
**1.50 Серыял «Мухтар. Новы след» [СЦ] (16+).**
4.40 М/ф (0+).

## РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35 Серыял «Вой, ма-мачкі!» (12+)**
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
**14.40 Серыял «Марозава» (12+).**
17.15 «60 хвілін».
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05, 23.10 Серыял «Таямніцы следства-19» (12+).**

## НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.00, 8.20, 16.20, 19.35, 22.20, 23.30 Сёння. Галоўнае.
6.10 Формы жыцця. Лясныя гісторыі (6+).
6.25 Беларусы (6+).
7.15 «Здароўе» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35 Сфера інтарэсаў.
8.55 «Навукаманія» (6+).
9.35 «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**11.10 Драма «Чужы сярод сваіх» (16+).**
**12.10, 13.45 Баявік «Марскія д'яблы. Паўночныя рубяжы» (16+).**
13.20 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.50 Пракурорская праверка (16+).
16.25 Гісторыі выратавання (12+).
16.55 «ДНК» (16+).
**18.10, 19.50, 22.45, 23.45 Дэтэктыў «Ліхач» (16+).**
22.20 «НЗ.by: Час вынікаў».
0.10 «Па следзе монстра» (16+).

## 8 канал

7.00, 15.50, 21.10, 1.25 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05, 16.00 «Мультпарад». «Скубі Ду» (6+).
7.30,15.55, 20.50 «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Звышнатуральнае» (12+).**
**8.20, 19.20 Серыял «Мар'інгай» (16+).**
9.50 Дак. фільм «Хто ў тумане гуляе» (12+).
**10.05, 16.30 Серыял «Забыты» (16+).**
**11.50 Дэтэктыў «Банда» (16+).**
**14.50, 18.15 Серыял «Каралеўства» (16+).**
19.15 «Надвор'е».
20.55 «Вечарніца» (6+).
**21.15 Баявік «Няхай прыйдзе выратавальнік» (12+).**
**23.15 Баявік «Генезіс» (12+).**



## ВТБ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00, 14.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.35 Камедыя «Кухня ў Парыжы». (12+).
12.55 «Руса турыста» (16+).
15.50 Серыял «Нефармат» (16+).
16.55 «Уральскія пельмені» (16+).
18.00 Серыял «Каханне ў нерабочыя тыдні» (16+).
19.00, 1.00 Серыял «Вечны водпуск» (16+).
20.30 Серыял «Радкам» (16+).
21.30 Баявік «Кілеры» (12+).
23.25 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
0.00 Серыял «Каманда Б» (16+).
2.25 Серыял «Татавы дочкі» (12+).
3.40 «Адна за ўсіх» (16+).
4.45 «6 кадраў» (16+).

## Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Масква ўсходняя.
7.05, 20.05 «Правілы жыцця».
7.35, 18.35, 0.00 «Гарады, якія заваявалі свет. Амстэрдам, Лондан, Нью-Ёрк». Дак. фільм [СЦ].
8.35 Легенды сусветнага кіно. Мікалай Чаркасаў.
9.00, 22.40 «Пётр Першы. Завяшчанне». Серыял (16+) [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10 ХХ стагоддзе. «Паэзія Аляксандра Твардоўскага».
12.00 Вялікі балет.
14.30, 2.25 «Адлюстраваны час». Дак. серыял [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Кіно.
15.20 «Біблейскі сюжэт».
15.50 «Белая студыя».
16.30 «Шляхецкія грошы. Марнаванні і крэдыты». Дак. серыял [СЦ].
17.00 «Заваёўнікі гор». «Тэрмометр». Караткаметражныя маст. фільмы.
17.45 Снежаньскія вечары. Ісаак Стэрн, Яфім Бронфман.
19.45 Галоўная роля.
20.35 «Добрай ночы, малыя!»
20.50 Абсалютны слых.
21.30 Улада факта. «Гегель: філосаф, які стварыў рэальнасць».
22.10 Да юбілею Ніны Малевай. «Калекцыя гісторый». Дак. серыял [СЦ].
0.55 ХХ стагоддзе. «Эльдар Разанаў у коле сяброў».

## Настальгія

6.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2005 год (18+).
7.15, 9.45, 11.00, 13.10, 14.35, 15.45, 17.00, 21.45, 23.00, 3.45 Музычная настальгія (12+).
7.30 «Вакол смеху». Тэма: «Рэтра». 1981 год (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 0.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Былы час» з Аляксандрам Паліткоўскім. «Тэатр Абразцова — брэнд СССР». 2006 год (16+).
13.30, 19.10 Маст. фільм «Сёння і заўтра». 1-я серыя (16+).
18.00 «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2005 год (12+).
20.15 «Ранішняя пошта». Мода. Мода. Мода. 1988 год (12+).
20.50 М/ф «Трам! Добры дзень!» 1980 год (0+).
1.00 «Вакол смеху». 1981 год (12+).
2.20 «Гумар, які мы страцілі (гумар савецкай эпохі)». 2008 год (12+).
4.00 Маст. фільм «Дзённы цягнік» (16+).

## EuroSport 1

1.30, 5.00, 10.30, 15.00 Снукер. UK Championship (6+).
2.35 Ралі. ERC. Агляд (12+).
3.05 Лыжнае двааборʼе. Кубак свету (12+).
3.30 Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
7.00 Біятлон. Кубак свету (6+).
12.30 Лыжныя гонкі. Кубак свету (6+).

## Кінакамедыя

1.05 Ёлкі 1914 (6+).
3.05 Басанож па горадзе (18+).
4.55 Кахае не кахае (16+).



6.30 Грэцкі арэшак (16+).
8.10 Зноў у школу (16+).
10.05 Рыбка па імені Ванда (16+).
12.05 Суперстар (16+).
13.50 Пікселі (12+).
15.45 Колькі ў цябе? (16+)
17.45 Да чорта на рогі (16+).
19.30 Хатняе відэа (18+).
21.15 Ананасавы экспрэс: сяджу, палю (18+).
23.30 Басанож па горадзе (18+).

## ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.45 «Перыскоп» (16+).
9.10, 15.35, 4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
10.15, 17.20 «Старац» (16+).
10.55, 18.30, 3.30 «Сляпая» (16+).
12.05, 19.40 «Варажбітка» (12+).
13.15 «Містычныя гісторыі» (12+).
14.20 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
16.40, 4.00 «Знакі лёсу» (16+).
20.55 «Косці». Серыял (16+).
22.45 «Грым». Серыял (16+).
23.45 «10 самых» (16+).
0.25 «Лінія абароны» (16+).
1.00 «Зніклая». Маст. фільм (16+).

## ТБ1000

6.00 Маленькі Манхэтэн (12+).
7.40 Блізкія кантакты трэцяй ступені (6+).
10.05 Код да Вінчы (16+).



12.45 Анёлы і Дэманы (16+).
15.15 Элізіум: рай не на Зямлі (16+).
17.10 Як прыручыць дракона-2 (6+).
19.00 Уладар стыхій (6+).
20.45 Кінг Конг (16+).
0.05 Новы Чалавек-павук (12+).
2.30 Новы Чалавек-павук: Высокае напружанне (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Мамы (12+).
7.15 Мамы-3 (12+).
8.50 Карлік Нос (6+).
10.15 СуперБабровы (12+).
12.00 СуперБабровы. Народныя мсціўцы (12+).
13.35 Гетэры маёра Сакалова (16+).
15.40 Дзённік мамы першакласніка (6+).
17.10 Ван Гогі (16+).
19.00, 20.00 Апостал (16+).
21.00 ПіраМММіда (16+).
23.00 Духless (18+).



0.45 Жанчыны супраць мужчын (18+).
2.05 Уцёкі (16+).
4.00 Без межаў (12+).

## National Geographic

6.25, 13.25, 17.35, 22.40, 1.10 Аўта-SOS (16+).
7.15 Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
8.10, 12.35, 16.45 Ледзяная дарога (16+).
9.00, 21.00, 3.25 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
10.50, 20.05 Фабрыка ежы (16+).
11.40 Дзікі тунец (16+).
14.15, 0.20 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.55 Граніца (16+).
18.25 Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці (16+).
19.15 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
21.50 Аляска: выжыванне ў экстрэмальных умовах (16+).
23.30 Ліхтугі за мяжой (16+).
2.40 Інстынкт выжывання (16+).
4.10 Служба выратавання Аляскі (16+).
4.55 Асушыць акіян: глыбокае апусканне (16+).
5.45 Навуковыя глупствы (16+).

## Discovery

8.00, 3.24 Паляўнічыя на дыназаўраў (12+).
8.45 Багажныя войны (12+).
9.35, 22.18 Круты цюнінг (12+).
10.25, 20.36, 5.42 Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
11.15, 15.30, 21.27, 4.56 Як гэта ўладкавана? (12+)
12.06, 17.12, 19.45, 4.10 Махінатары (12+).
12.57 Гіганцкія будоўлі (12+).
13.48 Як гэта зроблена? (12+)
14.39 Голыя і напалоханыя (16+).
16.21 Музейныя загадкі (12+).
18.03, 23.09 Багажныя войны (12+).
18.54 Рэальныя дальнабойшчыкі (12+).
0.00 Голыя і напалоханыя (16+).
1.42, 6.28 Выжыць разам (12+).
2.33 Палёты ўглыб Аляскі (12+).
7.14 Узрываючы гісторыю (12+).

# «НЕ СЛУХАЦЬ, А ЧУЦЬ»

## Такі дэвіз капыльскіх дэпутатаў

**У Капыльскім раёне — 34 дэпутаты раённага Савета і 117 — сельскіх Саветаў. Менавіта дэпутаты мясцовага ўзроўню — асноўны пасярэднік паміж насельніцтвам і ўладай. Яны жывуць тут, у раёне, і ведаюць амаль што кожнага свайго выбаршчыка, праблемы, якія хвалююць тутэйшых людзей, і маюць усе магчымасці давесці іх патрэбы да розных службаў і падраздзяленняў, тых, якія могуць дапамагчы ў вырашэнні самых розных пытанняў.**

Сёння вядзецца шмат размоў, дэбатаў наконт таго, ці патрэбны наогул дэпутаты сельскіх Саветаў. У кожнага сваё абгрунтаванне. У сувязі са скарачэннем колькасці сельскага насельніцтва выбраць годнага кандыдата ў дэпутаты вельмі складана, сцвярджаюць адны. Іншыя ўпэўнены, што іх могуць замяніць старэйшыны вёсак, неабходна толькі залічваць ім гады знаходжання на гэтай пасадзе ў працоўны стаж. А магчыма, і плаціць нейкую суму за работу.

— Мы схіляемся да таго, што, мабыць, не трэба выбіраць дэпутатаў сельскіх Саветаў. Дэпутаты раённага Савета працуюць эфектыўна, сумленна выконваюць свае абавязкі. Гэта прадстаўнікі розных прафесій і сфер дзейнасці: кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў, прадстаўнікі адукацыі, медыцыны, бізнесу. У нас ёсць і дэпутаты-пенсіянеры, якія актыўна адстойваюць інтарэсы жыхароў сваёй акругі, а таксама маладыя людзі, якія выказваюць шмат цікавых ідэй. Словам, кожны вырашае праблемы па меры сваёй магчымасці, — **кажа старшыня Капыльскага раённага Савета дэпутатаў Ірына КІСЛЯК.** — Я заўсёды нагадваю сваім дэпутатам: вы павінны не слухаць, а чуць людзей. Менавіта так можна пачуць шмат слушных прапаноў. Разам з тым не ўсё магчыма ажыццявіць тут і цяпер — з розных прычын, у тым ліку і фінансавых. Таму не трэба даваць дарэмных абяцанняў. Варта рэальна глядзець на сітуацыю і тлумачыць яе людзям: магчыма, з гэтым пытаннем давядзецца пачакаць.



Для Капыльскага раёна вельмі актуальна навядзенне парадку на зямлі. І гэтаму ёсць тлумачэнне — раён вялікі, сельскагаспадарчы. На яго тэрыторыі знаходзіцца 208 населеных пунктаў, 137 грамадзянскіх могілак. Як ні ў якім іншым раёне Мінскай вобласці тут стаіць пытанне зносу старых і пустуючых дамоў. На сённяшні дзень іх 1628. Гэта вельмі шмат. Да канца года неабходна знесці 78 будынкаў, але план па гэтым паказчыку ўжо перавыканалі. Сродкі, што выдзелены на гэтыя мэты, — 40 тысяч рублёў, працягваюць асвойваць.

— У зносе дамоў нам вельмі дапамагаюць нашы дэпутаты — кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў: выдзяляюць тэхніку, рабочых. Праўда, цяпер мы больш працуем з уласнікамі, спадчыннікамі, каб яны самі займаліся гэтай справай. Наконт тых дамоў, якія па рашэнні суда перайшлі да сельскага Савета, прымаем рашэнні аб далейшым выкарыстанні. Запатрабаваныя насельніцтвам прадаём. Непрыдатныя для жылля зносім, закопваем рэшткі, акультурваем зямельныя ўчасткі і ўводзім іх у грамадскі севазварот, — канстатуе Ірына Мікалаеўна.

Дарэчы, дэпутат раённага Савета — дырэктар філіяла «Вялікая Раёўка» ААТ «Крыніца» Іван Дамашэвіч за значную дапамогу ў рашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва, добраўпарадкаванні населеных пунктаў узнагароджаны граматай абласнога Савета дэпутатаў.

— Прыкметны ўклад у азеляненне горада, раёна ўносіць дэпутат Мінскага абласнога Савета Сяргей Ульдзіновіч, які ўзначальвае Капыльскі вопытны лясгас. Менавіта Сяргей Станіслававіч дапамагае з пасадачным матэрыялам. Акрамя таго, мы самі выкопваем маладыя дрэўцы і кусты ў лесе, абапал дарог, і высаджваем іх на тэрыторыі сельсаветаў. Восенню пасадзілі больш як 1300 дрэў і 600 дэкаратыўных кустоў. А з пачатку года 3540 дрэў і 2400 дэкаратыўных кустоў. І гэтая работа працягваецца, — падкрэслівае мая суразмоўніца. — Яшчэ адна наша задума — уладкаванне клумбаў. Горад раздзялілі на мікрараёны — арганізацыі, прадпрыемствы, установы, якія тут знаходзяцца, будуць упрыгожваць сваю тэрыторыю кветкамі. За кожным з іх замацаваны дэпутат раённага Савета, які будзе не толькі кантраляваць выкананне намечанага, але і сам прымаць непасрэдны ўдзел у агульнай справе.

Літаральна фантануе ідэямі дэпутат раённага Савета Анатоль Пяткевіч, які ўзначальвае Капыльскі дзяржаўны каледж. Менавіта ён прапанаваў стварыць сядзібу «Мядовая заімка». Мясцовыя ўлады падтрымалі ідэю, перадалі клеткі для птушак, якія былі змайстраваны ў школах раёна. Навучэнцы ўстановы разам з выкладчыкамі, майстрамі вытворчага навучання ўладкоўвалі ўчастак, добраўпарадкавалі тэрыторыю. Нядаўна Анатоль Францавіч быў узнагароджаны граматай абласнога Савета дэпутатаў.

— І сёння, мабыць, самае галоўнае пытанне, якое прапрацавалі з усімі дэпутатамі, — унясенне змяненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь,— лічыць Ірына Кісляк. — Мы прынялі ўдзел у абласных дыялогавых пляцоўках, выязджалі ў Салігорск. Правялі такія пляцоўкі і ў сваім раёне. Ад дэпутатаў, жыхароў паступілі слушныя прапановы. Яны датычыліся Выбарчага кодэкса, дэпутатаў сельскіх Саветаў. Шмат выказванняў было па ўдасканаленні маладзёжнай палітыкі, маладзёжнай вертыкалі, у асноўным ад маладых людзей. Частка прапаноў датычылася Зямельнага кодэкса. У прыватнасці, каб выдзяленнем дадатковай зямлі суб'ектам гаспадарання займаліся на мясцовым узроўні. Не варта нагружаць кіраўніка дзяржавы такімі дробязнымі пытаннямі.

Усе пажаданні зафіксавалі і накіравалі ў Мінскі абласны Савет дэпутатаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

КАРЫСНЫ ВОПЫТ

# СЕТКАВЫЯ СТАСУНКІ ДЛЯ ПАВЫШЭННЯ ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ

## У Магілёўскай вобласці сёння завяршаецца пяцідзённы анлайн-форум «Рэгіянальнае ўзаемадзеянне для ўстойлівага развіцця мясцовай эканомікі»



**Развіццё сельскіх тэрыторый, стварэнне камфортных умоў жыцця, ліквідацыя розніцы паміж горадам і вёскай — усё гэта магчыма, калі ёсць ініцыятыва, ёсць лідар і выразны план дзеянняў. Анлайн-форум, які прайшоў у рамках праекта «Сеткавае ўзаемадзеянне для паляпшэння магчымасцяў занятасці ў сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці», дазволіў прааналізаваць, што зроблена для ўзмацнення рэгіянальнага супрацоўніцтва і чаго яшчэ не хапае для далейшага ўстойлівага развіцця тэрыторыі рэгіёна. Праект рэалізуецца Слаўгарадскім райвыканкамам у партнёрстве з Быхаўскім, Клічаўскім, Краснапольскім і Чэрыкаўскім райвыканкамамі, Міжнародным фондам развіцця сельскіх тэрыторый і фінансуецца Еўрапейскім саюзам. Знамянальна, што тры раёны задзейнічаны ў дзяржпраграме развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўшчыны.**

### СІНЕРГЕТЫЧНЫ ЭФЕКТ

Праект стартаваў два гады таму, і за гэты час зроблена нямала. За згаданы тэрмін на конкурс паступілі 195 мясцовых і рэгіянальных ініцыятыў, звязаных з садзейнічаннем занятасці насельніцтва.

Цікавасць да праекта расце. Сёння ўжо можна сказаць, што ўзаемадзеянне ажыццяўляецца на ўзроўні не пяці, а сямі раёнаў. Да пілотных раёнаў далучыўся Хоцімск, перыядычна ў праекце ўдзельнічае Крычаў.

— Мы аб'ядналіся з мэтай максімальна выкарыстоўваць нашы магчымасці, — кажа **старшыня Слаўгарадскага райсавета дэпутатаў Святлана ЯЗЕРСКАЯ.** — У кожным раёне ёсць ініцыятыўныя групы, людзі, якія могуць прыняць удзел у пошуку рашэнняў, і агульная задача — развіваць тэрыторыю, думаць аб павышэнні дабрабыту жыхароў. Разумеючы, што ў нас адны праблемы, мы шукаем агульныя шляхі іх вырашэння. Гэта сінергетычны эфект, скіраваны на тое, каб падтрымаць адно аднаго.

Для прасоўвання мясцовых тавараў і паслуг у Слаўгарадскім раёне зарэгістраваны таварны знак «Гаспадарчы сыр». Да спажывецкага кааператыва далучыліся ініцыятыўныя групы з Краснапольскага і Чэрыкаўскага раёнаў. У Чэрыкаве па ініцыятыве кандытараў прафліцэя № 11 з удзелам Слаўгарадскага і Краснапольскага раёнаў створана гастранамічная лаўка, якая папулярызуе прадукцыю дамашняй вытворчасці. У Краснаполлі з'явіўся кааператыў «Горская скарбніца» і інфармацыйны цэнтр па тэхналогіі вырошчвання суніц. Асаблівая ўвага аддаецца інклюзіўнай эканоміцы. У Клічаўскім раёне рэгіянальная ініцыятыва «Рамонак» стварыла свой персанальны сайт, адміністратарам якога з'яўляецца чалавек з абмежаванымі магчымасцямі. У раёне сёння працуюць чатыры сацыяльныя швейныя майстэрні, звыш 50 чалавек з абмежаванымі магчымасцямі прымаюць удзел у мерапрыемствах мясцовых і рэгіянальных ініцыятыў. І гэта толькі некаторыя прыклады паспяховай дзейнасці праекта на тэрыторыі рэгіёна.

— Мы ўжо разумеем, — кажа Святлана Язерская, — у якіх сферах можам працаваць. Гэта сельская гаспадарка, рамесніцтва, турызм, экалогія. Працуем з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі, аказваем падтрымку ўстановам адукацыі, культуры. Мы навучылі спецыялістаў, якія працуюць з ініцыятыўнымі групамі на месцах. Забяспечылі іх ноўтбукамі, прынтарамі, набылі мэблю — адным словам, стварылі для іх рабочыя месцы. Рэгіянальны савет дзейнічае, нягледзячы на тое, што прысутнічае здаровая канкурэнцыя. Але калі разабрацца, мы не канкурэнты адзін аднаму, мы партнёры. Сумесна мы можам знайсці выйсце і зразумець, менавіта што трэба рабіць.

### ПЛАТФОРМЫ ДЛЯ ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ

Сучасныя тэндэнцыі рэгіянальнага і мясцовага развіцця, мясцовая эканоміка як складовая частка ўстойлівага развіцця тэрыторыі, вопыт распрацоўкі і ўкаранення падыходу «разумная спецыялізацыя» на рэгіянальным узроўні — гэта толькі некаторыя з тэм, якія разглядаліся на форуме.

У рамках тэматычных пляцовак абмяркоўваліся праблемы развіцця турызму ва ўмовах пандэміі COVID-19, магчымасці выкарыстання інавацыйных падыходаў для развіцця сельскіх раёнаў, спосабы паскарэння лічбавізацыі, стварэнне ўмоў для развіцця мясцовай эканомікі і росту занятасці і самазанятасці. Галоўнымі ўдзельнікамі форуму сталі сапраўды дасведчаныя людзі — кіраўнікі праектаў і ініцыятыў, прадстаўнікі раённых і абласной выканаўчай улады, міжнародных арганізацый, бізнесу, ВНУ Магілёўскай вобласці, дэпутаты, ініцыятыўныя групы па розных кірунках. Можна было азнаёміцца з вопытам работы як асобных раёнаў Магілёўскай вобласці, так і з замежнымі практыкамі на прыкладзе зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія. Сваімі напрацоўкамі па аграэкапрадпрымальніцтве падзяліліся эксперты з Грузіі і Украіны.

— Форум атрымаўся вельмі насычаны і інфарматыўны. Ужо ў першы дзень было зразумела, што ён усім цікавы, бо кожнаму ўдзельніку сапраўды ёсць што расказаць, — кажа Святлана Язерская. — Мы ўжо ведаем, чыю практыку распаўсюджваць на рэгіён, як сумесна прыцягнуць знешнія рэсурсы і мабілізаваць унутраныя. Гэты форум даў новы імпульс да развіцця сельскіх тэрыторый. Пытанні, якія разглядаліся на ім, цалкам перапляцены з жыццём вобласці. У аблвыканкаме якраз адбылося абмеркаванне стратэгій устойлівага развіцця Магілёўскай вобласці да 2035 года, гэтае ж пытанне разглядалася і падчас форуму. Вялікая ўвага аддаецца лічбавізацыі, вывучэнню яе сутнасці і спосабаў прымянення ў эканоміцы, стварэнню новых падыходаў. Перш за ўсё людзей трэба вучыць. Для Слаўгарада вельмі актуальнае развіццё школы менеджараў, бо мы жадаем стварыць цэнтр падтрымкі сельскага прадпрымальніцтва ў вёсцы Старая Каменка. Для нас важна развіваць у рэгіёне стартап-рух. Нам цікава ўсё, што можа садзейнічаць стварэнню ўмоў для раўнамернага развіцця тэрыторыі, а таксама вопыт і разуменне, як усё тое рабілі іншыя. Гэта не значыць, што мы скапіруем іх. Нам важна ведаць, што і дзе адбываецца і што можна пераняць. Добра вучыцца на памылках іншых і рабіць яшчэ лепш. З іншага боку, у нас таксама ёсць чым падзяліцца. Рэгіянальнае супрацоўніцтва — гэта таксама міжнародны вопыт.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

СВЯТА Ў ХАТУ!

## Для малых з «Маладзёжнага»

**Дзіцячы садок на 75 месцаў — такі падарунак атрымалі жыхары Слаўгарада на Дзень горада, які адзначылі 25 лістапада.**



Фота БелТА.

Старадаўні горад адсвяткаваў сваё 880-годдзе і 73-ю гадавіну вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Знамянальна, што колькасць юных слаўгарадчан у апошнія гады прыкметна павялічваецца. У паўднёвай частцы горада вельмі хутка вырас новы мікрараён пад назвай «Маладзёжны».

— Усяго ў горадзе тры ўстановы дашкольнай адукацыі, і вельмі востра стаяла пытанне адкрыцця новага дзіцячага садка, — гаворыць **старшыня Слаўгарадскага райсавета дэпутатаў Святлана ЯЗЕРСКАЯ.** — Толькі ў мікрараёне «Маладзёжны» жыве больш чым 200 дзяцей, з якіх 150 наведваюць установы дашкольнай адукацыі. Гэты мікрараён знаходзіцца далёка ад цэнтра, таму дзяцей даводзілася падвозіць. Цяпер гэтая праблема вырашана.

У праграме мерапрыемстваў, прысвечаных дзвюм значным у гісторыі горада датам, шматлікія выстаўкі ва ўстановах культуры раённага цэнтра. Адна з іх — «Мінулых гадоў жывая памяць» — адкрылася ў Слаўгарадскім гісторыка-краязнаўчым музеі. Таксама ў гарадскім парку адбылося ўрачыстае перапахаванне астанкаў чырвонаармейцаў і камандзіраў, якія былі знойдзены падчас сёлетняй пошукавай экспедыцыі ў Слаўгарадскім раёне байцамі абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Вікрру» і 52-га асобнага пошукавага спецыялізаванага батальёна Міністэрства абароны.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## Гаспадыні ацэняць

### Першыя беларускія пасудамыечныя машыны будуць выпускаць у Брэсце

**Сход акцыянераў СП ААТ «Брэстгазаапарат» ухваліў ідэю наладжвання новай вытворчасці, для чаго спатрэбіцца пашырыць тэрыторыю прадпрыемства, паведаміў у сваім тэлеграм-канале старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.**

Першым крокам у дадзеным кірунку стане выкуп пляцовак у ААТ «Брэстмаш». На гэтай тэрыторыі ў перспектыве плануецца размясціць вытворчасць пасудамыечных машын з беларускай этыкеткай.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з тэлеграм-канала.**




# ТОЛЬКІ РАЗАМ, ЯК АДНО ЦЭЛАЕ

## Мясцовая ўлада ў Мікашэвічах працуе ў звязцы з «Гранітам» на карысць горада

**У Мікашэвічах, што на Брэстчыне, усё нейкім чынам звязана з прадпрыемствам «Граніт». Маецца на ўвазе не толькі работа, годная зарплата, прыстойны сацпакет работнікаў і дабрабыт іх сем'яў, але і адпачынак, гарадское жыццё, навакольнае асяроддзе.**

Скажам, тутэйшыя пенсіянеры, нават тыя з іх, хто да заслужанага адпачынку працаваў у сацыяльнай сферы, будаўніцтве, іншых галінах, цяпер з задавальненнем адпачываюць летам каля фантана побач з Палацам культуры. Яны, як і людзі іншых узростаў, наведваюць басейн, трэнажорную залу, займаюцца ў розных гуртках. І ўсё дзякуючы РУВП «Граніт», таму што гэтая культурная ўстанова ведамасная, і ўсё, што размешчана на плошчы побач, уладкавана намаганнямі і за сродкі прадпрыемства.

Найбуйнейшы ў Еўропе вытворца шчэбеню ўвесь час займаецца добраўпарадкаваннем населенага пункта. Не так даўно зона адпачынку каля ПК папоўнілася цэлым дзіцячым забаўляльным комплексам, які назвалі «Мурашнік». Цяпер у тым «гарадку» дзяцей — сапраўды як мурашоў. Для матуляў з каляскамі, асабліва ўлетку, гэтае месца стала традыцыйным. Ды і крыху старэйшыя — дашкольнікі, малодшыя школьнікі — могуць ладзіць тут рухомыя гульні на любы густ. Дзятва з задавальненнем бавіць вольны час у «Мурашніку».

> Фактычна ўсё, што адбываецца ў горадзе, адбываецца з удзелам «Граніта». Там працуе вельмі шмат гараджан, у горадзе жывуць ветэраны вытворчасці, сем'і цяперашніх працаўнікоў. Таму горад і прадпрыемства — гэта адно цэлае, і працуем мы на паляпшэнне свайго горада разам з кіраўніцтвам і калектывам «Граніта».

— Кіраўніцтва РУВП «Граніт» на чале з дэпутатам гарадскога Савета Эдуардам Гаўрылкавічам многае робіць для арганізацыі адпачынку гараджан, — гаворыць **намеснік старшыні Мікашэвіцкага гарвыканкама Ларыса АЛЬГОМЕЦ.** — Нашы людзі прывыклі, што летам у нас пастаянна арганізуюцца канцэрты, фестывалі, розныя масавыя мерапрыемствы. Цяжка згадаць, якія з вядучых творчых калектываў рэспублікі тут не выступалі. Вечарам выхаднога дня ўлетку да нас абавязкова нехта едзе з канцэртнай праграмай. Ну і нашы мясцовыя калектывы не адстаюць, у іх таксама ёсць свае аматары. Вядома, усё гэта ладзіцца намаганнямі галоўнага прадпрыемства Мікашэвіч. Ды і ніякае іншае свята альбо мерапрыемства без удзелу РУВП не адбываецца.

Скажам, усе выпускнікі школ ведаюць, што ў чэрвені агульнагарадскі выпускны баль з уручэннем атэстатаў будзе менавіта ў Палацы культуры, і пройдзе ён прыгожа, урачыста, запамінальна. А ў Дзень моладзі праводзіцца маладзёжны фестываль «Мы адзіныя, мы моладзь». І гэта становіцца святам ўсяго населенага пункта. Ды і на іншых «Граніт» выступае асноўнай сцэнічнай пляцоўкай.

І не толькі масавыя мерапрыемствы, летнія вечары, зоны адпачынку набылі своеасаблівы каларыт дзякуючы горадаўтваральнаму прадпрыемству. Пры яго спонсарскай падтрымцы на новы якасны ўзровень аказанне паслуг выйшла мясцовая ўстанова аховы здароўя, — падкрэслівае Ларыса Альгомец.

Толькі за апошнія гады ў Мікашэвіцкую бальніцу была куплена ўльтрагукавая дыягнастычная сістэма высокага класа, набыты відэакаланаскоп, кальпаскоп, гістэраскоп і іншыя апараты. Аснашчаны кабінет лячэбнай фізкультуры, набыты комплекс манітораў для кантролю электракардыяграмы і артэрыяльнага ціску. Усё абсталяванне найноўшых узораў — не кожная вялікая бальніца можа такім пахваліцца. Нядаўна купілі для яе аўтамабіль хуткай медыцынскай дапамогі.

Установы адукацыі таксама рэгулярна атрымліваюць спонсарскую дапамогу. Сучасныя камп'ютарныя класы вучні маюць дзякуючы сваім мецэнатам. Для школы апошнія набываюць наглядныя дапаможнікі, тэлевізары. А вось гэтым летам для вучняў сярэдняй школы № 1 абсталявалі сучасны міні-стадыён для гульні ў футбол. Міні-футбольнае поле са штучным пакрыццём урачыста адкрылі на лінейцы 1 верасня. Матэрыялы для асновы пад укладку газона забяспечыў «Граніт». Таксама прадпрыемства паклапацілася пра асвятленне па перыметры поля, таму гуляць тут можна нават у цёмны перыяд сутак. У выніку ў школе на базе дзясятага класа стварылі групу спартыўна-педагагічнага профілю, а таксама футбольную секцыю для вучняў трэцяга-чацвёртых класаў.



Наогул, для добраўпарадкавання тэрыторый школ, устаноў аховы здароўя названыя спонсары робяць многае. Напрыклад, дапамагаюць будаўнічымі матэрыяламі. А сёлета горад у рамках спонсарскай дапамогі атрымаў лаўкі, што ўстаноўлены на вуліцах, а таксама сметніцы для зон адпачынку, дваровых тэрыторый.

— Сёння жыццё горада неадрыўнае ад жыцця галоўнага прадпрыемства, — падкрэслівае **кіраўнік гарадской улады Валерый КРАСНІКЕВІЧ.** — І гаворка не толькі пра канкрэтную спонсарскую дапамогу аб'ектам сацыяльнага прызначэння, добраўпарадкаванне тэрыторыі, хоць пералічанае варта паставіць на першы план. Фактычна ўсё, што адбываецца ў горадзе, адбываецца з удзелам «Граніта». Там працуе вельмі шмат гараджан, у горадзе жывуць ветэраны вытворчасці, сем'і цяперашніх працаўнікоў. Таму горад і прадпрыемства — гэта адно цэлае, і працуем мы на паляпшэнне свайго горада разам з кіраўніцтвам і калектывам «Граніта».

Хутка Мікашэвічы пачнуць падрыхтоўку да Новага года. І зноў па традыцыі майстры віртуознай зваркі прадпрыемства аздобяць плошчу каля ДК незвычайнымі інсталяцыямі. З металічных прутоў яны зварваюць фігуркі аленяў, дрэў, саней з казачнымі героямі ды іншага. Потым усё гэта арыгінальна падсвечваецца — такім чынам з'яўляюцца цэлыя казачныя сюжэты. А калі запальваюцца агні, наступае адчуванне свята. На плошчу прыходзяць гуляць дзеці, моладзь, старэйшае пакаленне. Усе робяць сэлфі на памяць, сустракаюць, віншуюць адно аднаго.

Асноўнае — гэта задаць тон, напрамак. Тады і іншыя гарадскія аб'екты будуць вымушаны падцягвацца. Асабліва прывабнымі перад навагоднімі святамі імкнуцца выглядаць гандлёвыя пункты. Іх з часам становіцца больш, прадпрымальнікі адкрываюць свае аб'екты гандлю і грамадскага харчавання. Напрыклад, сёлета з'явілася кавярня «Лофт».

У цэлым, паводле слоў Валерыя Краснікевіча, у справе навядзення парадку, паляпшэння знешняга выгляду горада сёлета прынялі актыўны ўдзел усе наяўныя арганізацыі і ўстановы. Была праведзена прыборка, наведзены санітарны парадак на многіх тэрыторыях, пасаджаны сотні дрэў і кустоў, мноства кветак. Асаблівая ўвага тут надаецца вайсковым пахаванням, помнікам, памятным мясцінам.

Вялікая работа па рамонце вуліц, дарог, дваровых тэрыторый, старанак аўтатранспарту праводзіцца за кошт бюджэту. Здаецца, адзін радок у справаздачы займае сказ: «Паніжэнне бардзюрнага каменя каля пешаходных пераходаў па пяці вуліцах», але за ім стаіць сапраўды вялікая работа, якую выканалі будаўнікі ЖКГ. Раней бардзюры клалі без уліку зручнага праходжання для дзіцячых калясак, інвалідных крэслаў. Усё гэта даводзіцца выпраўляць зараз, укладваць сродкі для таго, каб пешаходныя пераходы былі прыстасаваныя для патрэб усіх людзей без выключэння.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 26 лістапада 2020 года.

Перачытваючы класіка

# «АЛЕ ЯШЧЭ І ЗАРАЗ Я ЧАСАМ БАЧУ Ў СНЕ СІВЫЯ ВЕРАСОВЫЯ ПУСТКІ...»

## Топ-5 пейзажаў Уладзіміра Караткевіча

**Вядома, што вялікі Уладзімір Караткевіч быў адораны і як мастак — адна з кніг новага збору твораў у 25 тамах сабрала яго малюнкі, і гэта ўражвае...**

**Ці не з-за гэтага ў тым, як ён маляваў словам, адчуваецца дасканалая выразнасць — ты нібыта разглядаеш карціны... Караткевічу дастаткова было некалькіх штрыхоў, каб стварыць амаль аб'ёмны пейзаж, дзе схаваны такія сэнсы, такая гісторыя — разгадваць можна бясконца... Ды вось хаця б у эсэ «Званы ў прадонні азёр», напісаным пасля падарожжа па Палессі: пару радкоў — і перад намі Мазыр, «горад на зялёных адхонах. Яры, над якімі хіляцца дрэвы. Цукровая бель старых цэркваў і манастыроў праз сець галін. Мазыр. Міні-Кіеў». А вось вам неба над старажытным Туравам: «Навальнічная хмара стаяла над горадам, ішла на яго, на нас. Срэбныя, дробныя бліскаўкі сонца трапяталі на ліловай вадзе і цьмяна-срэбных плямах пены. А над усім сутыкаліся дзве цёмна-сінія хмары, як два мячы. Пад імі клубіліся жамчужна-белыя аблокі, а ў іх малюткім ясна-сінім вочкам палыхаў лапічак неба». Тут вам і экскурс у навальнічную гісторыю горада, і замілаванне, і туга па нязбытным... Колькі кранальных карцін, створаным Уладзімірам Караткевічам, назаўсёды застаюцца ў памяці, і бяссільныя паўтарыць іх і мастакі, і кінематаграфісты! Давайце складзём, хаця б умоўна, топ-5 пейзажаў ад Уладзіміра Караткевіча, напоўненых глыбокім сэнсам.**

### 1. ГРУША НА БЕРАЗЕ ДНЯПРА

Безумоўна, адкрываць гэты рэйтынг мусіць пачатак сагі «Каласы пад сярпом тваім».

*«Груша цвіла апошні год.*

*Усе галіны яе, усе вялікія расохі, да апошняга пруціка, былі ўсыпаны бурным бела-ружовым цветам. Яна кіпела, млела і раскашавалася ў пчаліным звоне, цягнула да сонца сталыя лапы і распасцірала ў яго ззянні маленькія, кволыя пальцы новых парасткаў. І была яна такая магутная і свежая, так утрапёна спрачаліся ў яе ружовым раі пчолы, што, здавалася, не будзе ёй зводу і не будзе канца.*

*І, аднак, надыходзіла яе апошняя часіна.*

*Дняпро падбіраўся да яе спакваля, патроху, як разбойнік. У вечным сваім імкненні скрышыць правы бераг, ён падступаў у палавень зусім блізка да яго, руйнаваў адхоны, зносіў, каб пасадзіць у другім месцы, лазу, гвалтоўна вырываў кавалкі берага або асцярожна падмываў яго, каб раптам абрушыць у ваду цэлыя брылы зямлі. Потым адступаў, да наступнай вясны, і трава літасціва спяшалася залячыць раны, нанесеныя Дняпром. А ён вяртаўся зноў: дзе руйнаваў, дзе падмываў і з часам абкружыў грушу амаль з усіх бакоў».*

Літаратуразнаўцы сцвярджаюць, што гэта рэальнае дрэва — каля Рагачова, дзе любіў гасцяваць у дзядзькі Караткевіч і дзе напісаў шмат узнёслых твораў, ёсць вёска Азярышча, дзе на высокім стромкім беразе і цвіла такая груша.

А яшчэ — гэта балючае асэнсаванне лёсу таго пакалення, лепшай яго часткі, якая была вынішчана, выслана з Беларусі пасля паражэння паўстання 1863 года... Лёсу героя роману, з якімі Караткевіч так не хацеў развітвацца, бо ведаў, што іх чакаюць пакуты і смерць. Тут і ўвасабленне Беларусі, яе культуры і мовы, што выжываюць ва ўсе эпохі, нягледзячы на самыя неспрыяльныя гістарычныя ўмовы.



### 2. ВЕРАСОВАЯ ПУСТКА І ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ

У культавай аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» шмат неверагодных, амаль сюррэалістычных карцін... Злавесны лес, дзе знаходзіцца маёнтак Балотныя яліны, закінуты сад вакол маёнтка, сагнутыя ў крук дрэўцы на неабсяжнай раўніне, дзе панылыя вёскі... Аўтар не шкадуе змрочных, прыгнятальных фарбаў, апісваючы тарфяныя балоты — «Трэба быць чалавеканенавіснікам, каб выдумаць такія мясціны, і ўяўленне пра іх можа з'явіцца толькі ў пячорным мазгу зласлівага ідыёта».



І назаўсёды застаецца ў памяці верасовая пустка, дзе праз туман скача Дзікае паляванне і дзікі верас спявае пад нагамі коней.

*«Але яшчэ і зараз я часам бачу ў сне сівыя верасовыя пусткі, чэзлую траву на паверхні прорваў і дзікае паляванне караля Стаха, якое скача па дрыгве. Не бразгаюць цуглі, моўчкі сядзяць у сёдлах прамыя постаці коннікаў.*

*Вецер развейвае іх валасы, плашчы, грывы коней, і самотная гострая зорка гарыць над іхнімі галовамі.*

*У жахлівым маўчанні шалёна скача над зямлёю дзікае паляванне караля Стаха.*

*Я прачынаюся і думаю, што не прайшоў ягоны час, пакуль ёсць цемра, голад, нераўнапраўе і цёмны жах на зямлі. Яно — сімвал усяго гэтага.*

*Хаваючыся напалову ў тумане, імчыць над змрочнай зямлёй дзікае паляванне».*

### 3. ЗЛАВЕСНЫ ЗАМАК

Раман «Чорны замак Альшанскі» Уладзімір Караткевіч напісаў у падарунак жонцы Валянціне Браніславаўне, якая вельмі любіла дэтэктывы. У якасці дэкарацый — руіны замка, прататып якога — Гальшанскі. Аўтар па-майстэрску стварае гатычную атмасферу, паказваючы першую сустрэчу героя, гісторыка Антона Космiча, з тым збудаваннем.

*«Вачам адкрылася нешта такое, што не да веры, чаго не бывае, не павінна быць сярод гэтай разнежанай веснавай прыроды, сярод гэтых ласкавых дрэў і зялёнай травы.*

*На тым баку ўзвышаўся мур і вежа (астатняе хавалі дрэвы), крыху-крыху толькі ў пражоўць, цёмна-свінцовага, амаль чорнага колеру.*

*Замак. І які пагрозны, пачварны замак!*

*І не на ўзгорку, не наводдаль, каб чалавек паспеў неяк падрыхтавацца, а твар у твар, як нечаканы цёс мяча.*

*Ясна, што парк быў пасаджаны пасля, калі замак перастаў быць замкам, а стаў палацам, хай сабе і невыгодным, але прыдатным на тыя часы, і ўсё адно ўражанне было сапраўды ўразлівым, нібы чалавек падышоў да гушчару і раптам убачыў там разверстую ў рыку пашчу льва.*

*І гэта было так, таму што я ўбачыў проста перад сабой цёмную і дужа нізкую арку брамы.*

*І гэта была брама-праём, брама-тунель, брама-ўваход у пячору страшнага гіганта-вола-та са злоснай казкі».*

Той пейзаж па-майстэрску паспрабаваў адлюстраваць сябра Караткевіча, мастак Пётр Драчоў у малюнках да выдання рамана 1983 года.



### 4. СТРАШНАЯ ВЕРАБ'ІНАЯ НОЧ НА РАЦЭ

Сімвалам трагедыі народа, сутыкнення высакароднасці і подласці стаў пейзаж з пралога да рамана «Леаніды не вернуцца да Зямлі» з назвай «Паром на бурнай рацэ». Дзеянне адбываецца ў часы паўстання Каліноўскага, у вераб'іную ноч — так ва ўсходніх славян называлі ноч з моцнай навальніцай або бліскавіцамі. Афіцэр расійскай арміі Гораў адважваецца ў самую буру пераvезці праз раку жонку паўстанца, якога могуць пакараць смерцю, калі ў час не прывезці падпісанае памілаванне.

*«Бледная бязгучная маланка якраз у гэту хвіліну заліла нязэўным дрыготкім святлом абшар Дняпра, пасівелага ад ярасці, імклівыя грабянцы валоў, далёкі чорны бераг. Вёслы Горава і Івана ўдарылі па вадзе, ружовай ад святла бліскавіцы.*



*І адразу гэтая вада стала чарнільнай, а на людзей цяжка наваліўся змрок. Потым, быццам жадаючы дапамагчы, неба раз-пораз пачало раздзірацца ўспышкамі святла. Гораў бачыў твар жанчыны, якая з прагай, з чаканнем, зусім без усведамлення небяспекі, толькі з радасным імкненнем наперад, да волі, глядзела на другі бераг, які амаль не набліжаўся.*

*Шкарлупінку кідала ў правалы паміж хваль, вецер адкідваў цёмны шаль на жанчыне, як вялізныя імпэтныя крылы».*

Гэткія перашкоды можна пераадолець смеласцю і высакароднасцю, што бяссільныя толькі супраць людской подласці...

### 5. ЛЯСЫ ДАЛЁКАГА УСХОДУ

1 жніўня 1964 года Уладзімір Караткевіч з сябрамі — Рыгорам Барадуліным і Генадзем Кляўко — апынуліся ва Уладзівастоку. Прыехалі на стажыроўку ў газету Ціхаакіянскага флоту.

Гэта былі наступствы п'янага жарту — яшчэ ўвосень тая ж кампанія сядзела за вясёлай бяседай, і Барадулін вырашыў пазваніць генералу Аляксееву, які ўзначальваў ваенна-шэфскую камісію пры Саюзе пісьменнікаў, каб той паслаў іх куды-небудзь як мага далей, за экзатычнымі ўражаннямі.

Ад той неверагоднай паездкі засталіся фота Караткевіча ў флоцкай форме і цудоўная аповесць, дакладней, паэма ў прозе «Чазенія». Вялікі рамантык скарыстаўся знаходжаннем на Камчатцы ўволю. 14 верасня 1965 года ён піша Адаму Мальдзісу: «Мы нядаўна ездзілі па краіне з апаратарам... З Цецюхе цераз Канцухінскі перавал — на Кавалераўку. Там начавалі, хадзілі на раку Луд'е, я пералазіў яе з апаратурай па бервяне ільма... А за ракой скала Халаза, а пад ёй бурундукі бегаюць і лётаюць блакітныя сарокі». Барадулін успамінаў пра сябра: «На нейкі тыдзень з кайстраю за плячыма некуды знік. Вярнуўся, казаў пра Кедравую падзь, пра запаведнік. Нам прывёз у падарунак кедравых шышак. А пасля ўсім пра гэта распавёў у «Чазеніі».

Якія яркія экзатычныя пейзажы ў паэме «Чазенія»... На гэтым фоне разгортваецца гісторыя кахання фізіка Севярына і біёлага Гражыны, бойка Севярына з леапардам, развагі пра гуманізм і — як заўсёды — пра гістарычны лёс беларусаў...

*«За сопкамі яшчэ стаяла імгла. Сонца толькі-толькі збіралася нарадзіцца. Мякка спружынілі пад нагамі бурыя сухія купы водарасцяў. Набягаў лёгкі прыбой: лакіраваныя, зялёна-карычневыя стужкі марской капусты нібыта млява мялі, нібыта лізалі ля ног сцежку — палоску ўкатанага цвёрдага пяску.*

*«Шш-шшш-ш...» — закалыхваў, дыхаў лёгкі прыбой. Празрыста-сіняя вада, карункавыя каробачкі марскіх вожыкаў, шкляныя плаўкі.*

*Паднялося сонца. Яшчэ нізкае. Мора штохвіліны мяняла колер: падаў на яго цень дрэў, скал, зноў прарываліся сонечныя праменні. Было яно, як васьміног, то сіняватае, то злёгку ў чырвань, то ярка-зялёнае, то жаўтавата-шэрае. Але што далей, то болей перамагала, панавала ў ім глыбокая сінь.*

*Сцежка пачала аддаляцца ад мора, успаўзла на скалы, і сандалі пачалі спяваць іначай.*

*Клік-кляк, клік-кляк...*

*Ствалы ільмаў і кедраў ляжалі над патокамі. Дзіўна было ісці лесам, дзе большасць дрэў — твае незнаёмыя, дзе толькі па малюнках, па ўспамінах аб прачытаных кнігах здагадваешся, хто ёсць хто.*

*«Здароў, братка, ты, здаецца, маньчжурскі арэх. Унь, вісяць і пэцкаюцца, як грэцкія. А ты хто? Ты лімоннік. А твае лісты падобны на лісты жэньшэня, але ты не тое. Цябе тут, як лапухоў. Як казала Гражына? Элеўтэракок?»*

*Плача струменямі скала ля сцежкі. Добра прыпасці ротам да вады. Поўзаюць па камені багойкі. Чырвоныя, сінія, жоўтыя. Буйныя, з пазногаць вялікага пальца. У іх на спінках візэрункі, і адразу робіцца ясна, адкуль нанайцы ўзялі свой нацыянальны арнамент.*



*Злева пад галавакружнай стромай — мора. Тырчаць з яго, нібы алоўкі, кекуры — гранітныя рыфы. Нячутна кіпіць вакол іх прыбой».*

***

Спадзяюся, гэтыя згадкі прымусяць вас перачытаць цудоўныя творы класіка (і, магчыма, знайсці «свае» пейзажы), а яшчэ па-новаму паўзірацца ў наваколле.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09.

Продавец: **ООО «Вудкойн»** (УНП 692045636) в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Капитал Диалог», тел. +37529 130-85-30.

Вторые повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **14 декабря 2020 г. 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

| № | Предмет торгов | Начальная цена, без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Кромкообрезной станок RT4 | 13 200,00 |
| 2 | Станок ленточный для горизонтального распила горбыля Lignuma MMM-700 | 7 040,00 |
| 3 | Погрузчик Мониту M426CP, 1995 года выпуска, кузов № 110693 | 13 760,00 |
| 4 | Погрузчик фронтальный одноковшовый JCB 416HT 2005 г.в., кузов № SLP416005E0530727 | 37 920,00 |
| 5 | Многопильный торцовочный станок МТМ-6-6 (диаметр пилы 400) | 9 840,00 |
| 6 | Многопильный торцовочный станок МТМ 7-5 | 9 360,00 |
| 7 | Горизонтальный ленточнопильный станок HMPS-74 | 5 920,00 |
| 8 | Горизонтальный ленточнопильный станок HMPS-74 | 5 920,00 |
| 9 | Горизонтальный ленточнопильный станок HMPS-74 | 5 920,00 |
| 10 | Горизонтальный ленточнопильный станок HMPS-74 | 5 920,00 |

**Местонахождение п. 1, 2, 5-10 – Минская обл., Воложинский р-н, д. Новый Двор, п. 3, 4– Борисовский р-н д. Большая Ухолода, ул. Элькинда Виктора, 12\3. Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 30.11.2020 г. 09.00 по 11.12.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY**; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов и задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Покупатель осуществляет принятие и демонтаж имущества по месту его нахождения собственными силами и за свой счет. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 14.10.2020 г.

## Извещение о проведении 10 декабря 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, отдельные характеристики, местонахождение продаваемого имущества)** | Административно-бытовой корпус АБЗ «Гореничи» общей площадью 204 кв. м, инв. № 611/С-916; складское помещение для хранения дров общей площадью 39 кв. м, инв. № 611/С-34214; техническое помещение для обслуживания водонапорной башни общей площадью 10,2 кв. м, инв. № 611/С-34215;<br>стол «Амадей» т102 (1 шт.); силовой тренажер HouseFit DH – 8157 (1 шт.); бильярд «Магнат – Плюс» 8 фут. (1 шт.); машина стиральная Gorenje WS43101 (1 шт.); водонагреватель Ariston SG HP 200V (1 шт.); киевница напольная ПАЖ-2 (материал: ясень) (1 шт.); светильник «Венеция» (1 шт.); стул «Амадей» s102 (6 шт.); стул ИСО Black (15 шт.); тумба для ТВ «Ниагара» (2 шт.); чехол защитный для бильярдного стола 8ф (1 шт.); шары «Арамит Премьер» (1 шт.); шкаф с витриной «Дэнвер-Э-9М» (1 шт.); электросушилка для рук Puff-8820 (3 шт.); антенна Variant 60 (2 шт.); бра «Орхидея» 13200/2 (4 шт.); зеркало (1 шт.); жалюзи вертикальные «Лайн» 1,5*2,2 кв. м (1 шт.); жалюзи вертикальные «Лайн» 1,7*1,7 кв. м (4 шт.); кий «Гигант-М», 2PC 2-составной, 156 см (материал: канадский клен) (1 шт.); кий «Онтарио» 1PC целый, 149 см (материал: канадский клен) (4 шт.); кий «Ярость», 2PC 2-составной, 156 см (материал: канадский клен) (1 шт.); мягкий уголок «Лагуна комфорт» (1 шт.); емкость подземная, горизонтальная, металлическая 50 $м^3$ (1 шт.); телевизор «Горизонт» 21KF19V (1 шт.); цифровой спутниковый ресивер Eurosat DVB-3023 (1 шт.) |
| **Местонахождение** | Минская обл., Березинский р-н, Капланецкий с/с, 2, 2/1, 2/2 |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь: 2,3610 га, кадастровый номер: 620482302101000151 |
| **Продавец имущества** | ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253 |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов без учета НДС** | 81 647,74 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 8 100,00 бел. руб. |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **10 декабря 2020 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 27.11.2020 по 08.12.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО«Веста-Борисов» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

**МАСТЕРСКАЯ** *(составные части и принадлежности: котельная),* **с инв. № 610/С-43613 общей площадью 268,0 кв. м,**
**ПРОХОДНАЯ с инв. № 610/С-43614 общей площадью 14 кв. м** (далее – Объекты).

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 640400000014000246 площадью 0,0957 га (право постоянного пользования), по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Демина, 18А.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 61 800,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 6 180,00** бел. руб.).

*Объекты обременены договорами аренды по 28.02.2021 и 31.10.2021 соответственно.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объектов производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона (Объектов).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **14.01.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.01.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.**

УНН 600012029

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов № 2020.Ч.002.00025 по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витебскмясомолпром», тел. +375 (212) 22-12-21.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 42-60-11, +375 (29) 884-96-79, +375 (29) 391-09-56, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных торгов**: 29.12.2020 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-92048 площадью 1154,9 кв. м, назначение – помещение общественного питания, наименование – столовая, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Пролетарская, 10. **Нач. цена**: 73 092,28 бел. руб. с учетом НДС. **Задаток:** 7 309,22 бел. руб.

Повторные электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом ЭТП. **Для участия в повторных электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 28.12.2020. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия электронных торгов**: победитель торгов (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов в соответствии со сметой затрат, оплатить услугу по размещению одного аукциона и затраты на обслуживание ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; заключить договор купли-продажи имущества в течение 14 рабочих дней со дня проведения электронных торгов, оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество – другое. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 (33) 675 23 74.

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ООО «БЕЛГАЗНАЛАДКА» (Продавец)

**Лот № 1:** здание инженерно-лабораторного корпуса (литер А 4/к-кп), инв. № 500/С-28176, 3078 кв. м.

Адрес: г. Минск, ул. Гурского, 32. **Обременения:** аренда. Земельный участок: кадастровый номер 500000000005001607, площадь – 0,2998 га.

Начальная цена с НДС – 2 499 000,00 бел. руб.
Задаток – 249 900,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.

**Аукцион состоится 28.12.2020 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатков 23.12.2020 в 11.00.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ» – управляющая компания холдинга» (Продавец)

**Лот № 1, состав**: 1. Здание специализированное иного назначения, инв. № 500/С-28807, 1819,3 кв. м; 2. Сооружение специализированное складов, хранилищ, инв. № 500/С-30308, 85 кв. м; 3. Сооружение специализированное складов, хранилищ, инв. № 500/С-28809, 481 кв. м; 4. Здание специализированное иного назначения, инв. № 500/С-26575, 1040,3 кв. м; 5. Сооружение специализированное складов, хранилищ, инв. № 500/С-30309, 286,4 кв. м; 6. Склад ГСМ, инв. № 500/С-30757, 47,2 кв. м; 7. Ливневая канализационная сеть, инв. № 500/С-1026033, 724,3 кв. м; 8. Газопровод среднего давления, инв. № 500/С-1026034, 32,2 кв. м; 9. Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть, инв. № 500/С-1026035, 459,9 кв. м; 10. Хозяйственно-бытовая канализационная сеть с инвентарным номером 500/С-1026036, 395,1 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Гурского, 34, 34/1, 34/2, 34/ 3, 34/4, 34/5, 34 (КлК-1-КлК-23), 34 (здание – т.А), 34 (ВпК-1-ВпК-7), 34 (КбК-1-КбК-21); 11. Иное имущество (полный перечень на сайте **ino.by**). Обременения: аренда.

Земельные участки: 1. Кадастровый номер 500000000005008075, площадь – 2,1485 га, право аренды (по 31.05.2038); 2. Кадастровый номер 500000000005008152 (присвоен, предварительно).

Начальная цена с НДС – 2 938 779,24 бел. руб.
Задаток – 293 877,92 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.

**Аукцион состоится 28.12.2020 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.** Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатков 23.12.2020 в 11.00.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## УВЕДОМЛЕНИЕ о проведении общественных обсуждений экологического доклада стратегической экологической оценки по проекту Государственной программы «Охрана окружающей среды и устойчивое использование природных ресурсов» на 2021–2025 годы

**Дата уведомления**
27 ноября 2020 г.

**Информация о государственном органе, планирующем разработку документации:**

Министерство природных ресурсов и охраны окружающей среды Республики Беларусь, 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 10, e-mail: mail@minpriroda.gov.by, телефон приемной: (+375 17) 200-66-91, телефон канцелярии: (+375 17) 200-68-44, факс: (+375 17) 200-55-83.

**Наименование документа планирования, для которого проводится стратегическая экологическая оценка, описание:**

стратегическая экологическая оценка (СЭО) проводится по проекту Государственной программы «Охрана окружающей среды и устойчивое использование природных ресурсов» на 2021–2025 годы (далее – проект Государственной программы).

Проект Государственной программы учитывает актуальное состояние окружающей среды и использование природных ресурсов, мировые и национальные тенденции, а также поручения Главы государства в сфере охраны окружающей среды, природопользования, сохранения и восстановления биологического разнообразия, природных ресурсов и объектов.

Реализация Государственной программы видится в качестве принципиально важного шага для определения и закрепления основных направлений государственной политики Республики Беларусь в области охраны окружающей среды на долговременную перспективу, повышения координации работы всех органов власти.

**Информация о принимаемом решении в отношении документа планирования и государственном органе, ответственном за принятие такого решения:**

Утверждение Государственной программы будет осуществлено путем принятия постановления Совета Министров Республики Беларусь. Орган, ответственный за принятие такого решения: Министерство природных ресурсов и охраны окружающей среды Республики Беларусь.

**Сроки проведения общественных обсуждений:**

Общественные обсуждения начинаются с 27 ноября 2020 г. до 27 декабря 2020 г.

**Сроки и порядок направления замечаний и предложений по экологическому докладу по СЭО:**

Замечания и предложения по экологическому докладу по СЭО направлять в период с 27 ноября 2020 г. до 27 декабря 2020 г. в адрес Министерства природных ресурсов и охраны окружающей среды Республики Беларусь, 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 10, e-mail: mail@minpriroda.gov.by с пометкой «Общественные обсуждения».

Экологический доклад по СЭО размещен на сайте https://www.minpriroda.gov.by/ru/ в разделе «Общественные обсуждения».

Бумажный вариант экологического доклада по СЭО находится по адресу Министерства природных ресурсов и охраны окружающей среды Республики Беларусь: 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 10, холл, 1-й этаж.

Контактное лицо по экологическому докладу по СЭО – заместитель начальника управления аналитической работы, науки и информации главного управления экологической политики, международного сотрудничества и науки Мелешкова Елена Михайловна (+375 17 200 45 45), e-mail: daspriroda@tut.by.

**Сроки и порядок направления заявления о необходимости проведения собрания по обсуждению экологического доклада по СЭО:**

Подача заявления о необходимости проведения собрания по обсуждению экологического доклада по СЭО осуществляется в срок **с 27 ноября до 6 декабря 2020 г.** по адресам Министерства природных ресурсов и охраны окружающей среды Республики Беларусь: 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 10, e-mail: mail@minpriroda.gov.by или соответствующих областных, Минского городского исполнительных комитетов.

УНП 100519825




## ДЭСАНТНІКАЎ БЫЛЫХ НЕ БЫВАЕ

...Колькі жыву на свеце, столькі цешуся Творцам: які ж ён адмысловы дызайнер, як хараша размясціў на зямлі пагоркі і даліны, як граматна «праклаў» рэкі!

Наша, напрыклад, некалі была настолькі глыбакаводная, што *на* ёй стаяў вадзяны млын, а *па* ёй сплаўлялі лес. Аднак гэта было даўно, у пачатку мінулага стагоддзя, бо ў канцы яго наша рэчка ўжо абмялела, аддала свае поймы дзецям пад футбольнае поле, людзям пад сенажаці ды месцы для выпасу хатняй жывёлы і птушак. Яны ў нас хадзілі чародамі. Цешылі гаспадынь: гэта ж колькі пуху на падушкі будзе, колькі смачнага мяса!

І яно сапраўды было б, калі б...

Праўду кажуць: няма лесу без ваўка, а сяла без злодзея. Неяк увечары цётка Уладзіха недалічылася гускі — сказала гаспадару. Пагаравалі ўдваіх, падумалі, што тая, бедная, мо ў карчы дзе забілася ці сабакі з'елі?

Для парадку схадзілі яшчэ да рэчкі, пашукалі — нідзе, ніякіх прыкмет знікнення. «Што ж, — сказалі, — у гаспадарцы не без страт». І, напэўна, змірыліся б, калі б праз тыдзень-другі ў іх не прапаў гусак.

— Мусіць, не ў драпежніках справа? — прызнала тады гаспадыня. — Мусіць, яны двухногія тут арудуюць... Але як не злоўлены, то і не злодзей?

— Значыць, злаўлю! — паабяцаў ёй муж. — Слова дэсантніка.

У наступны вечар ён абышоў усе прыбярэжныя хмызнякі, на пагорку ў высокім кусце «абсталяваў» назіральны пункт, выразаў ёмкі арэхавы прут, на ўсякі выпадак падрыхтаваў вяроўку і стаў чакаць.

Сонца ўжо хілілася да захаду, гусі пайшлі на апошні заплыў. Ім як быццам нічога не пагражала? «Не ўдалося злавіць лося», — хацеў ужо змірыцца Уладзя, як раптам з хмызняку паказалася постаць... Саўка, сын мясцовых п'яніц... Скінуў з сябе адзенне, зайшоў у ваду — паплыў да гусей.

Тыя, адчуўшы небяспеку, расплыліся ва ўсе бакі. Саўка пачакаў, пакуль «сплывуцца» назад, супакояцца, і ныркуў... Раз, другі... І вось ужо ўдача — схапіў адну птушку за ногі, прыцісну́ў да грудзей, паплыў да берага...

А сагнуўся там, каб узяць штаны, і тут жа апынуўся на зямлі, пачуў над вухам: «Ах ты, падлюка! Будзеш вырываца, — прыдушу!»

Саўка гэты голас пазнаў і нават не рыпаўся: чуў, што сярод дэсантнікаў былых не бывае, ведаў, што супраціўляцца — толькі час марнаваць.

Значыць, трэба прасіць прабачэння, слова даваць, што сплаціць за скрадзеных птушак, што болей на чужое ніколі... Ні-ні...

Уладзя яму паверыў — з мірам адпусціў дадому, нават паабяцаў, што нікому нічога не скажа.

Але ж Саўка на ўсякі выпадак з нашай вёскі з'ехаў, недзе, казалі, уладкаваўся на работу, з часам ажаніўся — зажыў як нармальны чалавек!

Я гэта ўсё да таго, што наколькі важна бывае злавіць злодзея ў пачатку яго «кар'еры», і як важна спыніць — адразу, бо потым...

Пра Саўку — я дакладна ведаю — прапаў бы, не было б з яго людскага чалавека.

**Ніна Несцяровіч,**
*г. Магілёў.*

## З ЛЁГКАЙ ПАРАЙ,
### альбо Так сказаў слесар

Надоечы пазваніла суседка, запрасіла да сябе ў лазню.

Я ў адказ ёй: «Шчыры дзякуй! Прыйду! Абавязкова!»

А пакуль яна, тая лазня, грэецца, я пра іншыя ўспомню.

...Некалі, у мінулым стагоддзі, нас, студэнтаў, адправілі на цаліну, на ўборку ўраджаю, у дзень прыезду запрасілі ў лазню. Мы, вядома ж, з дарагой душой!

Прыходзім. Бачым, што памяшканне там не маленькае і на дзве палавіны: справа — раздзявальні, злева — парылка і ўсё астатняе, а пасярэдзіне — доўгі калідор.

Дзверы ў ім расчынены насцеж ды яшчэ і падпёрты: трэба разумець, каб не зачыніліся, бо спёка на дварэ такая, што не прадыхнуць...

І таму наша Міла, раздзеўшыся самай першай, стаіць там ды чакае іншых. А я ў гэты час праз акенца бачу, што якраз насупраць дзвярэй запыніліся тры казахі. Кажу:

— Міла, на цябе мужчыны глядзяць (бо яны і сапраўды пазіралі...)

Сяброўка ў адказ:

— Што?.. Дзе, — пытае, — ты бачыш мужчын? Павай ідзе ў той канец, дзе яны стаяць, згінаецца, адкідвае падпорку, зачыняе дзверы і дадае:

— ...Там жа адны дзяды.

Як зараз помню: тым казахам было пад 40, і мы, студэнткі, іх лічылі старымі. А цяпер за куды старэйшых дзеўкі замуж ідуць.

...Другая прыгода — з майго дзяцінства, з пасляваеннага Віцебска. Людзі тады жылі ў зямлянках і бараках, каму дужа пашчасціла — у хатах, якія цудам ацалелі...

Але ж горад пакрысе будаваўся. І я добра помню, як у нас з'явілася лазня.

Само памяшканне было невялічкае, ахвотных памыцца — шмат. Запускалі па пяць чалавек. Я ў чарзе сядзела з мамай і з кніжкай, бо калі яшчэ возьмеш лёгкі вушасценькі тазік, калі яшчэ нальеш цёпленькай вадзічкі ды сядзеш на палок...

У той дзень мы ўжо мыліся, як раптам прапала халодная вада.

Тут жа з парылкі выскачылі жанчыны, паклікалі слесара. Ён (у ваенным адзенні... Мужчыны тады ў чым з фронту вярталіся, тое і насілі) зайшоў у памяшканне (там пара, паўзмрок) — стаў корпацца каля кранаў. Жанчыны — усе галяком, хто з венікам, хто з тазам — яго абступілі, нешта гавораць, раяць... І, бачу, незадаволены: Пайшла вада! А далей — віск, лямант:

— О, божа! Мужчына! (Раней як быццам не бачылі?!)

Што ён?

— Цыц, сарокі! — строга загадаў. — Растрашчаліся тут... Пахаваліся... А чаго я на вас не бачыў? Вось у мужчынскім аддзяленні цікавей: некаму пазайздросціць можна, некаму — паспачуваць... А вы ж — ну ўсе як адна!

Сказаў так і пайшоў.

А я, помню, з ім не згадзілася: ну як гэта, думаю, мы ды раптам аднолькавыя? Мама вунь, як былiначка тонен-кая, цётку Любу нам удзвюх не абняць, а я і зусім малая...

І пра мужчын я нічога не зразумела: ну чаму ім трэба зайздросціць альбо спачуваць?

...Вось гэта, зрэшты, я не вельмі разумею і цяпер, бо, дзякуй богу, апроч мужа, іншых мужчын у лазні не бачыла.

**З. М.,**
*г. Віцебск.*

## А РАНІЦОЙ — ЯНЫ ЎСТАЛІ...

Пытанне на засыпку: дзе ў мужчын найбольш прыгод?

Правільна: у камандзіроўках, бо мужчыны — яны ж як куры: 20 метраў ад дома і ўжо нічые. А тут — за 200 кіламетраў сем'і... І вольніца: ні табе жонкі-бензапілы з яе «мала грошай», «колькі ты будзеш піць?» ды «вынесі смецце» (а то вынесе ж мозг!), ні работы па доме, ні дзіцячых праблем... Можна расслабіцца. Альбо адарвацца... Што многія і робяць.

А найбольш — дык, па-мойму, шафёры і ў доўгіх далёкіх рэйсах. Бо там жа не тое, што з пункта «А» выехаў, у пункт «Б» прыехаў, і там усё нешта пачнецца. Прыгоды ў шафёраў паабапал дарогі стаяць, а ўжо на месцы...

Пятро, мой добры знаёмец, у свой час МАЗам кіраваў. Не, на жаль, не заводам, — а вялікай, магутнай машынай. Іх на аўтабазе да халеры было — розныя грузы вазілі, найчасцей — на будоўлі, у тым ліку дарог.

І тады ўжо — ні на вячэру, ні наанач дамоў не вярталіся (хіба на вялікія святы ды выхадныя аўтобус прывозіў), бо гэта ж далёка, па ўсёй краіне, бо гэта ж камандзіроўка: дзе аб'ект — там жытло, у бытоўцы халадзільнік, пліта... Харчы — у складчыну, гарэлка — таксама. І без розніцы п'еш ты ці не... Над капейкай ніхто не трэсся, бо зараблялі хлопцы — дай божа, а бывала ж, яшчэ і халтурылі. У той раз па прасеках паабапал дарог мясцовы бранскі люд сабе дровы нарыхтоўваў. А яны, брыгадай, за 25 савецкіх рублёў грузілі і за 10 адвозілі на падворкі. Разлік на месцы быў, пажадана — з «натурпрадуктам».

Дык вось — чарговая «аперацыя» і чарговая двухлітровая бутля («пластмасак» яшчэ не было).

Самагонку з яе збіраліся піць у чатырох (астатнія спаць пайшлі) і на траўцы каля МАЗа, які злёгку падсвечваў фарамі...

Карацей, атмасфера была рамантычная, калі не інтымная... Закусь — што трэба! Ды і гарэлка — таксама. Выпіваюць хлопцы ды яшчэ нахвальваюць: маўляў, умеюць гнаць расіяне: самагон — амаль як наш — «Старадарожскі»! Ці нават «Пушчанскі»!

...У той раз яны добра да яго прыклаліся. І ўвесь як быццам не выпілі: у бутлі яшчэ заставалася, а нахіляеш, каб наліць — то цячэ, то раптам не цячэ... Санёк (ён на «разліве» быў) альбо змесціва тады пабоўтае, альбо палец у рыльца ўсуне... І «ўсё пуцём», глядзіш — у шклянкі паліліся.

Карацей, «угаманілі» сябры той бутылёк — разышліся спаць. Раніцой прачнуліся — вясёлыя, бадзёрыя (ну што там піць было — па паўлітра на «нос»?), бачаць — на іхняй «паляне» іхняя ж «тара» валяецца. Санёк яе викінуць хацеў, але спачатку зірнуў унутр. Сказаў:

— Ага... Дык вось чаму не лілося!.. Я так і падумаў, што нешта ляжыць! Мыш... Маленькая...

Сам стаіць ды яе разглядае, а сябры яго — урассыпную: ходу і чым далей, бо вывернула з іх нават тое, што пазаўчора елі!..

І потым цэлы дзень на вадзе жылі... Хіба, назаўтра снедаць прыйшлі ды лыжкі пабралі... А Санёк за сваё:

— А добра, хлопцы, мы тады пасядзелі! І заўважце — у расіян не так, як у нас. У іх — гарэлка і мяса з таго ж «фугаса».

«Сядзельшчыкаў» ізноў нібы ветрам знесла!

Праўда, на трэці дзень ужо ніхто не жартаваў: мужчыны спакойна паснедалі, паабедалі, павячэралі... Вось толькі мясцовы самагон больш ніколі не пілі: згадзілі па гарэлку.

Але ж гэта ўжо іншая гісторыя. Значыць, пра яе трэба іншым разам.

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

---

Неасабісты суб'ектыў



# Урокі Караткевіча

## Што згадваецца ў юбілей пісьменніка

У юнацтве, як толькі пачала спрабаваць пісаць нешта больш, чым школьныя сачыненні, я лічыла Караткевіча сваім галоўным і бясспрэчным настаўнікам. Запоем чытала яго кнігі — не паверыце, але «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» праглынула ў дзясятым класе практычна за суткі, і гэта быў другі мой рэкорд пасля айтматаўскага «Бураннага паўстанка». Твораў Караткевіча тады не было ў школьнай праграме, толькі «Каласы пад сярпом тваім» рэкамендаваліся да пазакласнага чытання (і гэта, лічу, была вялікая памылка, бо гэту складаную шматпланавую сагу трэба чытаць гадоў у дзевятнаццаць як мінімум, а не ў пятнаццаць). Але ў школьнай бібліятэцы ўжо з'явіўся бела-шэры васьмітомнік з недарэчнымі бляклымі выявамі на аднолькавых вокладках. Пад імі ж быў — цэлы скарб, адкрыўшы які аднойчы, ужо нельга ад яго адарвацца. І можна было на ўроку працы, хаваючы кнігу пад верстаком у школьнай майстэрні, чытаць «Ладдзю Роспачы», а дома, глытаючы слёзы, перачытваць услых для мамы і бабулі фінал «Сівой легенды» і са здзіўленнем бачыць, як у іх, моцных, бітых лёсам маладых удоў, таксама вільгатнеюць вочы. Менавіта дзякуючы Караткевічу я перастала баяцца восеньскай вусцішнай цемры — ідучы з апошняга аўтобуса ці з дыскатэкі, я, наадварот, з цікавасцю і чаканнем узіралася ў асвечаныя поўняй затуманеныя пагоркі: а раптам адтуль бязгучна пакажацца Дзікае паляванне...

Чытаючы — вучылася. Не ўменню прыдумаць і дасканала выбудаваць сюжэт — гэтаму не навучышся, для гэтага патрэбен талент, як у яго — адзін на мільён — талент. Але валоданню словам, мелодыцы сказаў — несумненна. Тады, у школьныя яшчэ гады, дзякуючы менавіта Караткевічу прыйшло адчуванне, разуменне, цвёрдае веданне, што беларуская мова адрозніваецца ад блізкай нам рускай, што, калі хочаш пісаць на ёй, роднай, трэба на ёй і думаць. А інакш будзе не публіцыстыка, не проза, не вершы — проста тэкст. Гэткі самы, як пералік інгрэдыентаў на, скажам, зефіры... А яшчэ ў Караткевіча я навучылася цікавіцца гісторыяй. Сваёй малой радзімы, сваёй краіны. Менавіта ягонае «У пакоіку быў ложак, шырокі, як поле бою пад Койданавым» ператварыла звычайны Дзяржынск у загадкавую старажытную мясціну, і тутэйшая назва Койданаў, чутая ад бабулі і яе сяброўак, стала часткай мазаікі, якую складаю дагэтуль, адкрываючы ўсё новыя цікавыя факты з гісторыі роднага краю...

ПАЗНЕЙ, крыху пасталеўшы, менавіта ў яго творах я знаходзіла адказы на многія свае пытанні. Яго кнігі былі дзесьці і паратункам ад непаразумення, здрады, нелюбові — усяго таго, з чым сутыкаецца кожны чалавек, становячыся дарослым, расстаўляючы ўласныя прыярытэты ў жыцці. «Трэба трымацца, як індзеец падчас катавання», «Лепей вісець на нажы, кахаць, праклінаць за каханне багоў, чым век пражыць, і дзяцей нажыць, і не дажыць да кахання свайго...» Я і сёння пішу гэтыя радкі па памяці, не заглядваючы ў першакрыніцы. Магчыма, яны падаюцца проста сентыментальна-рамантычнымі фразамі. Але калі табе дваццаць два, цябе паглынае роспач і ты не верыш, што гэты свой асабісты жах ты перажывеш, што калі-небудзь будзе лепш, — менавіта гэтыя радкі могуць стаць той выратавальнай саломінкай, ухапіўшыся за якую, здолееш з віру адчаю выплыць і ўдыхнуць свежага паветра. Гэтаксама як праз некалькі гадоў так на душу лягло народнае, уплеценае ў «Нельга забыць» — «Чым у раю, дык лепш на краю, дык лепш у пекле, ды пасяродзь». Ці вось гэта, вершаванае: «Расплата за ўсё: // За чырвоныя макі, // За світанне жыцця, // За блізкі канец, // За тое, што быў, // Што смяяўся і плакаў, // За тое, што ўсе любілі мяне, // За Сірына, што заліваўся ў маі, // За лістападаўскі крык крумкача — // За ўсё, расплата, цябе прымаю // І, сціснуўшы зубы, буду маўчаць.» З таго часу, як я гэта прачытала, што б у жыцці ні здаралася, ніколі не турбую ні Лёс, ні Бога дурным пытаннем «за што?». Бо заўсёды ведаю — за што.

Пасля, ужо працуючы ў газеце, я пачала чытаць яго публіцыстыку, апублікаваныя дзённікі, перапіску. «Шэлег таму, хто піша, калі ён у тым, што піша, не бачыць найвялікшага цуду» — гэта адтуль, з яго пісьмаў. Памятаю, менавіта гэта фраза дапамагла мне напісаць рэкламны матэрыял — на дзве вялікія газетныя старонкі — пра фармацэўтычнае прадпрыемства, якое не выпускала нічога, апроч фізіялагічных раствораў. Зацікавілася, адкуль яны з'явіліся і для чаго патрэбныя, — і атрымалася. Рэкламадаўцы пасля нават прапанавалі пра іх брашуру напісаць... А фраза тая разам з танкаўскім «Можа, і ўсе колеры ўжо адкрыты — // Мне засталося яшчэ спалучэнні» і еўтушэнкаўскім «Людей неинтересных в мире нет» — і сёння дэвіз усяго, што спрабую пісаць і рабіць.

...У дзень 90-годдзя Караткевіча публікацый пра яго ў сецціве шмат. Як і варта было чакаць, многія кінуліся разважаць пра нашы сённяшнія рэаліі: што б ён сказаў (зрабіў), калі б дажыў. Не буду каментаваць тое, што давялося на названую тэму за апошнія некалькі дзён прачытаць. Замест гэтага прыгадаю гутарку з Адамам Мальдзісам, адным з самых блізкіх сяброў Уладзіміра Сямёнавіча, якая адбылася ў нас у лістападзе далёкага ўжо 1995-га, перад 65-годдзем Караткевіча. Калі хто памятае восень 95-га і тыя падзеі і працэсы, што адбываліся ў нашым грамадстве тады — калі адкінуць інфармацыйны складнік (тады, канешне, нашмат меншы), дык час быў для Беларусі не лягчэйшы, чым сёння. Дык вось тады Адам Восіпавіч сказаў пра свайго сябра і пра яго магчымую рэакцыю на тагачасны момант так: «Як філасоф гістарычных падзей ён зразумеў бы сённяшнюю сітуацыю. І заклікаў бы нас да аднаго, для таго, што сам рабіў усё жыццё: «Працаваць, працаваць і працаваць дзеля Беларусі»...

Урок, які не пашкодзіла б засвоіць сёння ўсім нам. Без выключэння.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: сеялка Aoricola ital/SH 2-130 162716020, 2008 г. в. Начальная цена продажи лота – 19 680 руб. (девятнадцать тысяч шестьсот восемьдесят рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 968 руб. (одна тысяча девятьсот шестьдесят восемь рублей)

ЛОТ 2: легковой автомобиль PEUGEOT 607, 2003 г. в. Начальная цена продажи лота – 10 800 руб. (десять тысяч восемьсот рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 080 руб. (одна тысяча восемьдесят рублей)

**Продавец – ОАО «Лидахлебопродукт», 231300, г. Лида, ул. Булата, 1, тел. 8-0154-65-25-01, факс 8-0154-65-25-60**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 29 декабря 2020 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **http://grino.by/aukcion**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 24 декабря 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**
**Дополнительная информация http://grino.by**

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,
### организатор торгов по продаже имущества ООО «Белсанита М», объявляет о проведении 29.12.2020 г. в 10.00 публичных торгов в форме аукциона по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501

**Предмет торгов:**

**Лот 1**. Объединенный лот, комплектующие для сантехники. С полным перечнем имущества можно ознакомиться по ссылке в интернете: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2020/11/lot-1.pdf

Начальная стоимость: 3 504,37 бел. руб. с НДС.

Размер задатка: 10 % от начальной стоимости имущества, в размере 175,22 бел. руб. с НДС.

Шаг аукциона: 5 % от начальной стоимости имущества, в размере 350,44 бел. руб. с НДС.

**Лот 2**. Объединенный лот, комплектующие для душа. С полным перечнем имущества можно ознакомиться по ссылке в интернете: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2020/11/lot-2.pdf

Начальная стоимость: 3 647,81 бел. руб. с НДС.

Размер задатка: 10 % от начальной стоимости имущества в размере 182,39 бел. руб. с НДС.

